ІМЕМ АЙЧЫНЫ

2

Выдавец і рэдактар лучаць сваё служэнне
праўдзе і свабодзе па прыкладзе
самаахвярных сыноў Бацькаўшчыны,
якія не гублялі надзею і адвагу
ў гадзіны роспачы і бяссілля

ЯЎГЕН АНІШЧАНКА



Збор твораў у шасці тамах

Выдавец Віктар Хурсік

ЯУГЕН АНІШЧАНКА

ТОМ 2

Імем Айчыны

Дакументы паўстання 1794 г. у Літоўскай правінцыі

Укладанне
рэдакцыя
прадмова

Мінск 2004

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)
А32

А32 **Анішчанка Я. К.**
Збор твораў. У 6-ці т. Т.2. Імем Айчыны: Дакументы паўстання 1794 г. у Літоўс. правінцыі
/Я. К. Анішчанка.—Мн.:Выд.Хурсік, 2004.—236 с.

ISBN 985-6718-21-X (т.2)
ISBN 985-6718-15-5

Збор твораў Я. Анішчанкі ў 6 тамах уключае ў сябе ўнікальныя, невядомыя раней дакументы, знойдзеныя аўтарам у архівах Беларусі і замежжа.

У другім томе змешчаны арыгінальныя дакументы пра заключныя падзеі паўстання 1794 г. на беларускай зямлі. Яны падрабязна асвятляюць акалічнасці рэйда М.К. Агінскага на Дынабург і змаганне корпуса К. Серакоўскага з А. Суворавым на Берасцейшчыне. Замыкае зборнік спіс афіцэраў усіх расійскіх войскаў, якія распраўляліся з паўстаннем у Вялікім княстве Літоўскім.

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)

ISBN 985-6718-21-X (т.2)
ISBN 985-6718-15-5

© Анішчанка Я., 2004
© Выдавец Хурсік В., 2004

Уступ

Дадзены зборнік з'яўляецца працягам публікацыі дакументаў паўстання 1794 г. у Вялікім княстве Літоўскім, адшуканых рэдактарам у розных архівах.[1]

На гэты раз чытачу прапануецца стос матэрыялаў, што захаваўся ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве ў Маскве ў асабістай калекцыі папер знакамітага Міхала Клеафаса Агінскага. На дзіва, былы падскарбій Літоўскай правінцыі і павадыр вольных стралкоў паўстання 1794 г. не надта шчыраваў дробязямі свайго ўдзелу ў паўстанні. Чытачу гэта стане зразумела пры азнаямленні з прыводзімымі тут дакументамі. Яны дэталёва паказваюць абставіны рэйду М. Агінскага на Дынабург паміж 1 і 13 жніўня, рэйду, які па словах самога мемуарыста, быў выкліканы абурэннем віленскіх жыхароў бяздзейнасцю рады паўстання і бяздарнасцю яго палкаводцаў[2].

М. Агінскі збіраўся ўласнай адвагай адолець дэмаралізацыю ў кіраўніцтве і заадно ўзняць баявы дух пешых і недысцыплініраваных апалчэнцаў, якіх ён вёў з сабою. Яму ўдалося пераправіць каля 50 валанцёраў праз Дзвіну, якія падпалілі Дынабург. Аднак гэты мізэрны вайсковы плён меў вялікі розгалас. Дынабургскі камендант, палкоўнік Генрых Гулевіч у паніцы паведаміў у ваенную калегію Расіі пра пераправу пад Крэйцбургам і Лівенгофам ажно 3 палкоў паўстанцаў. Іншыя афіцэры данеслі туды ж, што гэта былі не інсургенты, а «человек

да сту» звычайных сялян-касцоў памешчыка Юзафа Зіберха, якіх прынялі за касінераў паўстання і з якімі, нібыта, штык-юнкер Дзмітрый Грынеў «имел сражение».[3]

Рыжскі губернатар барон Пётр Пален таксама адпісаў наверх, што Гулевіч «нагло оболгал меня и своих начальников, говоря о тысячах, и зря растревожил всю землю до самаго Петербурга», прыняўшы за рэгулярныя сілы паўстанцаў 100—150 сялян, якіх «мы... убили б дубинами»[4]. Гулевіча скінулі з пасады «за робость», хаця той загадаў навакольным памешчыкам узброіць сваіх сялян, якія тут жа, па словах спамянутага Палена, «предались непослушанию и разбою», а некаторыя з іх потым былі затрыманы з канфедэрацкімі значкамі.[5]

Прыводзімыя напачатку зборніка ўніверсалы вярхоўнага дыктатара паўстання Тадэвуша Касцюшкі і віленскай рады пакажуць, як вызваленчая барацьба паступова схілілася да адчайных рэйдаў тыпу Агінскага, да суровых мер супраць панікёраў і іншадумцаў у шарэнгах барацьбітоў. Падобныя настроі пашырыліся ў канцы жніўня - напачатку верасня на Берасцейшчыне, у тым куце княства, куды знакаміты Аляксандр Сувораў прывёў 13 тыс. штыкоў[6] і якім пад Крупчыцамі і Ціраспалем (пад Брэстам) працістаяў 5-тысячны корпус генерала Карла Серакоўскага[7]. Разам з рэгулярнымі рэгіментамі К. Серакоўскі распараджаўся і мясцовымі брэсцка-кобрынскімі апалчэнцамі. За некалькі дзён да крупчыцкага боя (17 верасня) Брэсцкае ваяводства паставіла яму 500 рэкрутаў, з якіх па дарозе збегла 128 чал. Потым, у канцы верасня, з адной партыі брэсцкіх кантаністаў збяжыць яшчэ 220 чал.[8] Па ведамасці самога К. Серакоўскага за 28 жніўня, у кобрынскай кавалерыі, гэта значыць сярод шляхты, лічылася 132 вершнікаў з 177 канямі. З іх у кастрычніку засталося 53 чал. пры 60 канях. Значыць, пасля брэсцкай паразы пад Ціраспалем (19 верасня) дызерціравала 40% складу мясцовага апалчэння.[9]

Збянтэжаны падобнымі вынікамі, Т. Касцюшка пераканаўся ў дарэмнасці паспалітага рушання і ўсклаў галоўныя спадзяванні на рэгулярныя фарміраванні на аснове рэкруцкай павіннасці.[10] Аднак і яны таялі. Сакрушальнае паражэнне корпуса К. Серакоўскага пад Брэстам, ганебныя ўцёкі з поля бою шляхецкай кавалерыі прымусілі Касцюшку расчаравацца ў дбайнасці фанаберыстай шляхты, якую патрабавалася збіраць сілком з абразай яе ганарлівага рыцарскага мінулага[11]. Касцюшка з роспачы казаў, што трэба сурова наказваць і караць непаслухмяных, што «трэба прымушаць людзей, каб былі вольнымі, калі яны добраахвотна не жадаюць імі быць», што трэба адрозніваць сапраўдны патрыятызм ад фальшывага прытворства, стараннасць ад фанатызму, вольнасць ад беспакаранасці.[12] Прыводзімыя ў заключнай частцы зборніка дакументы дэманструюць гэтыя душэўныя мукі вярхоўнага павадыра паўстання, які мусіў сам прыбыць у Гродна для навядзення дысцыпліны і натхнення паплечнікаў, які з болем у сэрцы аддаў тут загад страляць з гармат па ўсіх пакідаючых пляц бою, які імем Айчыны маліў, прасіў і нават абяцаў кожнаму жаўнеру зямельны надзел з дзяржаўнай маёмасці пасля перамогі (дакумент №124).

Жудасны фінал пад Брэстам азнаменаваўся тым, што з 5-тысячнага корпуса К. Серакоўскага пры ім выратавалася 1510 чал.[13] У сябе А. Сувораў лічыў забітымі толькі 123, прапаўшымі без вестак 69 і параненымі 297 чал.[14] У процівагу Касцюшцы, расійская імператрыца Кацярына II загадала выдаць кожнаму радавому суvoraўскай арміі па 1 рублю. Загадам ад 6 лістапада яна ўзнагародзіла самога А. Суворава за Крупчыцы і Ціраспаль алмазным бантам на шляпу, дырэктара ўсіх тамтэйшых атак генерала Паўла Пацёмкіна — ганаровым крыжом Аляксандра Неўскага з алмазнай зоркай, тром генерал-маёрам (Георгію Шэвічу, Пятру Ісленьеву, Івану Ісаеву) выдала крыжы 3-га класу

з ордэнамі Георгія Пабеданосца, брыгадзірам Юрыю Паліванаву дала залатую шпагу, Фёдару Буксгеўдэну — ордэн па чыну і маёнтак у Рэвельскай губерні, Фёдару Бароўскаму — арэнду пасмяротна ў беларускіх намесніцтвах.[15] Акрамя таго, Суvoраў прасіў сваю «матухну» адзначыць 82 чал. — аднаго палкоўніка, 4 падпалкоўнікаў, 18 маёраў, 6 капітанаў, 17 паручнікаў, 16 карнетаў і кадэтаў, 16 сяржантаў і г.д.[16]

Згаданыя прадстаўленні да лаўраў трыумфатараў дазваляюць прывесці ў Дадатку спіс усіх расійскіх карных палкоў, якія супрацьдзеялі паўстанцам на беларускай зямлі. Зразумела, што пры гэтым даводзіцца абмежавацца фармулярамі афіцэрскіх кадраў з паведамленнем самых сціплых даных, хаця архіўныя крыніцы паведамляюць пра сямейнае і сацыяльнае становішча асоб, іх кар'еру. У гэтых адносінах фармулярныя спісы вартыя ўвагі летапісца паўстання.

К прыкладу, у спісе Рэвельскага пяхотнага палка за 1.01.1795 г. запісана, што 27-гадовы палкоўнік Дзмітрый Андрэевіч Закрэўскі разам з 30-гадовым секунд-маёрам Апалонам Сцяпанавічам Жамчужнікавым 8 красавіка па загаду Паўла Цыцыянава з 2 ротамі грэнадзёраў палка і эскадронам Інгермландскага карабінернага палка захапілі ў Гродна «без огласки» аднаго з удзельнікаў паўстанцкай змовы Ігнацыя Тызенгауза.[17] З анкеты 39-гадовага падпалкоўніка таго ж Рэвельскага палка Фёдара Фёдаравіча Штэйнгеля мы даведваемся, што ён вёў батальён мушкецёраў з 50 казакамі на Тартакі 3 чэрвеня, а праз месяц, 3 ліпеня, напаў на паўстанцкі пост над Слонімам.[18] Без падобных дробязяў немагчыма скласці поўнавартую карту ваена-аператыўнай сітуацыі часу паўстання і расправы з ім. У гэтых службовых аналах рэдактару пашанціла — такі натрапіць на жыццярыс Андрея Казіміравіча Мейера — аўтара апісання Крычаўскага староства.[19]

Дадатак дазволіць зацікаўленаму чытачу знайсці сярод душыцеляў паўстання эліту і гонар Расіі, якія потым

праславяць яе. Гэта — князь П.І. Баграціён (1765—1812), які ў 1810 г. апынецца ваеным міністрам, а ў 1812 г. будзе камандаваць 2-й заходняй арміяй. Гэта — князь М.Б. Барклай дэ Толі (1761—1818), які ў 1812 г. камандаваў 1-й заходняй арміяй. Граф П.Х. Вітгенштэйн (1768—1843) у 1813 г. стане галоўнакамандуючым руска-прускімі войскамі і дарасце да фельдмаршала. Князь М.Л. Шахаўскі (1757—?) за крупчыцкую перамогу атрымаў ордэн св. Уладзіміра 4-й ступені з лентай і такі ж, толькі 3-й ступені, за штурм Варшавы. У 1813 г. ён стане галоўным правіянтмайстрам саюзных войскаў і зробіцца сенатарам. Граф К.К. Сіверс (1772—1856) апынецца сенатарам, у корпусе П. Баграціёна будзе граміць ужо Напалеона пад Магілёвам, а пасля акажацца ваеным губернатарам Прусіі. Д.І. Лабанаў-Растоўскі (1758 — 1838) пройдзе анфіладу Астраханскага, Пецярбургскага і Рыжскага ваенага губернатара, стане намеснікам у Ліфляндыі, Эстляндыі і Курляндыі, членам Дзяржсавета (1813) і міністрам юстыцыі (1817). Словам, зацікаўлены чытач самастойна можа выбраць са спіса палкоў і па розных дапаможных крыніцах праследзіць, кім потым апынуцца князі Д. і М. Валконскія, Г. і М. Вяземскія, Б. і П. Галіцыны, С., Д. і І. Абаленскія, графы Ф. Галавін, У., Д. і П. Талстыя, П. і Г. Меліны, розныя, не менш тытулаваныя, Апраксіны, Бібікавы, Бенкендорфы, Лапухіны, Мураўёвы, Пушкіны, Песцелі, Раеўскія, Рылеевы, Унгерны, Хаванскія і інш.

Нязменную дапамогу пры падрыхтоўцы матэрыялаў рэдактару аказваў супрацоўнік РДВГА *Дз.П. Шэўчык*. Заслугоўваюць падзякі і іншыя сціплыя працаўнікі тамтэйшага архіва.

---

1. Стогн. Паўстанне 1794 года. Новыя дакументы. Мн., 2002; Камісары Касцюшкі. Мн., 2004.

2. Pamietniki Michala Oginskiego o Polsce i polakach od roku 1788 az do konca roku 1815. Poznan, 1870. S. 348.

3. РДВГА, ф. 29, с. 2, л. 48. З рапарта сененскага каменданта Васіля Волкава, атрыманага па вестках Г. Гулевіча.

4. Прама ў дзень віленскага пачыну паўстання сенатар і старшыня дзяржаўнага заёмнага банка Расіі П.В. Завадоўскі (1738-1812) заявіў, што ў Расіі стольні арміі, што «мы и муху обухом бить можем», бо супраць яе ў ВКЛ толькі шляхта «буйствует в свою гибель» (Листовский И. Граф Петр Васильевич Завадовский // РА. М., 1883. Кн. 2. С. 119).

5. РДВГА, ф. 29, с. 2, л. 47.

6. Там жа, ф. 43, с. 115-117. У адной архіўнай крыніцы ананімны аўтар паведамляе пра 12 тыс. чал. (Там жа, ф. ВПА, с. 2725, л. 9-10). У літаратуры сустракаецца лічба ў 11 тыс. (Moscicki H. General Jakub Jasinski i powstanie Kosciuszkowskie. W-wa, 1917. S. 320; Zdanski K. Przyczynki do dziejow powstania brzesko-litewskiego i ziem, nim objetych. W-wa, 1936. S. 21); 12 тыс. (Herbst S. Z dziejow wojskowych powstania Kosciuszkowskiego 1794 roku. W-wa, 1983. S. 361).

7. Глядзі дакументы 111 і 114.

8. Akty powstania Kosciuszki. W-wa, 1955. T. 1. S. 47.

9. РДВГА, Ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 106, 152, 192.

10. Akty powstania... S. 48; Skalkowski A. Z dziejow insurekcyi 1794 r. W-wa, 1926. S. 27.

11. Akty powstania... S. 46.

12. Там жа. S. 40. Tokarz W. Rozprawy. W-wa, 1959. T. 1. S. 181.

13. Moscicki H. General... S. 404. Сувораў налічваў на крупчыцкім полі забітымі 1500 паўстанцаў, палоннымі 600, а пад Ціраспалем меў 500 палонных і гаварыў, што выратавалася ледзьве 150 чал. (гл.дакумент 115). Генерал О. Дэрфельдэн сцвярджаў, што Сувораў разбіў пад Брэстам 16 тыс. чал. (РДВГА, ф. 43, с. 100, л. 32). Адзін з біёграфаў А. Суворава пісаў, што Сувораў палажыў 3 тыс. чал. (Антинг И.Ф. Победы князя Италийскаго графа Александра Васильевича Суворова-Рымникского. М., 1815. Ч. 4. С. 23). М. Зяновіч гаворыць аб страце К. Серакоўскім 1192 чал. і А. Суворавым 3 тыс. чал. (Zenowicz M. Kampania oddzialu wojsk polskich pod generalem Sierakowskim w roku 1794 // Pamietniki wojenne 1792-1812. Drezno, 1871. S. 34, 38, 417.

14. РДВГА, ф. 43, с. 92, л. 88, 92-145.

15. Там жа, л. 173-177.

16. Там жа, с. 85, л. 166-186.

17. Там жа, ф. 489, с. 752, л. 37.

18. Там жа, л. 5.

19. Зараз можна ўпэўнена гаварыць, што ён паходзіў з саксонскага дваранства. Нарадзіўся ў Маскве ў 1764 г. У рускую службу ўступіў 03.1776 г. сяржантам артылерыі. Затым служыў флігель-ад'ютантам пры генерал-паручніку Мартынаве (27.06.1779), штык-юнкерам артылерыі (2.05.1780), кватэрмайстрам у Нізаўскім пяхотным палку

(15.02.1784), дзе яго прыкмеціў уплывовы тады фаварыт Г.А. Пацёмкін. Веданне арыфметыкі, геаметрыі, фартыфікацыі, французскай, лацінскай і італьянскай моваў дапамагло Мейеру 3.03.1784 г. трапіць у флігель-ад'ютанты і стаць аграномам паходнай канцылярыі фельдмаршала. Якраз у такой якасці Мейер і быў ім пасланы на рэвізію Крычаўскага староства (ЭГБ. Т. 5. С. 107). 12.09.1786 г. ён робіцца секунд-маёрам Херсонскага мушкецёрскага палка, удзельнічае ў аблозе Ачакава ў 1788 г., а ў наступным годзе займаецца рэкагнасцыроўкай Бендэраў. 11.10.1790 г. Мейер стаў прэм'ер-маёрам Ражскага пяхотнага палка, а 17.07.1792 г. набыў ранг падпалкоўніка Херсонскага грэнадзёрскага палка. Тут ён прымаў удзел у паходзе на Белград, у баі пад Дубенкай, пра што засведчыў у сваіх успамінах Л. Энгельгардт (Энгельгардт Л.Н. Записки. М., 1997. С. 125). Нарэшце, Мейер удзельнічаў у штурме Варшавы (РДВГА, ф. 489, с. 1256, л. 6 адв.—7).

Спіс дакументаў

№ 1. 25 красавіка 1794 г. Універсал у ваяводствы, паветы і вольныя гарады ВКЛ аб пачатку дзейнасці вярхоўнага кіраўніцтва паўстання 21
№ 2. 1 мая. Архіпатэрскае пасланне да вернікаў Д. Пільхоўскага 28
№ 3. 3 мая. Універсал Т. Касцюшкі аб канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей 30
№ 4. 9 мая. Заклік віленскай рады да дабраахвотных ахвяраванняў 31
№ 5. 9 мая. Універсал літоўскай рады аб рэкруцкім паборы 33
№ 6. 10 мая. Універсал літоўскай рады аб пастаўцы стралкоў у войска 38
№ 7. 15 мая. Абвяшчэнне віленскай радай Вінярскага ўніверсала Т. Касцюшкі 39
№ 8. 12 мая. Судовы працэс аб гвалтах гродзенскага шляхціча М. Бянкевіча 44
№ 9. 15 мая. Сведчанні галоўнага касіра ВКЛ К. Язерскага аб абставінах рабунку скарба ў Гродна 45
№ 10. 24 мая. Судовы запіс лідскіх шляхцічаў Быкоўскіх аб рабунках казакоў у фальварку Лябёдка 46
№ 11. 6 чэрвеня. Акт рэквізіцыі папер у гродзенскага камісара паліцыі Л. Ліпніцкага 48
№ 12. 7 мая. Адозва Т. Касцюшкі да праваслаўнага духавенства і вернікаў 49
№ 13. 12 мая. Ліст Т. Касцюшкі да Ф. Сапегі 51
№ 14. 15 мая. Зварот Т. Касцюшкі да брэсцкіх і кобрынскіх абывацеляў 53
№ 15. 25 мая. Забарона гродзенскай парадкавай камісіі несанкцыянаваных прамоў да народа 54

№ 16. 26 мая. Пастанова гродзенскай парадкавай камісіі аб парушальніках грамадскага спакою 55
№ 17. 5 чэрвеня. Пастанова гродзенскай камісіі аб шыбеніцах для ворагаў народа 56
№ 18. 17 чэрвеня. Рапарт генерала М.А. Зубава князю Рэпніну аб бойцы пад Солам́і 57
№ 19. 10 ліпеня. Прадпісанне Т. Касцюшкі гродзенскаму генералу А. Казаноўскаму аб выбары рэкрутаў з 10 дымоў 61
№ 20. 6 верасня. Акт апраўдання палкоўніка паспалітага рушання Гродзенскага павета А.В. Рыхліцкага 62
№ 21. 21 чэрвеня. Рапарт завілейскай парадкавай камісіі аб сваім складзе 63
№ 22. 18 ліпеня. Адказ ЦД ВКЛ на пытанні завілейскай камісіі 64
№ 23. 20 ліпеня. Рапарт завілейскага генерал-маёра К. Зяньковіча М. Вяльгорскаму 65
№ 24. 20 ліпеня. Рапарт М. Вяльгорскаму генерал-маёра Браслаўскага павета В. Беліковіча 68
№ 25. 21 ліпеня. Рапарт ротмістра А. Пляхневіча М. Вяльгорскаму 69
№ 26. 23 ліпеня. Рапарт генерал-маёра В. Беліковіча М. Вяльгорскаму 70
№ 27. 25 ліпеня. Загад М. Вяльгорскага М. Агінскаму на паход пад Дынабург 72
№ 28. 28 ліпеня. Паведамленне Беляшэвіча М. Агінскаму аб розным 72
№ 29. 30 ліпеня. Ліст генерал-маёра В. Беліковіча М. Агінскаму 73
№ 30. 1 жніўня. Ліст М. Агінскага ў Цэнтральную дэпутацыю 74
№ 31. 3 жніўня. Рапарт ротмістра Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму 75

№ 32. 3 жніўня. Вытрымка з прыказа
Р. Гедройца адносна субардынацыі афіцэраў 76
№ 33. 3 жніўня. Ліст Е. Пясчынскага
М. Агінскаму аб шкодніцтве яўрэяў 76
№ 34. (4 жніўня). Ліст завілейскага
генерал-маёра К. Зяньковіча М. Агінскаму 77
№ 35. 4 жніўня. Ліст генерал-маёра
П. Грабоўскага В. Беліковічу 77
№ 36. 4 жніўня. Данясенне браслаўскай
парадкавай камісіі М. Агінскаму аб выкананні
даручэнняў 78
№ 37. 5 жніўня. Ліст ротмістра
Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму 79
№ 38. (5-6 жніўня). Ліст невядомага з-пад
Дусят М. Агінскаму 80
№ 39. 7 жніўня. Ліст маёра Ракіцкага
М. Агінскаму з-пад Дусят 81
№ 40. 7 жніўня. Рапарт ротмістра
Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму 81
№ 41. (8 жніўня). Рапарт Ф. Вышынскага
М. Агінскаму 82
№ 42. 8 жніўня. Паведамленне завілейскай
камісіі М. Агінскаму 83
№ 43. 9 жніўня. Ліст ротмістра А. Пляхневіча
М. Агінскаму 84
№ 44. 10 жніўня. Паведамленне Т. Свянціцкага
ротмістру Ю. Гайжэўскаму 84
№ 45. 11 жніўня. Рапарт С. Няклюдава
Кацярыне II аб абставінах
блакады М. Агінскім г. Дынабурга 85
№ 46. 11 жніўня. Рапарт завілейскай камісіі
М. Агінскаму з Калтынян 90
№ 47. 12 жніўня. Рапарт ротмістра
Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму 91
№ 48. 13 жніўня. Ліст генерала
Г. Марыконі М. Агінскаму з-пад Дусят 92

№ 49. 15 жніўня. Рапарт браслаўскай камісіі
М. Агінскаму аб захопе Вільна непрыяцелем 93
№ 50. 15 красавіка 1796 г. З успамінаў генерала
Б. Кнорынга аб мерах падаўлення паўстання 94
№ 51. 10 чэрвеня 1794 г. Камандзіровачны ліст
адпадпалкоўніка М. Ахматовіча
паручніку М. Беляку 95
№ 52. 3 ліпеня. Ліст генерала Арлоўскага
генералу К. Серакоўскаму 96
№ 53. 5 ліпеня. Зварот брэсцкай парадкавай
камісіі да абывацеляў 97
№ 54. 8 ліпеня. Інструкцыя Т. Касцюшкі
генералу К. Серакоўскаму 97
№ 55. 11 ліпеня. Ліст М. Вяльгорскага
К. Серакоўскаму з Воранава 98
№ 56. 15 ліпеня. Ліст генерала
А. Хлявінскага К. Серакоўскаму 99
№ 57. 16 ліпеня. Ліст А. Хлявінскага
К. Серакоўскаму з Мсцібава 100
№ 58. 19 ліпеня. Адрас брэсцкай парадкавай
камісіі К. Серакоўскаму 100
№ 59. 21 ліпеня. Ліст палкоўніка М. Пашкоўскага
К. Серакоўскаму 101
№ 60. 22 ліпеня. Ліст генерал-маёра А. Хлявінскага
К. Серакоўскаму 101
№ 61. 26 ліпеня. Ліст палкоўніка М. Пашкоўскага
К. Серакоўскаму з Брэста 102
№ 62. 27 ліпеня. Рапарт генерал-маёра К. Рушчыца
К. Серакоўскаму 103
№ 63. 28 ліпеня. Адрас слонімскага кагала
кіраўніцтву літоўскага войска 104
№ 64. 28 ліпеня. Рапарт К. Рушчыца
К. Серакоўскаму з Ражан 105
№ 65. 29 ліпеня. Прадпісанне ўпаўнаважанага
Гараіна брэсцкай камісіі 106

№ 66. 29 ліпеня. Адказ генерала А. Хлявінскага палкоўніку М. Пашкоўскаму 109
№ 67. 31 ліпеня. Ліст камісара П. Ягміна да генерала К. Серакоўскага 110
№ 68. 3 жніўня. Табліца аб стане корпуса К. Серакоўскага пад Слонімам 111
№ 69. 4 жніўня. Ліст Т. Касцюшкі да К. Серакоўскага 112
№ 70. 5 жніўня. Рапарт невядомага К. Серакоўскаму з Замосця 112
№ 71. 5 жніўня. Ліст Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму з-пад Пакутава 113
№ 72. 7 жніўня. Ліст Т. Касцюшкі да К. Серакоўскага аб розным 113
№ 73. 7 жніўня. Адказ ваўкавыскай парадкавай камісіі на зварот К. Серакоўскага 114
№ 74. 7 жніўня. Допіс аддзела парадкавай камісіі Ваўкавыскага павета генералу К. Серакоўскаму 116
№ 75. 7 жніўня. Прадпісанне Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму адносна платы жаўнерам 116
№ 76. 7 жніўня. Зварот бельскай парадкавай камісіі да К. Серакоўскага 117
№ 77. 8 жніўня. Рапарт ваўкавыскай камісіі К. Серакоўскаму 118
№ 78. 8 жніўня. Ліст галоўнакамандуючага М. Вяльгорскага да К. Серакоўскага 118
№ 79. 9 жніўня. Наказ Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму на атаку О. Лэрфельдэна 119
№ 80. 11 жніўня. Данос ражанскага губернатара К. Серакоўскаму 120
№ 81. 12 жніўня. Прадпісанне Варшаўскай рады адносна ўніверсала Т. Касцюшкі аб харчаванні паўстанцкага войска і рэквізіцыях 120
№ 82. 12 жніўня. Паведамленне П. Грабоўскага К. Серакоўскаму аб штурме Вільна і яго абароне 125
№ 83. 12 жніўня. Паведамленне А. Хлявінскага К. Серакоўскаму аб капітуляцыі г. Вільна 128

№ 84. 13 жніўня. Адказ Т. Касцюшкі
К. Серакоўскаму на markdownрознае 129
№ 85. 14 жніўня. Рапарт паручніка Я. Нямцэвіча
К. Серакоўскаму 130
№ 86. 14 жніўня. Рапарт ковенскага генерала
Абрамовіча К. Серакоўскаму 130
№ 87. 18 жніўня. Адозва Я. Ясінскага да брэсцкіх
абывацеляў адносна самавольных рэквізіцый 131
№ 88. 19 жніўня. Прадпісанне Варшаўскай рады
К. Серакоўскаму адносна шатроў 131
№ 89. 20 жніўня. Рапарт генерала Арлоўскага
К. Серакоўскаму аб стане дысцыпліны і
забеспячэння войска 132
№ 90. 20 жніўня. Рапарт К. Серакоўскаму
брэсцкай парадкавай камісіі і генерала К. Рушчыца ... 134
№ 91. 21 жніўня. Рапарт К. Рушчыца
К. Серакоўскаму 135
№ 92. 22 жніўня. Рапарт К. Рушчыца
К. Серакоўскаму 135
№ 93. 24 жніўня. Акт апраўдання благанадзейнасці
яўрэяў Моталя і Межырэчча 136
№ 94. 26 жніўня. Адказ упаўнаважанага Гараіна
К. Серакоўскаму 136
№ 95. 26 жніўня. Два рапарты К. Рушчыца
К. Серакоўскаму 137
№ 96. 27 жніўня. Рапарт К. Рушчыца
К. Серакоўскаму з Кобрына 138
№ 97. 28 жніўня. Два рапарты генерала
С. Макраноўскага К. Серакоўскаму 139
№ 98. 28 жніўня. Ліст падпалкоўніка М. Ціхоцкага
К. Серакоўскаму 139
№ 99. 28 жніўня. Штат кобрынскай кавалерыі
і брэсцкай міліцыі ў абозе пад Кобрынам 140
№ 100. 29 жніўня. Данясенне рэктара брэсцкіх
школ К. Серакоўскаму 140
№ 101. 30 жніўня. Ліст генерала П. Грабоўскага
К. Серакоўскаму 142

№ 102. 31 жніўня. Пахвальны ліст Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму ... 143
№ 103. 1 верасня. Стан корпуса К. Серакоўскага пад Кобрынам ... 143
№ 104. 3 верасня. Ліст С. Макраноўскага К. Серакоўскаму з Камянца ... 143
№ 105. Копія загаду Т. Касцюшкі генералу С. Макраноўскаму ... 145
№ 106. 4 верасня. Ліст Я. Нямцэвіча К. Серакоўскаму з-пад Рэчыцы ... 145
№ 107. 5 верасня. Ліст С. Макраноўскага К. Серакоўскаму з Турна ... 146
№ 108. 6 верасня. Паведамленне Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму аб здымцы мясцовасці за Бугам ... 146
№ 109. 10 верасня. Рапарт К. Рушчыца К. Серакоўскаму ... 148
№ 110. 14 верасня. Два рапарты К. Рушчыца К. Серакоўскаму з Кобрына ... 149
№ 111. 14 верасня. Стан корпуса К. Серакоўскага пад Ціраспалем ... 150
№ 112. 15 верасня. Рапарт генерала Княжэвіча К. Серакоўскаму ... 150
№ 113. (15—16 верасня). Ліст Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму ... 152
№ 114. (8—9 верасня). Чарнавыя запіскі А. Суворава аб паходзе з Нямірава ў Крупчыцы ... 152
№ 115. 2 кастрычніка. Рапарт А. Суворава П. Румянцаву-Задунайскаму аб баі пад Брэстам (Крупчыцамі) ... 154
№ 116. 1 кастрычніка. Рапарт генерала П. Пацёмкіна А. Сувораву аб баталіі пад Ціраспалем (Брэстам) ... 156
№ 117. 22 верасня. Рапарт К. Серакоўскага Т. Касцюшку з апісаннем боек пад Брэстам ... 164
№ 118. 20 верасня. Прадпісанне Я. Ясінскага генералу Гедройцу ... 170

№ 119. 21 верасня. Загад Я. Ясінскага
А. Казаноўскаму на выправу 171
№ 120. 23 верасня. Загад Т. Касцюшкі генералу
Арлоўскаму аб высылцы з Варшавы
самаадлучных афіцэраў 171
№ 121. 24 верасня. Рапарт К. Рушчыца аб
стратах кобрынскай кавалерыі 172
№ 122. 23 верасня. Уласнаручны загад Кацярыны
ІІ князю М. Рэпніну на поўнае ачышчэнне Літвы
ад паўстанцаў 172
№ 123. 24 верасня. Загад Т. Касцюшкі
К. Серакоўскаму на перадыслакацыю 174
№ 124. 27 верасня. Зварот Т. Касцюшкі да дывізіі
К. Серакоўскага пад Вішневам 175
№ 125. 30 верасня. Адозва Т. Касцюшкі да
літоўскага войска з Гродна 177
№ 126. 28 верасня. Данос скідзельскага шляхціча
Круповіча генералу Цыцыянаву аб знаходжанні
Т. Касцюшка ў Гродна 180
№ 127. 3 кастрычніка. Ліст Т. Касцюшкі да
К. Серакоўскага з асуджэннем дэзерцірства 181
№ 128. 6 кастрычніка. Ліст С. Макраноўскага
К. Серакоўскаму з аглядам аператыўнай абстаноўкі .. 181
№ 129. 7 кастрычніка. Вытрымка з паведамлення
барона І. Ферзена аб прарускіх настроях сялянства і
лютасці сваіх войск 182
№ 130. 11 кастрычніка. Ліст князя М. Рэпніна
А. Сувораву 182
№ 131. 23 кастрычніка. Сакрэтны ліст Кацярыны ІІ
графу П. Румянцаву-Задунайскаму аб матывах
хутчэйшага задушэння паўстання 184

Дадатак 186

Імёны, якія згадваюцца ў дакументах 222

ІМЕМ АЙЧЫНЫ

№ 1. 25 красавіка 1794 г. Універсал у ваяводствы, паветы і вольныя месцы ВКЛ аб пачатку дзейнасці вярхоўнага кіраўніцтва паўстаннем

Пасля столькіх ужо бедаў і ўніжання, усявышняе прадбачанне паслала нашаму народу шчаслівую пару і калі мужнасць здолее гэтым скарыстацца, а абывацельская дабрадзейнасць і кемлівасць пажадае яе падтрымаць, то, мілая Айчына, ты будзеш нарэшце выратавана. Слухай народ літоўскі, што табе гаворыць не слабы кароль са слабога яшчэ трону, не свавольная грамада нічога, акрамя пустога тытула, не маючага люда, а спакойны саюз зычлівых тваіх сыноў, якія доўга аб тваім вызваленні працавалі тады, калі ты ўжо ў яго зняверыўся.

Мужны народ французскі разам з іншымі падае нам сяброўскую руку, жадае нашага паўстання, падае нам для таго рознага гатунку дапамогу. Прыязнасць яго заснавана на ўзаемнай карысці двух народаў і не грунтуецца на той каварнай і драпежнай палітыцы, ахвярамі якой мы былі неаднаразова. Застаецца нам выбраць адно з двух — ужыць апошнія сілы на сваё вызваленне або люта згінуць ад рукі заўжды непрыязненых, а зараз яшчэ і раздражнёных суседзяў.

Даносім вам, шаноўныя абывацелі, што літоўскае войска, кіруемае мужным палкоўнікам інжынераў, яго мосць панам Ясінскім, не ўступаючы ў сваёй дзейснасці дабрачыннасці і адвазе камандзіра, выканала ўжо свой абавязак і ўтварыла агульны саюз. Сталічны горад Вільна вольны ад непрыяцельскага кватаравання, уся яго каманда, гарматы, сцягі і амаль усе быўшыя тут салдаты

ўжо ў нашых руках. Рэштка непрыяцельскай сілы ў Літве праз некалькі дзён будзе нашай, а калі народ пажадае паслухацца таго, да чаго будуць весці добразычліўцы, то тады назаўсёды станем вольнымі.

24 красавіка прысутныя ў Вільна абывацелі асобным актам паўстання літоўскага народа з адзінаю мэтаю атрымаць вольнасць і роўнасць абывацельскую, гэтак жа як і ўсе тыя карысці і намеры, якія пастаноўлены кракаўскім актам паўстання 24 красавіка бягучага 1794 года, урачыста прысягнулі на агульную сваю і Айчыны нашай абарону, стварылі Найвышэйшую ўрадавую раду з асоб названых у тым акце, а менавіта: Юзафа Несялоўскага, навагрудскага ваяводы, Антона Тызенгауза, віленскага харунжага, прэзідэнта г. Вільна, Бенедыкта Марыконі, Станіслава Мірскага, пісара літоўскага, Міхаіла Бржастоўскага, мінскага старасты, Дамініка Нарбута, лідскага войскага, Юзафа Паца, вілейскага старасты, Міхаіла Грабоўскага, літоўскага канюшага, Станіслава Валовіча, рэчыцкага падкаморага, Томаша Ваўжэцкага, эксхарунжага літоўскага, Мікалая Храпавіцкага, аршанскага маршалка, Валенція Гарэцкага, віленскага войскага, Бенедыкта Карпа, упіцкага харунжага, Міхаіла Страшэвіча, упіцкага маршалка, Юзафа Коцела, палкоўніка войск ВКЛ, Каэтана Нагурскага, харунжага Шавельскага павета, Вішнеўскага, прэнскага падкаморага, Мікалая Мараўскага, экспісара вайсковага, Тадэвуша Высагерда, Алаіза Сулістроўскага, экспісара літоўскага, Самуэля Корсака, Ігнація Гельгуда, эксстражніка літоўскага, Мартына Пачобута, рэктара віленскай акадэміі, Міхаіла Карповіча, смаленскага архідзякана, Ежы Белапятровіча, Антона Хлявінскага, генерал-маёра, Рамуальда Гедройца, генерал-маёра, Ясінскага, палкоўніка інжынераў і каменданта г. Вільна, Антона Лахніцкага, віцэ-прэзідэнта таго ж месца, з якіх асоб арганізавалі другія магістратуры і, згодна з тым актам, прадпісалі асобныя пункты, з чаго вынікае наступны наказ.

1. Крымінальны суд пачынаецца разам з актам і яго абавязкам з гэтага часу будзе караць здраднікаў Айчыны, працiўных яе паўстанню або саветам, або пагражаючых якой-небудзь змовай, ці такіх, хто ўжо завініўся крыміналам перад Айчынай. Суд яго будзе кароткім і калі б знайшлася настойлівая патрэба, то скаргі, довады і дакрэты належыць разабраць на працягу 24-х гадзін, а ад дакрэту нельга інакш пазбавіцца, як толькі з вызваленнем пасаромленага скаржніка або смерцю вінаватага на шыбеніцы. У той суд назначаны наступныя асобы: Юзаф Несялоўскі, навагрудскі ваявода, Каэтан Нагурскі, шавельскі харунжы, Самуэль Корсак, Феліцыян Памернацкі, віленскі земскі суддзя, Дамінік Нарбут, літоўскі войскі, Каспар Чыж, віленскі падваявода, Юзаф Пац, вілейскі стараста, Тадэвуш Высагерд, Ян Бухавецкі, віленскі земскі суддзя, Антон Баржымоўскі, ротмістр нарадовай кавалерыі, Ежы Белапятровіч, Людвік Вянзоўскі, маёр, Мацвей Бабровіч, каморнік, Тадэвуш Мардас, каморнік, Ігнацій Вайніловіч, абывацель г. Вільна. А камплект суда павінен складацца не менш чым з 7 чал.

2. Дэпутацыя забеспячэння адкрывае свае чыннасці з гэтага ж часу і ў сваёй дзейнасці будзе займацца агульна ўсім тым, чаго толькі патрэба паўстання народа будзе вымагаць задавальняючых, як мага хутчэйшых спосабаў і вынікаў. Тая ніякіх судоў не мае, а толькі па абставінах будзе адсылаць у належныя суды. У гэтую дэпутацыю назначаюцца асобы, а менавіта: Міхаіл Грабоўскі, літоўскі канюшы, Мікалай Храпавіцкі, маршалак аршанскі, Станіслаў Валовіч, рэчыцкі падкаморы, Антон Тызенгауз, віленскі харунжы, Бенедыкт Карп, упіцкі харунжы, Мікалай Мараўскі, экспісар вайсковы, Ігнацій Тавінскі, віленскі земскі суддзя, ксёндз Міхаіл Карповіч, смаленскі архідзякан, ксёндз Мікалай Тамашэўскі, Ян Міллер, Франц Фрыбас Гатліб, Юзаф Цэйдлер, абывацелі г. Вільна. Камплект жа складаецца з не менш чым 3-х асоб.

3. Дэпутацыя публічнай бяспекі гэтак жа гэтым часам адкрываецца і будзе заведваць нарадовай збройнай сілай, сцерагчы бяспеку, прадухіляць усякія перашкоды паўстанню народа. Яе асаблівым абавязкам будзе як мага пільней сачыць за тым, каб супраць паўстання Айчыны не толькі нічога не прадпрыймалася, але нават нічога не гаварылася. Уласных судоў таксама мець не будзе, а будзе адсылаць да належных па праву. Можа, аднак, па зносінах з вайсковымі начальнікамі, затрымліваць падазроных і калі б па ўчыненаму следству затрыманы паказаўся вінаватым і не было б даносчыка, тады публічны інстыгатар павядзе працэс без апеляцыі, пад адказнасцю толькі свайго ўрада. Да гэтай дэпутацыі прызначаны наступныя асобы: Бенедыкт Марыконі, літоўскі пісар, Станіслаў Мірскі, літоўскі пісар, Міхаіл Бржастоўскі, мінскі староста, Юзаф Коцел, палкоўнік літоўскіх войск, Валенці Гарэцкі, ві ленскі войскі, ксёндз Юзаф Міцкевіч, інфлянцкі канонік, Шыман Малеўскі, прафесар віленскай акадэміі, Юзаф Мейер, Антон Лахніцкі, віцэ-прэзідэнт г. Вільна, Міхаіл Дашкевіч, Ваўрынец Гяцэвіч, Лейка, абывацель месца. А камплект састаяць будзе з не менш чым 3-х асоб.

4. Дэпутацыя публічнага скарбу будзе заведваць тым жа скарбам і выконваць павіннасці, ускладзеныя правам на скарбовую камісію. А зараз пачынае такую адміністрацыю, у якую ўваходзяць наступныя асобы: князь Радзівіл, віленскі кашталян, Ігнат Дамброўскі, Ян Непамуцен Гараін, Фларыян Сыруц, ковенскі суддзя, Томаш Ваўжэцкі, ксёндз Давыд Пільхоўскі, віленскі афіцыял, Антон Важынскі, ашмянскі падкаморы, Плацыд Трашкоўскі, Матэвуш Нелюбовіч, Ксаверы Юрага, віленскі актавы пісар, Нікадзім Пжэмянецкі, Пётр Білінг, абывацелі месца Вільна. Для камплекту ж дастаткова 3-х чал.

Усе гэтыя дэпутацыі, засядаючыя ў Вільна пад уладай Найвышэйшага ўрадавага савета, абавязаны тэрмінова кожная паасобку скласці ўвесь парадак уласнай

арганізацыі і падаць яго на зацвярджэнне той жа рады, пры тым жа захоўваючы трывалыя стасункі ў выконванні павіннасцяў паміж сабой і з Найвышэйшай урадавай радай. А паколькі ж асобы найменаваныя зараз Вышэйшай радай у крымінальны суд і вышэйзгаданыя дэпутацыі ў склад самой рады не ўваходзяць і ў выпадку вакантных месцаў падлягаюць новаму назначэнню, то на вакантнае месца самой жа рады Найвышэйшая рада будзе выбіраць большасцю сакрэтных галасоў. А жадаючы ўсяляк паказаць народу ў якім духу стараннасці мы збіраемся працаваць над яго паратункам, для таго заклікаем вас, шаноўныя абываецелі, зараз жа па атрыманні гэтага ўніверсала злучыцца з намі асаблівым актам на абуджэнне народа, да той нашай рады выбраць для супольнай з намі абароны і шляхам прысягі дэлягаваць для нясення публічнай паслугі трох са Жмудскага княства, з ваяводстваў, паветаў, таксама з усіх галоўных гарадоў па аднаму. А Найвышэйшая рада, маючы тады ўжо для такой патрэбы і абставін памножаны камплект сваіх калегаў, апынецца здольнейшай скінуць ярмо ганебнай няволі і вызваліць усе свае забраныя краі.

Шаноўныя абываецелі! Пастарайцеся толькі абудзіць у сябе любоў да вольнасці і мужнасць даўніх вашых продкаў і па іх прыкладу паспалітага рушання бярыцеся за зброю — да броні, заўжды спраўнай у руцэ паляка, пастанавіце на ўзор каронных правінцый выправіць у вольныя харугвы вольных валанцёраў, у якіх найлепшай красы моладзь прадэманстравала доказы слаўных перамог над ворагам. Нарэшце, шаноўныя абываецелі, як мага хутчэй пастаўляйце ў нарадовае войска рэкрутаў колькі хто можа і захоча, не шкадуйце маёмасці і жыцця, калі гаворка ідзе аб удвая даражэйшай за тое вольнасці. Звярніцеся ласкавым голасам натуры да люду, які прымушаны ўціскамі карміць свайго непрыяцеля пры апошняй нястачы адарваным ад свайго рота кавалкам хлеба і вашага толькі чакае наказу. Няхай тая прылада,

якую яму распусны салдат перашкаджае ўжыць на апрацоўку ралля, працяўшы ягоныя ж грудзі будзе прысвечана вызваленню Айчыны і вольнасці. Абапрэмся толькі на агульныя сілы народа, возьмемся ўсе за рукі, бо ў разе той узаемнасці не можа быць граху.

Абвяшчаем вам, шаноўныя абывацелі, лозунг смерці або перамогі, пад якім наша войска шматкрат ужо набыло карысці ў выйграных бітвах. Хто не з намі, той супраць нас. На гэтых падставах дабрадзейнасці і мужнасці ўтварыўшы нам саюз, урачыста зацвердзілі прысягай на публічным рынку г. Вільна разам з іншымі абывацелямі ў наступных словах. Мы... прысягаем усемагутнаму пану богу, адзінаму ў св. Троіцы, што Айчыне жыццём і маёмасцю старанна служыць будзем, уладам, пастаўленым актам паўстання народа, найвярней паслухмянымі будзем, і ўсё, што ад нас належыць будзе на моцу абароны цяперашняга акта паўстання народа, не замінем выконваць старанна і дасканала, а што нам пастаўленая гэтым актам улада даручаць будзе не толькі ў сакрэце захаваем, але таксама ўсё наша дзеянне толькі на дабро края, а не на прыватныя выгоды скіроўваць будзем, у чым нам пан бог і нявінная мука яго сына ды дапаможа.

Застаецца нам, шаноўныя абывацелі, яшчэ вас запэўніць, што ўтрымаўшы толькі да часу ўсе ўрадавыя і судовыя ўстановы ў краі, ні прынімаць нічога ў асабістых інтарэсах, ні пастаноў падобнага гатунку выдаваць не будзем, ніякага заканадаўства не дапусцім, бо ў цяперашнім выпадку мы атрымалі шчаслівы момант, які нам мужнасць нарадовага войска адкрыла для паратунку Айчыны, пастанавіць адрачыся ад усякіх пенсій і карысцяў да той пары, пакуль з найвышэйшай дбайнасцю будзем выконваць свае абавязкі, пакуль Рэч Паспалітая не вызваліцца зусім ад замежнага салдата і, ачышчаная пакараннем злачынства ўсіх здраднікаў нашай Айчыны, не наступіць шчасце самай высокай ступені. Шаноўныя абывацелі! Найвышэйшая рада і кожная з тых дэпутацый асобна будуць вам

абвяшчаць аб патрэбах і акалічнасцях. Слухайцеся, калі не жадаеце згінуць.

Жадаючы, каб гэты універсал быў зачытаны і абвешчаны пры публічных набажэнствах, даручаем ксяндзу афіцыялу выдаць асобны для таго наказ у парафіі. Рабілася ў Вільна 25 дня месяца красавіка 1794 года.

Антон Тызенгауз, харунжы, прэзідэнт г. Вільна
Бенедыкт Марыконі, пісар і войскі ВКЛ
Станіслаў Мірскі, пісар і войскі ВКЛ
Міхаіл Бржастоўскі, стараста мінскі
Дамінік Нарбут, войскі лідскі
Міхаіл Грабоўскі, канюшы ВКЛ
Станіслаў Валовіч, падкаморы рэчыцкі
Мікалай Саба Храпавіцкі, маршалак аршанскі
Валенцій Гарэцкі, войскі віленскі
Бенедыкт Карп, харунжы упіцкі
Юзаф Коцел, палкоўнік ВКЛ
Каетан Нагурскі, харунжы шавельскі
Мікалай Мараўскі, экспісар вайсковы
Тадэвуш Высагерд, зямянін віленскі
Самуэль Корсак, палкоўнік ВКЛ
Ежы Белапятровіч

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1837, л. 200-201 адв. Тэкст друкаваны. Пераклад з польскага рэд. Рускамоўны пераклад гл.: Стогн. Паўстанне і вайна 1794 года ў Літоўскай правінцыі. Дакументы. Мн., Пейто, 2002. С. 56—62.

№ 2. 1 мая. Архіпатэрскае пасланне да вернікаў ВКЛ Д. Пільхоўскага.

Генеральная віленская пашана цэламу духавенству і здравіца ўсім вернікам

Справядлівы і міласэрны бог, у здароўі нас трымаючы, абвясціў з высокай сваёй святліцы, што ёсць народы, якіх ён пакліканы даравацъ, прабачаць і ратаваць. Нябесны ўладыка, гаворыць прарок, паўстаў, каб выслухаць уздыхі зняволеных. Упэўнімся, верныя Хрысту, у нескаваную дзясніцу усявышняга: вось яна няўпынная рука божая, якая ды паможа збаўленню! Гэта самае відаць і зараз — з намі бог, які пры айцах нашых пабуджаў і пахваляў магутным сваім знаменнем абаронцаў Айчыны, гэта ж самае робіць, уліваючы дух мужнасці і дбайнасці даўніх бацькоў у сэрцы годных сваіх сыноў. Ужо стаў ён вадзіць рукой доблеснага рыцарства, ужо абудзіў дух адзінства, мужнасці і адвагі на вялікія небяспекі, злучаючы без усякай розніцы стану верных сыноў Айчыны неразрыўным вузлом на агульную абарону і супольную дапамогу ёй.

Палашчыў ён ужо благаславіць пачатак нарадовага паўстання, паўстання супраць апошніх уціскаў і прыгнятаючай сілы. Пераканаемся, што пан заступнік з намі. Высушым горкія слёзы, па ўсім каралеўстве ўздыханні і малітвы ўніжаных сэрцаў, — і ў пачынанні паправы завяраецца нам немалая міласэрнасць божая, гэтак жа, як і з часоў зняволення Маісея і Гедэона, калі ледзь толькі прыгнечаны люд пазваў, як злітасціўіўся гасподзь, кажа пісанне, над нястачамі нашымі і даў уцешыцца, а мужнасць і дбайнасць іх усцешыў слаўнымі перамогамі. У гэтым даверы ўзносім і мы свае рукі да бога, просячы яго скрушаным і засмучаным сэрцам, якім ён ніколі не пагарджаў, парушыць народ сваёй дбайнасцю і не адмовіць у сваёй дапамозе. Паклічам, гаварыў мужны Магамет, неба: злітуйся, божа, над намі і ўспомні на

прыкладзе бацькоў нашых, што ёсць з усіх вядомых народаў такі, які выратаваць і вызваліць можа Ізраіль.

Вы, капланы усявышняга бога, хто па прызначэнню свайму і самім благаславеннем многім абавязаны Айчыне, якая гэтак узнесла ваш стан, не толькі самі ўскіньце рукі да неба ў святых ахвераваннях, не толькі імкніцеся прыкласціся да ўздыму Айчыны, колькі стан ваш і магчымасці маёнткаў вашых дазваляюць, але люд у хвалу госпада на ратунак сваёй Айчыны і прыкладам і настаўленнем натхняйце. У гэтым намеры моцай і павагай урада нашага загадваю ўсім капеланам той дыяцэзіі завяршаць месы словамі: «Божа, усёдаруючы», а ў кожную нядзелю і свята гаварыць з людам па імшы, на якую звычайна мноства збіраецца, маленнем аб найсвятлейшым імені Ісуса, а тое рабіць пры кратках, каб капелана люд лепей чуў, пасля чаго спяваць з усім духавенствам у тым касцёле — «Бог наш суцяшыцель» — і завершыць звычайным трохразовым пажаданнем, каб ён усіх злучыў агульным духам адзінства на абарону Айчыны — «просім цябе, божа». У месцах жа, дзе некалькі касцёлаў, ксяндзы плябаны, пачаўшы са сваіх касцёлаў, па чарзе правядуць 40 гадзін набажэнства, заўжды з нядзелі, каб занятыя працай у той жа дзень прысутнічалі на служэнні і каб маглі даведацца аб урадавых універсалах Найвышэйшай рады, якая паклікана грамадскасцю кіраваць непрадузятай дбайнасцю мужоў над паратункам Айчыны.

Даны ў Вільна ў канцылярыі царкоўнага афіцыяла 1 мая 1794 года

Ксёндз Давід Пільхоўскі, генеральны афіцыял

Карнелі Пацалоеўскі, канонік, загадчык кансісторыі, пісар віленскага манастыра

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1837, л. 206-207.
Пераклад з польскага і лацінскага рэд.
Надрукавана: Энгель А.М. Описание дел, хранящихся в архиве виленского генерал-губернаторства. Вильно, 1870. Т. 2. Ч. І. С. 129—132.

№ 3. 3 мая. Універсал Т. Касцюшкі аб канфіскацыі царкоўных каштоўнасцяў

Тадэвуш Касцюшка, найвышэйшы начальнік нарадовай збройнай сілы

Ахвяры, якія набоскасць аддала на аздобу боскіх святынь, у гвалтоўнай патрэбе Айчыны, у боскай справе, у справе прыціснутага народа, ратуючага свае правы і ўласнасць, якімі ён распараджаецца з дара прадбачання, не толькі варта, але і належыць ужыць на агульны скарб. Мноствам прыкладаў засведчана, што нават гаспадарскія святыні не захаваны ад рабунку непрыяцеля, які ў нашай зямлі гвалціць боскія і людскія правы, за свае лічыць рэчы, якія могуць апынуцца яго здабычай, а таму належыць аддаць іх Айчыне. Калі нават у самаўладных краінах касцёльныя багацці забраны гвалтам на фальшывыя публічныя патрэбы, то і вядомае сваёй стараннасцю польскае духавенства ахвотна прысвеціць іх на істотныя патрэбы Рэчы Паспалітай.

Затым загадваю ўсім парадкавым камісіям: 1. — паразумецца з вярхоўнай касцельнай уладай у тым, каб усякія багацці касцёлаў як свецкага, так і манаскага духавенства былі аддадзены на цяперашнюю патрэбу Рэчы Паспалітай на рукі тых камісій і пад прысягай мясцовага начальства або камітэта, дзе такія ёсць, нават без пасрэднікаў і па спісу ў тым, што нічога не ўтоена і што ўсё верна аддадзена, акрамя ўсяго таго, што па прызнанню камісій складае неад'емную патрэбу абрадаў святой рэлігіі. 2. Запэўняю вельмі моцна, што гэты кошт касцельных багаццяў, да якіх дазволена звяртацца толькі ў крайняй неабходнасці, будуць вернуты тым месцам, адкуль будуць узяты згаданыя ахвераванні, са скарбу Рэчы Паспалітай пасля яе вызвалення ад непрыяцеля, абы толькі былі ўжытыя ў падобных, крый божа, няшчасцях Рэчы Паспалітай. 3. Для таго парадкавыя камісіі выдадуць месцам асобныя квітанцыі і завядуць

кнігу квітаў са спецыфікацыяй аддадзеных рэчаў, падпісаную мясцовым начальствам, або кіраўніком, або дэлягатамі ад капітул. У кнізе павінен быць подпіс аддаючага і запісана копія квітанцыі. Паколькі люд грэчаскай рэлігіі яшчэ недастаткова адукаваны ў абавязках да сваёй Айчыны, пры тым, што паўстанне народа прадпрыма ецца таксама і для яго шчасця, спакою і бяспекі, а злосць і маскоўская хітрасць могуць падмануць яго фанатызмам, то багацці, што знаходзяцца ў цэрквах грэчаскай, уніяцкай і неўніяцкай рэлігій, выключаюцца з-пад тае ахвяры.

Пад моцнай адказнасцю загадваю парадкавым камісіям, каб яны трымаліся самых пунктаў цяперашняга распараджэння і імкнуліся як мацней прадухіляць злыя пагалоскі. Тыя ж камісіі парадкавыя абавязваюцца як мага хутчэй выконваць гэтыя пункты.

Даны ў абозе пад Вянярамі, дня 3 мая 1794 года.

Подпіс *Т. Касцюшкі*. Пячатка — вольнасць, цэласць і незалежнасць.

Згодна з арыгіналам — *Томаш Чэх*, сакратар Найвышэйшай нарадовай рады.

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1595, л. 5—5 адв. Тэкст на польскай мове. Пераклад Я. Анішчанкі.

№ 4. 9 мая. Заклік віленскай рады да добраахвотных ахвераванняў

Універсал № 8 Найвышэйшай рады да абывацеляў ВКЛ і жыхароў гарадоў Рэчы Паспалітай

Абывацелі! Паратунак Айчыны заўжды быў абавязкам абывацеля перад радзімай, даючай яму сваю апеку. У сучасных імгненнях ён апынуўся абавязкам, які самі ўсе разам аплаціць павінны, бо або разам з Айчынай уздымемся, або пад яе цяжарамі і ў жудасных патоках уласнай крыві зальемся. Люты тыран, наехаўшы на вашу

Айчыну, ужо разявіў сваю пашчу, каб вас пажэрці. Права бога, права людскасці, права нават самога нараджэння падавіў той дзікі наезнік у сваім сэрцы. Няма іншага паратунку, як толькі аддаць Айчыне ўсё тое, што ён вырашыў лупам займець, сілай яго адолець толькі зможам. Хто схаваецца за святасцю краёвай перад ягонай заядласцю? Меч, агонь, разбоі - вось адзіны яго дэвіз.

Абывацель! Нарадовая рада перад богам і Айчынай мусіла б адказваць, калі б у сваім урадаванні занядбала якім-небудзь крокам, які можа наблізіць да небяспекі вашыя дамы, маёнткі, дзетак вашых і вас саміх. Такім разам рада пастанавіла ўтварыць кнігу добраахвотнай пазыкі пад заручэннем публічнага даверу ўсіх вас, абывацеляў, што кожны давераны сваёй Айчыне капітал атрымае ў тэрмін з умоўленым працэнтам. Не адмаўляйцеся, абывацелі, даверыць вашай Айчыне на зварот тое, што ваш наезнік беззваротна выдраць можа. Рада запэўняе вам бяспеку вашых сумаў на ўсіх публічных фундушах і будучых і быць яшчэ могучых. Ваш давер вашай Айчыне будзе ацэнены грамадскасцю як ахвяра, якую чуйна на лёс маці прысвячаюць яе дзеці. Заслані вас, божа, ад разбою, злітуйся над публічным скарбам, раскрадзеным нягоднымі лона Айчыны суродзічамі, падтрымай як найсвятлей. Абывацелі! Пакажыце прысутнаму ў краі нявольніку, гэтым сумным прыладам тыраніі, як многа можаце пасвяціць Айчыне таго, чым змагаецеся за яе свабоду, за святасць праўды, за яе панаванне. Патрабуем гэты універсал як мага хутчэй разаслаць па ўсім краі і абвясціць з амбонаў у касцёлах.

Рабілася на сесіі Найвышэйшай нарадовай рады ў Вільна 9 дня мая 1794 года.

Юзаф Несялоўскі, ваявода навагрудскі
Юзаф Пац, стараста вілейскі
Міхаіл Грабоўскі, канюшы літоўскі
Бенедыкт Марыконі, пісар ВКЛ

Станіслаў Мірскі, пісар ВКЛ
Томаш Ваўжэцкі, эксхарунжы ВКЛ
Бенедыкт Карп, харунжы упіцкі
Антон Хлявінскі, генерал-маёр
Міхаіл Брастоўскі, стараста мінскі
Мікалай Мараўскі, экспісар вайсковы
Ежы Белапятровіч, экспісар вайсковы
Каетан Нагурскі, харунжы Шавельскага павета
ксёндз Мартын Пачобут, рэктар віленскай акадэміі
ксёндз Міхаіл Карпіловіч, архідзьякан смаленскі
Самуэль Корсак, палкоўнік ВКЛ
Антон Тызенгауз, харунжы, прэзідэнт Вільна
Валенці Гарэцкі, войскі віленскі
Дамінік Нарбут, войскі лідскі
Тадэвуш Высагерд, войскі прэнскі
Антон Лахніцкі, віцэ-прэзідэнт Вільна
Міхаіл Агінскі, дэлегат віленскі
Томаш Умастоўскі, дэлегат ашмянскі
Ігнацій Кастравіцкі, далегат лідскі
Міхаіл Граноўскі, сакратар каронны ад Трокаў
Антон Прозар, дэлягат ковенскі
Вінцэнт Мінкевіч, дэлягат г. Вільна
Юзаф Нарбут, сакратар рады

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1837, л. 202. Тэкст друкаваны. Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 5. 9 мая. Універсал літоўскай рады аб рэкруцкім паборы

№ 7. Ад Нарадовай рады. Універсал у ваяводствы, паветы і галоўныя гарады ВКЛ

Абываценлі! Вам ужо вядома аб спраўнай перамене, з якой прадбачанне адвярнула нас ад тае бездані, у якую нас пхалі не столькі знешнім прымусам, колькі здрада ўласных суродзічаў. Вядома ўжо, як той жаўнер, якому забаронена быць мужным, узняў у роспачы зброю помсты

нялюдскаму тырану крыўд і зняваг, нанесеных Айчыне. Ужо ведаеце, як літасцівы бог паблагаславіў тыя святыя мэты, якія прадпрыняты на паўстанне народа, а ў ім і на пабудову вашага шчасця. Аднак дарэмнымі былі б усе пачынанні, калі б вы, шаноўныя абывацелі, самі не шукалі хуткай, спраўнай і яўнай абароны на ўласнае выратаванне. Таму Найвышэйшая рада літоўскага народа як сваім універсалам, выдадзеным 1 мая бягучага года, загадала даставіць з 5 земляробскіх дымоў рэкрута на засіленне лінейнага войска, так і зараз, вас, шаноўных, абавязвае таго рэкрута паставіць у г. Вільна з бліжэйшых ваяводстваў не пазней як на працягу 2 тыдняў, а з адлеглых, як і са Жмудскага княства, на працягу 4 тыдняў уласным коштам уласнікаў маёнткаў, якія рэкруты будуць разабраны па карпусах, а ў карпусах стануць атрымліваць жалаванне з публічнага скарбу. Нарадовая рада абавязвае вас міласцю дабра вашай Айчыны і вас саміх, каб кожны ўласнік і пасэсар пры кожным дастаўленым рэкруце здаў у касу скарбовай дэпутацыі па 100 злотых у гатоўцы, або ў прапорцыі такой вартасці прадуктамі ў дэпутацыю забеспячэння.

Акрамя згаданых 5-дымовых земляробскіх рэкрутаў у лінейнае войска, Нарадовая рада асобна ж вызначае аднаго ахвотніка з касой, дзідай або сякерай пад каманду мясцовага генерал-маёра адпаведнага ваяводства ці павета, які будзе ўтрымлівацца распараджэннямі таго генерал-маёра ў павятовым горадзе, або ў парафіяльных мястэчках. Харч жа таму ахвотніку трэба даць з тых 5-ці дымоў, з якіх ён выбраны, а недахоп таго ўласнік пакрые з сялян уласнага падданства ўласнай дбайнасцю. Усе гэтыя ахвотнікі не будуць рэкрутамі, а таму не належаць да камплектавання карпусоў краёвага войска і па мінаванні патрэбы будуць вернуты ў свае дамы.

Нарэшце, нарадовая рада звяртаецца да вас, браццям шляхта, якую лёс пасяліў у ваколіцах і якую больш за маёнткі займае клопат, мужнасць і міласць да Айчыны. Не фарсіце ахвераваннямі на Айчыну, чаго нікому не дано

ні перавысіць, ні занізіць. У належнае ад вас ахвераванне ваша Айчына не чакае ніякіх іншых багаццяў, як толькі таго, што кожны здольны ёй прысвяціць, каб толькі памяталі, што з бацькоў і дзедаў з'яўляецеся часткай доблеснага рыцарства і ўсе свае сілы лучылі на ўласную абарону. Такім разам рада вызначае з 5-ці дымоў шляхты, якая не мае падданых, аднаго ахвотніка вярхом з шабляй, дзідай, пісталетам і харчам з тых жа 5-ці дымоў шляхты стаць да генерал-маёра свайго ваяводства або павета і яго арданансаў слухацца.

Жадаючы жа мець трывалы парадак і выкананне ваяводствамі і паветамі патрабаванняў сваіх універсалаў аб утрыманні паспалітага рушання на абарону Айчыны, рада забараняе цывільна-вайсковым і парадкавым камісіям разам з ягомосцямі генерал-маёрамі ваяводстваў і паветаў рабіць усялякія асобныя і самастойныя ўстанаўленні, а заўжды як мага пунктуальней працаваць над хуткім і паспяховым выкананнем універсалаў рады шляхам узаемных паміж сабой зносін ці то праз разсылку аб'яў па ўсіх парафіях, ці то з ужыццем асоб, руплівых духам служыць Айчыне на ўсеагульнае ўзбраенне. Абывацелі, не замінайце ўсіх тых сваіх абавязкаў па выправе ў лінейнае войска конных і пешых ахвотнікаў з 5-ці шляхецкіх земляробскіх дымоў, так як і ў справядлівым раскладзе рэкрутаў з 25-ці земляробскіх дымоў згодна з прысягамі пад тарыфамі апошняй люстрацыі. Тая ж рада заклінае міласцю Айчыны ваяводскіх і павятовых генералаў мець у гатоўнасці тых конных і пешых ахвотнікаў па першаму вызаву іх у любую каманду краёвага войска і як мага хутчэй асобнымі рапартамі паведаміць Найвышэйшай радзе, колькі рэкрутаў павінна выйсці ў карпусы краёвага войска. Акрамя таго, Найвышэйшая рада асцерагае валанцёраў, якія добраахвотна пайдуць на службу Айчыне, як мага хутчэй прыставаць да дывізій краёвага войска, дзе каму зручней трапіцца або падабацца будзе, заўжды ў субар дынацыі з генераламі дывізій.

Абываценлі! Памятайце тое, што вольнасць зямлі, на якой жывеце, не толькі набыта ахвераваннямі, але, звыш таго, паліта крывёю вашых продкаў, клопаты якіх вы павінны ўшанаваць з удзячнасцю. Што можа быць вартым вашага наследвання, як не мужнасць вашых прадзедаў, мужнасць, якой абавязаны і вашыя свабоды і вольнасці права, мужнасць, якую слаўны Літоўскі статут наказвае стратай гонару і маёнтка таго, хто бы ўцёк з поля бітвы. Пры сучаснай патрэбе рада ўзнаўляе тое права ў артыкуле 14 раздзела 2-га ў самым дакладным значэнні. Пакажыце, абываценлі, як спраўна і адважна ўмееце служыць вашай Айчыне, што калі на яе паўстанне краёвае войска зрабіла пачын, то вы з ім злучаецеся, вы яму дапамагаеце, вы разам з ім жадаеце дабівацца шчасця вашай Айчыны. Пакажыце, што няма сярод вас такіх, хто б з сорамам уцёк з пляца бітвы або не выбраў смерць перад ганебнай няволяй.

Абываценлі! Нарадовая рада ўласна да вас звяртаецца! Усе вы абавязаны бараніць сваю Айчыну. Усіх вас драпежны непрыяцель пазбавіць бяспекі, маёнткаў, хатаў, вашага жыцця, нават святыні самога бога і алтароў, калі вы самі запозніцеся з ахвераваннем, да якой вас рада кліча! Няхай тыран, які не мае правілаў людскасці, які не насмактаўся ні крыві людскай, ні грабяжу, яшчэ больш уразіцца тым, што на той зямлі, на якую ён найшоў, якую бязбожна пустошыць і нішчыць, не знойдзецца рукі, якая б не ўзялася за зброю для помсты ўчыненых крыўд і знявагі. Лучыцеся супольна ўсе! Нічога не шкадуйце для Айчыны, калі жадаеце саміх сябе і вашых дзяцей абараніць ад драпежнага і заядлага наезніка. Пачуйце бога, які благаславіў дабро вашай справы, адгукніцеся на мужнасць вашага жаўнера, мужнасць, растаптаную здрадай, аднак абуджаную спраўным адчаем, звярніцеся да сваёй дбайнасці, якая ўсё адолець можа! Свае жа думкі так угрунтуйце мужна, каб ні паражэнні, ні перамогі ніколі не пахіснулі вашу энергію!

Каб гэты універсал як мага хутчэй дайшоў да ведама кожнага, усім установам і краёвым юрысдыкам, а асабліва цывільна-вайсковым камісіям і магістратам, загадваецца неадкладна разаслаць ва ўсе парафіі адпаведнага ваяводства ці павета і абвясціць з амбонаў. Рабілася ў Вільна на сесіі Найвышэйшай рады літоўскага народа ў палацы Рэчы Паспалітай месяца, дня 9-га 1794 года.

Юзаф Несялоўскі, ваявода навагрудскі
Юзаф Пац, стараста вілейскі
Міхаіл Грабоўскі, канюшы літоўскі
Бенедыкт Марыконі, пісар ВКЛ
Станіслаў Мірскі, пісар ВКЛ
Томаш Ваўжэцкі, эксхарунжы ВКЛ
Бенедыкт Карп, харунжы упіцкі
Антон Хлявінскі, генерал-маёр
Міхаіл Брастоўскі, стараста мінскі
Мікалай Матаўскі, экспісар вайсковы
Ежы Белапятровіч, экспісар вайсковы
Мікалай Нагурскі, харунжы Шавельскага павета
ксёндз Мартын Пачобут, рэктар віленскай акадэміі
ксёндз Міхаіл Карпіловіч, архідзьякан смаленскі
Самуэль Корсак, палкоўнік ВКЛ
Антон Тызенгауз, харунжы, прэзідэнт Вільна
Валенцій Гарэцкі, войскі віленскі
Дамінік Нарбут, войскі лідскі
Тадэвуш Высагерд, войскі прэнскі
Антон Лахніцкі, віцэ-прэзідэнт Вільна
Міхаіл Агінскі, дэлегат віленскі
Томаш Умастоўскі, дэлегат ашмянскі
Юзаф Каcтравіцкі, дэлегат лідскі
Міхаіл Граноўскі, сакратар каронны ад Трокаў
Антон Прозар, дэлегат ковенскі
Вінцэнт Мінкевіч, дэлягат месца Вільна

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1837, л. 215-216. Тэкст друкаваны. Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 6. 10 мая. Універсал Літоўскай рады аб пастаўцы стралкоў у войска

№ 9 ад Найвышэйшай рады. Універсал у ваяводствы, землі, паветы і гарады ВКЛ

Абывацелі! Нарадовая рада 2 мая бягучага года звярнулася да вас з адозвай аб хуткай дастаўцы стралкоў, аснашчаных зброяй, порахам, кулямі і харчам. Поспех гэтага наказу дагэтуль застаецца вамі занядбаным, а патрэба ў тых людзях штодня ўзрастае. Абывацелі! Няхай міласць вашай Айчыны, міласць вашых маёнткаў, міласць кожнага з вас асабістага дабра не дазваляюць вам чыніць затрымкі з тым, ад чаго ў яе выніку і вас і вашу Айчыну можа напаткаць сумны лёс. У вялікім непакоі рада ўзнаўляе свой да вас наказ і міласцю дабра вашай Айчыны, саміх вас і вашых пазнейшых пакаленняў заклінае паставіць тых стралкоў са зброяй, порахам і кулямі не далей за 8 дзён або хутчэй як з земскіх уладанняў, так і з духоўных, каралеўскіх, а асабліва эканамічных і г. Вільна ўжо не з тыднёвым харчам, а з харчам на цэлы месяц у прадуктах або з грашыма пры іх. Паўтарае рада - заможныя абывацелі - калі яшчэ трэба паспешыць з паратункам Айчыны, калі не ў тую пару, у якую Айчына, выбіраючыся з бездані, імкнецца з сабою і вас саміх вызваліць з жудасных абставін. Каб гэты універсал трапіў да ведама кожнага, Найвышэйшая рада загадвае ўсім краёвым юрысдыкам, а асабліва цывільна-вайсковым камісіям ваяводстваў і паветаў, неадкладна разаслаць яго ў парафіі і абвясціць з амбонаў. Рабілася ў Вільна на сесіі рады 10 мая 1794 года.

Юзаф Пац, стараста вілейскі, прэзідэнт
Юзаф Несялоўскі, ваявода навагрудскі
Міхаіл Грабоўскі, канюшы літоўскі
Мікалай Саба Храпавіцкі, маршалак аршанскі
Бенедыкт Марыконі, пісар ВКЛ

Станіслаў Мірскі, пісар ВКЛ
Томаш Ваўжэцкі, эксхарунжы ВКЛ
Бенедыкт Карп, харунжы упіцкі
Антон Хлявінскі, генерал-маёр
Міхаіл Брастоўскі, староста мінскі
Мікалай Мараўскі, экспісар вайсковы
Ежы Белапятровіч, экспісар вайсковы
Каетан Нагурскі, харунжы Шавельскага павета
ксёндз Мартын Пачобут, рэктар віленскай акадэміі
ксёндз Міхаіл Карповіч, архідзьякан смаленскі
Самуэль Корсак, палкоўнік ВКЛ
Антон Тызенгауз, харунжы, прэзідэнт Вільна
Валенцій Гарэцкі, войскі віленскі
Дамінік Нарбут, войскі лідскі
Тадэвуш Высагерд, войскі прэнскі
Антон Лахніцкі, віцэ-прэзідэнт Вільна
Міхаіл Агінскі, дэлегат віленскі
Томаш Умастоўскі, дэлегат ашмянскі
Ігнацій Кастравіцкі, дэлегат лідскі
Міхаіл Граноўскі, сакратар каронны ад Трокаў
Антон Прозар, дэлегат ковенскі
Вінцэнт Мінкевіч, дэлегат г. Вільна

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1837, л. 205. Тэкст друкаваны. Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 7. 15 мая. Абвяшчэнне віленскай радай Вінярскага універсала Т. Касцюшкі ад 2 мая

№ 12 ад Найвышэйшай рады.

Рада тымчасовая літоўскага народа пад начальствам збройнай сілы абодвух народаў начальніка Тадэвуша Касцюшкі, імкнучыся прыстасаваць усе свае справы да мэтаў і распараджэнняў, прадпрынятых Найвышэйшым начальнікам, так і з нагоды атрымання радай ад таго ж Найвышэйшага начальніка ўніверсала, выдадзенага 2 мая

бягучага года ў абозе пад Вінярамі з наступнымі словамі: «Тадэвуш Касцюшка, найвышэйшы начальнік нарадовай збройнай сілы.

Ніколі палякам не была б страшнай зброя іх ворага, калі б яны самі ў згодзе паміж сабой ведалі сваю сілу і ўсю тую сілу ўмелі ўжыць. Ніколі, кажу, палякаў не перамагчы зброяй, калі б хітры вораг не знішчаў жадання і сродкаў адпора сваім каварствам, здрадай і падманамі. Увесь час маскоўскай тыраніі ў Польшчы даказвае, да якой ступені гэты прымус распараджаўся нашым лёсам, ужываючы шлях падману, здрадніцкіх абяцанняў, патурання забабонам, адабрэння страху, падбухторвання адных супраць другіх, ачарнення перад светам, словам, усяго, што толькі здольна выдумаць пякельная злоба з адборнейшай хітрасцю. Пры шматлікіх здарэннях, якім палякі пакліканы супраціўляцца са зброяй, ці можна сапраўды паканаць з тым родам разбойнікаў, калі канец польскай смеласці заўсёды быў той, што пераможаны вораг вяртаў на каркі пераможцаў часова ўскладзенае ярмо? Адкуль бярэцца такі абарот польскіх спраў? Чаму той народ енчыў без спробы выблытацца?

А тое з таго, што мацней зброі хітрасць маскоўскіх інтрыг заўжды губіла палякаў самімі ж палякамі. Звыш таго, няшчасных палякаў дзялілі ўрадавыя погляды і адносіны да правілаў, на якіх засноўвалася вольнасць і арганізацыя народа, а нявінную розніцу думак мяшаў выпіраючы дух уладных і прыватных амбіцый, супраціўленне, валакіта, схільнасць вязацца з іншаземцамі і потым ім нізка рабалепнічаць. Надышоў прыспешаны мерай няшчасцяў і цярпення час выканання, час апошні польскага лёсу, які адной мэтай, адзіным бясспрэчным намерам павінен аб'яднаць сэрцы і задумы, не пакідаючы па-за агульным саюзам нікога з палякаў, акрамя хіба толькі вядомых здраднікаў, або баязлівых і не мыслячых самастойна абывацеляў.

Цяперашняе паўстанне народа хоча вярнуць Польшчы вольнасць і незалежнасць, пакідаючы прыдатнаму часу і на волю народа вызначыць якога ён жадае ўрада. Адпіхнем на час розніцу поглядаў, няхай святая і ясная мэта кіруе сэрцамі і збірае ў грамаду нават тых, хто дагэтуль не разумеў прычын. Трэба з вялікай заўзятасцю схапіць гэты час або яго момант, інакш вораг скарыстае ўсю сваю моц, каб перашкодзіць скарыстацца той парой. Ужывем зброю, каб менш хвалявацца ад перавагі яго зброі, супраць купы ўстрывожаных ужо няволнікаў наставім магутную масу свабодных жыхароў, якія ў змаганні за сваё шчасце не могуць прамінуць перамогу. А тое, чым нас дагэтуль перамагалі, тую зброю з'едлівага маўчання нягоднікаў, той агідны макіавалізм хітрасці пераможа наша пільнасць, дбайнасць пачцівых абывацеляў і грозны меч справядлівасці, які дасягне ўсюды, дзе толькі народ угледзіць здраду або згубнае каварства. Толькі тады польскі лёс будзе залежыць ад таго, што мы самі скрушым падвоеную сілу нашых ворагаў, гэта значыць сілу зброі і сілу інтрыгі.

Павінен пры тым паведаміць народу, што маскалі ў пошуках сродкаў нацкаваць супраць нас вясковы люд выстаўляюць яму ўладарнасць нашых паноў і даўнюю яго нястачу і, нарэшце, вынаходніцтва маскоўскай дапамогі ў мінулым. Гаворачы тое, яны заахвочваюць і дапускаюць вясковы люд да паўсюднага рабунка фальваркаў. У часта непатрэбнай прастаце ён можа сесці, і сапраўды трапляе ў іх сёдлы і нават ёсць сведчанні таго, што зведзеных або ўзятых гвалтам убіраюць у свае мундзіры. Лічу сваім абавязкам вызначыць сродак пазбегнуць гэтага, які па справядлівасці ўласцівы цудоўнаму народу, мілы чулым душам, і каштуе асабістаму інтарэсу нязначнай стратай. Затым загадваю Часовай намесніцкай радзе ў Варшаве і парадкавым камісіям зямель і ваяводстваў ва ўсім краі зараз жа

выдаць наказы ўсім зямельным уласнікам, пасэсарам і замяняючым іх радцаў падараваць кожнаму кантаністу, ідучаму ў войска, не менш як адзін дзень паншчыны ў тыдзень (у чым кожны валадар можа асобна вольна і шчодра вызначацца), а грамады ў паспалітым рушанні і якія праводзяць аблавы на ворага вызваліць ад паншчыны на час іх знаходжання ў абозе, прынімаючы асаблівы клопат аб пакінутых у хатах жанчынах, жонках і дзецях абаронцаў супольнай Айчыны. Гэта ёсць спосаб прывязаць люд да публічнай справы і адвесці яго ад непрыяцельскіх сёдлаў. Даны ў абозе пад Вінярамі дня 2 месяца мая 1794 года. Тадэвуш Касцюшка;

(Віленская рада — Я.А.) абавязвае цывільна-вайсковыя камісіі ў адпаведнасці з вышэйзгаданым патрабаваннем загадаць усім наогул уласнікам, пасэсарам і іх намеснікам неадкладна вызваліць ад аднаго дня паншчыны кожнага кантаніста, а там жа, дзе земляробы выконваюць не паншчыну, а замест яе плоцяць чынш, там уласнікам і пасэсарам уладанняў трэба зараз жа разлічыць прапорцыю тых чыншоў. Няхай жыхар вольнай зямлі без перашкоды ўмоў, на якіх дагэтуль грунтуюцца ягоныя забабоны, адчуе, як удзячная свайму абаронцу Айчына жадае ўцешыць яго лёс і як гэта адрозніваецца ад лёса салдацтва нікчэмнага дэспата, якое для таго ім узброена, каб памножыць колькасць нявольнікаў і каб зямля зведвала толькі самыя найдзічэйшыя зверствы тырана.

А каб цяперашняе распараджэнне, падобна ўсяму, што рада будзе чыніць са свайго ураду, магло выразней, хутчэй і надзейней дайсці да ўсіх ваяводстваў, паветаў і іх жыхароў, усім цывільна-вайсковым камісіям загадваецца як мага хутчэй устанавіць крэс не толькі да Вільна, але і па ўсіх прыватных трактах, у чым памежныя цывільна-вайсковыя камісіі павінны хутка знесціся паміж сабой, каб тыя крэсы былі рэгулярнымі. Уласнікаў жа і рознага роду пасэсараў рада міласцю агульнага дабра

абавязвае старанна садзейнічаць поспеху ў тым наказаў парадкавых камісій. А паколькі ж рада мае паведамленні, што ўжо выдадзеныя ёю ўніверсалы дагэтуль яшчэ не абвешчаны, што небяспечна замяшаннямі, то рада загадвае цывільна-вайсковым камісіям па зносінах з плябанамі і генерал-маёрамі ў месцах сваёй юрысдыкцыі, а ў далёкіх парафіях з дапамогай генерал-маёраў і ротмістраў, пільна дагледзіць за публікацыяй усіх наказаў рады і ўсіх краёвых улад для таго, каб акрамя ўпэўненасці ва ўсеагульным натхненні жыхароў на вернасць люду, заверанаю прысягай, мацней злучаць іх на агульную абарону. Рада абавязвае ўсе цывільна-вайсковыя камісіі, каб люд, натхнёны сваімі плябанамі ў святыя дні павучаннямі, выканаў наступнага зместа прысягу: Я, такі-то, прысягаю ўсемагутнаму і адзінаму ў святой троіцы богу, што па кожнаму заклiку вярхоўнай улады буду бараніць жыццём, крывёю і ўласнай маёмасцю дамы, жонак, дзяцей, уласнасць нашу і ўсяе Айчыны супраць нашага непрыяцеля, слухацца сваіх кіраўнікоў, смела і адважна змагацца, не змаўляцца ні з непрыяцелем края, ні з ніводным здраднікам Айчыны, ужываць сваю зброю толькі на абарону Айчыны, на чым сумленна прысягаю і ў чым ды паможа мне пан бог і нявінная мука яго сына. Каб гэты ўніверсал надзейна дайшоў да ведама кожнага, рада загадвае абвясціць у парафіях, а дагледзіць тое даручаецца цывільна-вайсковым камісіям і генерал-маёрам ваяводстваў і паветаў. Даны ў Вільна на сесіі рады 15 мая 1794 года.

Шыман Вішнеўскі, падкаморы Прэнскага павета, старшыня

Дамінік Нарбут, войскі лідскі

Юзаф Кушалеўскі, дэлегат Віленскага павета

Леанард Эйдзятовіч

Бенедыкт Гацiскі, дэлегат навагрудскі

Юзаф Лапа, асэсар ВКЛ

Юзаф Несялоўскі, ваявода навагрудскі

Эжы Альбрэхт Гарабурда, дэлегат г. Навагрудка
Вінцэнт Мінкоўскі, далегат г. Вільна
Маурыцы Францішак Карп
Эжы Белапятровіч, экспісар
Самуэль Корсак
Міхаіл Агінскі
Юзаф Нарбут, сакратар літоўскай нарадовай рады

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1837 , л. 209-214.
Пераклад з польск. рэд-ра.

№ 8. 12 мая. Судовы працэс аб гвалтах гродзенскага шляхціца М. Бянкевіча

1794 года месяца мая 12 дня працэс разам са сведчаннем ад імя паноў Францішка і Ганны Уруповічаў-Тубілевічаў супраць ягомосць пана Мацея Бянкевіча, неспакойнага суседа і дагэтуль яшчэ нечуванага ў краі сваёй сварлівасцю абываценя, са спасылкай на раней учыненыя скаржнікамі ў розных судах маніфесты на невыносныя крыўды і крыміналы ад крыўдзіцеля, а асабліва ў тым, што ў апошні дзень красавіка бягучага года свавольна наскочыў у дом скаржнікаў, якія саступілі яму на 3 гады з дня св. Юзафа ваколіцу Бянкевічы ў арэнду, скаржніцу пры адсутнасці яе мужа лаяў непрыстойнымі словамі, патрабаваў сабе розны харч, па плячах біў жалезным прутом, вымагаў грошы, з пагрозамі зусім забіць выгнаў скаржніцу з хаты гаворачы, што зараз «ужо падпісаўся пад актам канфедэрацыі, я — прысяжны жаўнер, вон, курва, з майго дому», патрабаваў выкуп з пагрозай павесіць на вяроўцы. У той жа дзень, натрапіўшы скаржніцу ў доме ягомосць паноў Адамовічаў, зноў пабіць парваўся і папаліў лучынай твар і вочы. На трэці дзень мая, калі скаржніца пайшла ў ваколіцу Ганцэвічы да паноў Мікалая і яго жонкі Тубілевічаў, то яе крыўдзіцель і там нахабна заспеўшы, гэтаксама лаяў

і пабіць парываўся і пэўна б свой намер здзейсніў, каб не суседзі. Нарэшце, 12-га дня таго ж месяца і года ні ў чым нявіннага скаржніка ў г. Лідзе на кірмашу пры многалюдным зборы пагражаў павесіць на нядаўна пастаўленай на рынку шыбеніцы, і, дэманструючы кукіш, ударыў у твар. Вынішчыўшы нас, спакойных, дашчэнту, не даючы зусім арэнды з дому і выбраўшы ў прадпісаны правам тэрмін арэндныя грошы, ён насуперак забароны права і надалей парваўся спаганяць іх гвалтам, насіллем і збіццём са скаржнікаў, у чым яны ўрачыста заяўляюць свой пратэст.

НГАБ, ф. 1767, с. 122, л. 48-48 адв.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 9. 15 мая. Сведчанні галоўнага касіра ВКЛ К. Язерскага аб абставінах рабунку скарбу ў Гродна

1794 года месяца мая 15-га дня ягомосць пан Язерскі асабіста падаў у акты земскія Гродзенскага павета ніжэйпісанае сведчанне наступнымі словамі. Ніжэйпадпісаны абывацель сведчыць перад намі, што калі грамадскасці не вядома аб маім характары і вернасці Айчыне, тады па абавязку службы генеральнага касіра ВКЛ я наступным чынам тлумачу аб захопе 5 мая галоўнай касы расійскім войскам. Яшчэ з мінулай камісіі я быў асуджаны на ўціск, праследванне і нават на страту жыцця як верны і паслухмяны выканаўца ўсіх наказаў сваёй вышэйшай улады. Як толькі палкоўнік Караваеў прывёў пад экскортам у стары замак надворнага літоўскага падскарбія яснавяльможнага Дзяконскага і скарбовага камісара яснавяльможнага Нелюбовіча, як прыбыўшыя тут жа паклікалі мяне проста ў судовую залу, дзе я, стаўшы, атрымаў загад яснавяльможнага падскарбія, камісара і палкоўніка пайсці з імі ўніз і атварыць касу. На сходах з гары я атрымаў пінок у карак

ад палкоўніка Караваева з дабаўленнем слоў - пакажы дзе грошы рэспублікі. На самай жа прыступцы да касы ён прыдушыў мяне з пагрозай адразу ж павесіць, калі не атрымае праўду пра грошы і, паказаўшы на ляжачую на стале вяроўку, другі раз прыстрашыў мяне павесіць, калі я не пакажу дзе закапаныя з волі маёй вярхоўнай улады грошы, які я не мог ні перахаваць, ні схаваць пры такім шматлікім расійскім войску. Я не зрабіў ніякай здрады, не ведаю па чыім загадзе арыштаваны, нарэшце, не ведаю перад кім павінен апраўдвацца. А паколькі святлейшая скарбовая дэпутацыя моцай сваей рэзалюцыі выклікае мяне ў Вільна з рэшткамі галоўнай касы і рахункамі, то я ў самых чыстых сентыментах сведчу перад народам сваё моцнае жаданне і прагу паехаць у Вільна з рэшткамі грошай і рахункамі для тлумачэння аб захопе касы. Няхай я буду вінаваты і пакарання варты з пераканання і довадаў, а прыціснуты абывацель няхай знойдзе належную сабе апеку права. Датаваны ў Гродна месяца мая 15-га дня 1794 года. Тое сведчанне ўнесена ў акты з уласнаручным подпісам актара ў наступных словах: *камісар Язерскі*. Гэта сведчанне пададзена ў акты і запісана ў земскія кнігі Гродзенскага павета, згодна з пратаколам *(Казімір) Эйсмант*, земскі суддзя.

НГАБ, ф. 1755, с. 79, л. 585—585 адв.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 10. 24 мая. Судовы запіс лідскіх шляхціцаў Быкоўскіх аб рабунках казакоў у фальварку Лябёдка

Сведчанне 1794 года месяца мая 24-га дня ясна-вельможных паноў Андрэя і Даменіка братоў Быкоўскіх, разам з усімі пацярпеўшымі невыносныя мукі тыранства, пажогі і рабункі маскоўскіх войскаў наступнага характару. Усё пачынаецца з чаго-небудзь і гэта, канешне, прыкрая справа ўсвядоміць, што з самым вялікім дабром

і поспехам у вытоках справы спавіты не меншыя цяжкасці ў канцы. Гэтаксама і паўстанню літоўскага народа, прынятаму ўсімі абывацелямі, з самымі светлымі намерамі ствараючаму шчаслівы лёс нам і нашым нашчадкам, будуць прыкрыя з самога пачатку даносы і скаргі. Вось і мы, Быкоўскія, зараз скардзімся разам з усімі абывацелямі, хто пацярпеў горшыя тыранію і рабункі ад праходу з Гродна па беліцкаму тракту маскоўскага абоза або паблізу ягонага кватэравання пад Шчучынам. А менавіта, на 11 дзень месяца мая 1794 года пяхота і казакі з маскоўскай каманды Цыцыянава, напаўшы на фальварак Лябёдка і знайшоўшы Андрэя Быкоўскага ўжо 4 гады ляжачага ў ложку і няздольнага хадзіць, вывалаклі таго за ногі з ложка, білі і таптаді, неміласэрна мучылі ў пошуках грошай, жудасна збілі ягоную жонку Разалію Быкоўскую, перабіўшы ёй руку. А калі такім мучэннем не дабіліся грошай, то парастаўлялі вакол двара пікеты, выбілі ў свірнах дзверы, паадчынялі і парубілі канторкі, скрыні, куфры, шкло, фарфор, паўбулкі хлеба, муку і крупу рассыпаўшы па дзядзінцу, стапталі сваімі коньмі, каўбасу і алейныя абразы восам скармілі, і так бязбожна скаржнікаў вынішчылі, што забралі апошняе сукно, залогі і бялізну коштам больш чым у 1 тыс. зл., а некаторыя захапілі і паперы, сярод якіх быў аблiг на 2 тыс. зл., выдадзены лідскім ротмістрам Шалевічам пану Андрэю Быкоўскаму. Мала таго, раз'юшаныя тыраны наскочылі на дом Дамініка Быкоўскага і так яго без апісання вытанчанасці мук збілі і змардавалі, што ён зараз ледзьве жывы. Пасля таго, як Андрэя Быкоўскага звалаклі ў абору, яны паўтарылі мучэнні над Дамінікам Быкоўскім, якому перабілі грудзі дзідай і які, праляжаўшы ўсю ноч на гнаі і доўга не маючы ратунку ад распужанай чэлядзі, аддаў ім у гатоўцы 4 чырвоных зл. Усяго ж яны ўчынілі шкоды на некалькі тысяч злотых. Скаржнік жа, Бенавентура Быкоўскі, пры тым адсутнічаў з-за сваёй паездкі і змог захаваць жыццё

і здароўе, праз якога я, Дамінік Быкоўскі, і я, Андрэй Быкоўскі, не могучы прыехаць у Ліду і штодня чакаючы смерці ад маскоўскіх зверстваў, далучаемся да акта паўстання народа і вызначаем у сведкі таго, што паколькі не здольны самі падпісаць акта, то з уласнай волі давяраем свой подпіс Бенавентуры Быкоўскаму, а гэтае сведчанне належыць прыняць у земскія кнігі Лідскага павета з усякай нашай адказнасцю перад грамадскасцю. Такое сведчанне зацвярджаю подпісам уласнай рукі:

Бенавентура Быкоўскі.

НГАБ, ф. 1767, с. 122, л. 63 адв. — 64.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 11. 6 чэрвеня. Акт рэквізіцыі папер у гродзенскага камісара паліцыі Л. Ліпніцкага

Абывацель Леапольд Ліпніцкі падаў у зямянскія кнігі Гродзенскага павета асабіста напісаны ліст такога зместу. Рабілася ў Гродна ў замку на сесіі дня 21 мая 1794 года. Дэпутацыя бяспекі Гродзенскага павету, ведаючы, што ў быўшага гродзенскага інтэнданта паліцыі, ягомосць пана Ліпніцкага, знаходзяцца кнігі і сакрэтныя пратаколы, а таксама звязаныя з функцыямі яго ўрадавання паперы, загадвае таму Ліпніцкаму зараз жа здаць іх па ўласнаскладзенаму рэестру ў дэпутацыю бяспекі Гродзенскага павета і прысягнуць пад вернасцю тае справаздачы. Дата вышэй. Пад тым лістом подпісы наступныя:

Юзаф Бабінскі, парадкавы камісар Гродз. павета
Францішак Ваўкавіцкі, камісар камісіі бяспекі
Ігнат Шаняўскі, камісар камісіі бяспекі
Дыянісій Рагуза, сакратар камісіі бяспекі

Той ліст, пададзены ягомосцю панам Ліпніцкім, прыняты і ўпісаны ў зямянскія кнігі Гродзенскага павета.

Згодна з рэестрам тыя паперы камісара паліцыі Гродз. павета прыняты ў дэпутацыі бяспекі ў цэласці і несапсаванымі.

НГАБ, ф. 1755, с. 79, л. 656.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 12. 7 мая. Адозва Т. Касцюшкі да праваслаўнага духавенства і вернікаў

Адозва да польскага грэка-ўсходняга неўніяцкага духавенства, як манахаў, так і свецкіх

Капланы! Кожны дзень вы даведваецеся пра лёс людзей, жывучых пад ярмом дэспатызма. Штодня вам знаёма, што вымыслы, якія вакол нас той урад распаўсюджвае, не з сапраўднай павагі да капланаў паходзяць, а з подлага інтарэсу, жадання пры вашай дапамозе ўтрымаць люд у нікчэмнай няволі. Вы ведаеце таксама, што зброя маскоўскай дзяржавы заснавана на гвалтах і захопах, на злачынствах і каварстве, горшым у свеце бяспраў'і і неўласцівым людзям і народам перасследам, жадаючай заўсёды папіраць сваю бязбожнасць з дапамогай святасці і яе капланаў. Вы, каму даверана асвета люду і хто павінен даглядаць яго, расплюшчыце яму вочы і, памятаючы аб яго і сваім уласным дабры, пераканайце, што пры захаванні праўдзівай вернасці сваёй Айчыне і, нарэшце, польскаму народу апынецеся годнымі карыстацца правамі і прывілеямі вольнасці і рознымі дабрадзействамі салодкага ўрада, якія сваёй крывёю выкупаюць палкі.

Гэта так, капеланы! Разам з усім людам вы - маскоўскія нявольнікі, з намі ж будзеце шануемымі капеланамі, а ваш абрад, ваша ўласнасць, вашыя даходы - у той жа цане, што і нашых уласных святароў. Не хвалюйцеся тым, што розніца поглядаў і абраду перашкодзіць нам кахаць вас як братоў і адзіназемцаў. Наадварот, галоўным сваім абавязкам мы лічым даць

вам адчуць розніцу паміж жорсткім і несправядлівым панаваннем, пры якім вы жывеце, і панаваннем права і вольнасці, да чаго вас заклікаем. Успомніце, які значны давер аказаў вам Вялікі сейм, калі склікаў вас на кангрэгацыю ў Пінск, куды паслаў сваіх камісараў, які дазволіў вам пастанаўляць і ўсё вамі самімі пастаноўленае для грэка-усходняй царквы з прыемнасцю прыняў. Калі б вы да гэтага былі лепш забяспечаны, калі б мелі ўсю сваю касцельную іерархію і сваіх епіскапаў, то не цярпелі б больш на чале касцёла кабету і што насуперак выразных канонаў святой веры і святых айцоў мусіце дагэтуль цярпець, калі б працы таго слаўнага сейма не былі нахабна абарваныя. Але будзьце ўпэўнены ў тым, што тое, чаго ён не завершыў, будзе завершана, што вольнасць грэка-усходняга абраду з належным за беспячэннем яго капеланаў з'яўляецца нашай мэтай. Мы жадаем вас, братоў нашых, прыхільнасцю і добрадзействамі прывязаць да агульнай Айчыны. Затым злучайце свае сэрцы з палякамі, якія са зброяй шукаюць сваёй і вашай вольнасці. Няхай люд па вашаму натхненню ўзбройваецца і паўстае. Няхай Польшча зведае ў вашай прыхільнасці верных сваіх сыноў. Усемагутны бог ёсць і будзе нам дапамогай, які прагне ўратаваць сваіх блізкіх і ўмацаваць іх агульнае шчасце, які пакарае дзёрскаць тых, хто з уласнай задумы і амбіцый забываецца пра енкі і нястачу, пра няволю няшчаснага люда. Тым самым вы адчыніце шлях да ўласнага і вашых нашчадкаў шчасця. Палякі падаюць вам руку і запэўняюць, што ніхто з нас не складзе зброі, пакуль і мы, і вы, абывацелі грэка-ўсходняга вызнання, не станем вольнымі і шчаслівымі.

Дадзены пад Паланцамі дня 7 месяца мая 1794 года.
Т. Касцюшка.

Pisma Tadeusza Kosciuszki. Warsz., 1947. С. 108—109. Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 13. 12 мая. Ліст Т. Касцюшкі да Ф. Сапегі

Да Францішка Сапегі, генерала літоўскай артылерыі, з абозу пад Паланцамі 12 мая 1794 года.

Шаноўны абывацель і любы калега! Да глыбіні душы крануты тваім абывацельскім крокам, дабратворным для тваёй славы і для дабра Айчыны, а затым як брат, як сябра, як зямляк дасылаю гэтыя заўвагі з верай, якую заслугоўваюць твае дабрадзейныя памкненні. Павучальная і шчырая твая сціпласць дабаўляе красы тваім добрым годнасцям. Аднак дазволь мне гэту сціпласць апячы - дык вось, прашу, трымайся гэтага даверу і дзеля дабра края выконвай абавязкі свайго месца. Пасылаю табе патэнт генерал-лейтэнанта. Мяркую, што ўладнай рукой утрымаеш свой ранг для паратунку Айчыны тым больш, калі яе жаданні апярэдзіў голас войска. Збяры вакол сябе вайсковую раду з афіцэраў, вядомых дбайнасцю і здольнасцямі, прычым заклікаю спраўляцца ўласным розумам, а не пабочнай інсунуацыяй. Абдумаўшы рашэнні, чынна і спраўна выконвай іх. Старайся як мага лепей і заўжды ведаць аб непрыяцельскай сіле, а ўласныя сілы трымай у парадку, субардынацыі і ў духу дабрадзейнага запалу.

Дбай аб жаўнеры, яго забеспячэнні і выгадзе. Дай тваім падначаленым уласны прыклад, што да асабістай беражлівасці, што да працы, што да пільнасці. Асабліва раю трымаць як мага большымі багажы пры абозах. Не турбуйся няведаннем ваеннага майстэрства і памятай толькі аб тым, што дабра належыць дабіцца па агульнаму характару войска, а ягоны поспех залежыць ад распаўсюджвання запалу і генеральнага ўзбраення ўсіх жыхароў нашай зямлі. Дзеля гэтага трэба абудзіць любоў да края ў тых, хто дагэтуль не бачыў, што мае Айчыну. У нашых абставінах цяжка адразу паставіць 100 тыс. лінейнага войска, аднак лёгка дабіцца пастаўкі масы ўтрая большай, чымсці 100 тыс., калі толькі шчыра

захочуць зямяне і князі, каму люд давярае кіраўніцтва. Я ведаю, што вайскоўцы, асабліва з замежнай службы, прыхільныя да звычайных метадаў вядзення вайны, будуць замяшкацца ў распараджэнні гэтымі сіламі ў цяжкі момант, аднак трэба часам адступацца ад агульнапрынятых правілаў. Хто бы мог паверыць, што з двума эскадронамі кавалерыі і 300 людзей касінераў, узятымі перад тым у абоз, можна было зламаць маскоўскую пяхоту пад Рацлавіцамі, забраць 12 гармат і аднымі косамі здабыць перамогу. Таму кавалерыю трэба такую ўтварыць, якая пры сумесным кіраванні з лінейным войскам заўжды будзе прадвырашаць перамогу. А для гэтага трэба прывязаць да публічнай справы люд тымі сродкамі, якія яму прымальней для дасягнення мэты. Канчатковая рэч — гэта палёгка паншчыны. У Кароне гэта зроблена, а твой прыклад, шаноўны абывацель, можа ў тым мець вялікі плён.

Я даведаўся, што ў Вільна зроблены акт нарадовага паўстання. Разумею, што Літва будзе часткай той вялікай ісціны, што цяперашняя справа больш за ўсё патрабуе аднастайнасці і калі ўсе ваяводствы Кароны ўжо прадэманстравалі гэтую аднастайнасць, то і Літва павінна паследваць за імі, калі жадае пэўнага поспеху ў абароне цэлага края. Было б позна шкадаваць, што няўмелае кіраванне даўнімі звычаямі, не прыстасаванае да сучасных абставін, апынецца перашкодай агульнаму набліжэнню ўласнага вызвалення. Няхай ніхто з добрадзеяў не прагне ўлады. Яна даверана маёй руцэ на крытычны момант. Я не ведаю, чым заслужыў гэты давер, аднак адно знаю, што тая ўлада для мяне ёсць адзіны сродак для паспяховай абароны маёй Айчыны і, прызнаюся, я да канца яе шчыра прагну, як і самога вызвалення народа.

Прымі, шаноўны абывацель, яшчэ адну істотную заўвагу прыяцеля ў тваім сучасным становішчы. Ты аточаны ў сваім доме людзьмі, дбаючымі больш аб сабе, чым аб

табе, або інтарэсе Айчыны, людзьмі, павязанымі са здраднікамі Польшы. Трымай іх на вачах, сцеражыся іх лоўкасці і пакрысе ачысці кола сваіх дамачадцаў. Мая шчырасць раіць яшчэ паклікаць да сябе Ваўжэцкага і Прозара і мець раду і дапамогу тых двух, як годную твайго даверу. Іх характар і светласць вядомыя, іх абывацельства бясспрэчнае. Нарэшце, памятай аб тым, што пачынанне наша па роду справы патрабуе больш рэвалюцыйных сродкаў і спосабаў, гэта значыць спраўных і хуткіх, што хатнія інтрыганы небяспечней непрыяцеля, што гэты момант апошні для нашай Айчыны, што, нарэшце, няма нічога даражэй за яе, а родзічы, сябры, маёнткі, само нават жыццё — ніштo побач з яе вольнасцю, цэласцю і незалежнасцю.

Пішу табе гэты ліст у той момант, калі мяне атакуе непрыяцель. Не замаруджу паведаміць пра лёс гэтага дня, а тым часам, шаноўны абывацель, давяраю Айчыну твайму клопату, княства Літоўскае — твайму нагляду, а сябе — тваёй прыязні. Тадэвуш Касцюшка.

Pisma Tadeusza Kosciuszki. Warsz., 1947. С. 113.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 14. 15 мая. Зварот Т. Касцюшкі да брэсцкіх і кобрынскіх абывацеляў

Тадэвуш Касцюшка, найвышэйшы начальнік нарадовай збройнай сілы!

Далучэнне ваша, абывацелі і мае суайчыннікі, да акта нарадовага паўстання, учыненае з такой шчырасцю і дакладнасцю, якія ўласцівы толькі сапраўдным сынам Айчыны, выклікала ў маім сэрцы вялікае задавальненне не таму, што я, ваш зямляк, вашымі памкненнямі, дарагімі для мяне, пакліканы кіраваць нарадовай збройнай сілай, а таму, што ў вашым паўстанні бачу дух згоды і еднасці, якімі толькі і можна вызваліць раскалотых палякаў.

Непакой ваш аб віленскім акце яшчэ больш упэўнівае мяне ў вашым перакананні ў тое, што толькі аб'яднанымі сіламі, радай і ўсім магчымым мы зможам скінуць з сябе кайданы няволі, здабыць цэласць межаў Рэчы Паспалітай і вярнуць народу самаўладства. Прашу вас, землякі, пашырыць гэтую ісціну ў іншыя літоўскія паветы, на якія маеце бліжэйшы ўплыў. Абранне вамі ў склад парадкавай камісіі 8 асоб грэка-усходняга абраду паказвае, што вы ўмееце звязваць здаровую палітыку з духам абывацельства. Старайцеся, каб іншыя паветы, дзе знаходзіцца шмат люду гэтага вызнання, паследвалі вашай размаітасці, бо такім шляхам прывяжыце да Айчыны люд, падмануты фанатызмам Масквы. Ён аддзякуе сваім суродзічам, калі ўбачыць, што з ім абыходзяцца па-брацку, што яго кладуць побач і што яму, як і ўсім абывацелям, адчыняюць доступ да галоўных устаноў. Запэўніце ўсіх грэка-усходніх асоб маім імем, што яны атрымаюць усе свабоды, якімі дазволена цешыцца ўсім вольным людзям, супольна з намі і што ім вяртаецца ўсеўладная канстытуцыя ў адпаведнасці з правамі канстытуцыйнага сейма. Няхай яны ўжывуць увесь уплыў на люд свайго вызнання, каб пераканаць яго ў тым, што мы ў барацьбе за вольнасць прагнем ашчаслівіць усіх жыхароў нашай зямлі.

Даны ў абозе пад Палянцамі дня 15 месяца мая 1794 года. *Тадэвуш Касцюшка.*

Pisma Tadeusza Kosciuszki. Warsz., 1947.
С. 116—117. Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 15. 25 мая. Забарона гродзенскай парадкавай камісіяй несанкцыянаваных прамоў да народа

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, разглядзеўшы на пленарным пасяджэнні розныя паследствы, якія б маглі недарэчна ўзнікнуць з вольнасці прамоў да люда і

з гэтага магчымасць шкоднага ўспрымання правілаў урада, пастанаўляе, што з гэтага часу ніхто не можа звяртацца да люду акрамя толькі павятовага ці муніцыпальнага камісараў, якіх грамадскасць будзе адрозніваць па знаку чырвонай хусткі, павязанай злева на рамні. Той жа, хто насуперак гэтаму папярэджванню адважыцца гаварыць сабранаму люду або, прысвоіўшы такі знак, апавядаць тым больш шкодныя яму якія-небудзь правілы, той тут жа будзе арыштаваны і асуджаны як крымінальны парушальнік бяспекі.

Nurty lewicowe w dobie polskich powstan narodowych 1794—1849. Wroclaw, 1961. С. 31. Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 16. 26 мая. Пастанова гродзенскай парадкавай камісіі аб парушальніках грамадскага спакою

Цывільна-вайсковая і парадкавая камісія Гродзенскага павета, з чуласці да ўсяго, што толькі можа спраўна ўгрунтаваць сучаснае хвалебнае паўстанне нашага народа і абдумана прывесці да будучага поспеху, разумеючы, што ў гэтым выратавальным памкненні ўзбраенне супраць знешняга непрыяцеля трэба ў роўнай меры паважаць з утрыманнем унутранага ў краі спакою, выконваючы як мага дакладней выдадзеныя для дабра і шчасця Айчыны наказы Найвышэйшага начальніка паўстання народа Тадэвуша Касцюшкі, загадвае свайму аддзелу бяспекі зараз жа знесціся з цяперашнім гродзенскім муніцыпальным урадам і паставіць дазорцу паліцыі са стражнікамі, якім належыць сурова наглядаць за тым, каб ніхто лёгкадумнымі і запальчывымі прамовамі не падбухторваў, не распальваў люд і не ўзрушаў яго да якіх-небудзь акцый, парушаючых публічны спакой, каб ніхто не ўхіляўся ад належнай павагі і падпарадкавання магістратурам, не аслабляў і не псаваў даверу да іх у людзе, і каб ніхто не

асыпаў нікога неслушнымі клявузамі, якія б атруцілі так патрэбныя зараз згоду, адзінадумства, брацкую любоў і добрую гармонію паміж абывацелямі.

А затым камісія папярэджвае і пастанаўляе лічыць усе згаданыя выпадкі як шкоды ўнутранага ворага Айчыны, аб усіх такіх правіннасцях, парушчаючых грамадскі спакой і тым самым спрыяючых непрыяцелю адолець нас выгаднымі для таго ўзаемнымі сваркамі, неадкладна даносіць праз чыноў паліцыі ў дэпутацыю бяспекі, дзе старанна расследаваць і пры пераканаўчых довадах, што сапраўды выяўлена віна, адсылаць на пакаранне ў крымінальны суд. Гэтую пастанову загадваецца абвясціць бубнамі на рынку і ў касцёлах.

Nurty lewicowe w dobie polskich powstan... С. 31—32.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 17. 5 чэрвеня. Пастанова гродзенскай камісіі аб шыбеніцах для ворагаў народа

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, атрымаўшы на цяперашняй сесіі паведамленне муніцыпалітэта, што на рынку г. Гродна пастаўлена шыбеніца з надпісам на адным баку - «Смерць здраднікам Айчыны», а на другім - «Страшыся, здраднік», прызнаючы ў той пастаўленай прыладзе смерці чэсны і добры спосаб мыслення і міласці да сваёй Айчыны ў час цяперашняга паўстання з няволі нашай Айчыны і з-пад знешняй тыраніі, насунутай праз амбіцыю, інтрыгу і прадажнасць нашых землякоў, не вартых таго імя і ў сапраўднасці здраднікаў, расцэньваючы такое дзейства, як дэманстрацыю руплівасці да каханай Айчыны, як падыходзячы спосаб, які дазволіць навогул устрымаць з'яўленне новых, папярэдзіць і вярнуць даўно настроеных супраць інтарэсаў свайго народа і сучасных правілаў рэспубліканскага ўрада на

належную дарогу служэння святым намерам і зараз уласцівым сваёй Айчыне, што загадвае запісаць у сваім пратаколе.

Nurty lewicowe w dobie polskich powstan... С. 32—33.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 18. 17 чэрвеня. Рапарт генерала М.А. Зубава князю Рэпніну аб бойцы над Соламі

Честь имею донести Вашему сиятельству, что сего июня 8-го числа прибыл я со вверенным мне войском к местечку Соли и, заняв лагерь по правую сторону реки Ошмяны, нежданно отрядил Нарвскаго пехотнаго полка господина подполковника и кавалера Люиза за три версты вперед в дер. Нарбутовщизну с баталионом Псковскаго пехотнаго полка, двумя эскадронами Изюмскаго легкоконнаго, 75-ю козаками и двумя полковыми орудиями как для охранения моста на упомянутой реке, так и в намерении получать от онаго отряда предварительныя известия. Будучи же уведомлен подполковником и кавалером Люизом 13-го числа около полуночи, что неприятель атаковал передовые его посты в таком множестве, что он принужден был велеть оным отступить, в разсуждении чего и предписал ему, коль скоро увидит приближающегося в превосходных силах неприятеля, то отступил бы со сказанным отрядом к лагерю, который занимал я со всем вверенным мне войском. Сие самое в ночи на 14-е число и было им выполнено. Многочисленная толпа мятежников за ним следовала и, как тогда же узнал я, оная составляла авангард Ясинскаго.

14-го же числа по полуночи в четвертом часу неприятель показался уже тремя густыми колоннами в числе более десяти тысяч человек и занял возвышения противуположнаго мне берега реки Ошмяны. На оных возвышениях построили они в боевой порядок из числа всех их войска среднюю и леваго фланга колонны и

открыли жестокую канонаду, но оная ни малаго вреда нам не причиняла.

Между тем с праваго их фланга более трех тысяч отборных из упомянутаго их скопища, перебравшись чрез мост в деревню Нарбутовщизну, приближались к левому моему крылу. Превосходное число неприятеля в сравнении малой части, которою я мог с оной стороны учинить ему отпор, понудило меня переменить взятое мною положение и под командор храбраго бригадира и кавалера барона Беннингсена велел я правому флангу построиться близ моста, у самаго местечка Соли, продолжа всю линию моего корпуса даже до деревни Шиканы, от которой в недальнем разстоянии левый мой фланг примыкал к лесу, заняв, между тем, случившееся против оной деревни выгодное возвышение.

Неприятель, приняв движение сие за ретираду, окружал нас со всех сторон: правый его фланг с несколькими орудиями и многочисленною пехотою сближался к упомянутому лесу и в то же время великое их число с леваго фланга потянулось к местечку Соли, чрез которое и покушались прорваться. В течение сего клонилось к намерению моему, сходственно коему и желал я вступить в бой, в разсуждении чего немедля отрядил для прогнания для скопляющагося близ леса неприятеля под прикрытием баталиона пехоты Эстляндскаго корпуса первый егерский баталион, находящийся под командою подполковника и кавалера Шилинга, который, не взирая на сильную неприятельскую оборону, учинил столь мужественное нападение, что не только с великим уроном прогнал, но и отбил пушку и фальконет... В продолжении же сего велел я Изюмскаго легкоконнаго полку двум эскадронам под командою того же полка подполковника Войнова ударить на неприятеля, окружавшаго лес. Он напал в некотором разстоянии от леса на удаляющуюся во множестве пехоту и отбил пушку... В сие же время казачьяго полка полковник Киреев с отрядом казаков разил неприятельскую пехоту, как неустрашимый и расторопный воин лично отбил еще пушку.

Главная толпа неприятелей, ожидая остатков разбитаго уже своего праваго фланга, покусилась еще стать в бой на случившемся возвышении, но артилерии капитан и кавалер Богданов, управляя батареею главной артиллерии нашей, столь искустно действовал орудиями на поражение толпы мятежников, что не только побил оных великое число, но, доведя тем до совершеннаго разстройства, обратил их в бег, и тогда вообще правый фланг неприятеля в величайшем смятении единственно в бегстве уже искал своего спасения... Равная участь последовала и с левым неприятельским крылом. Сия многочисленная толпа, как выше упо мянул я, приняв перемену положения моего фронта за отступление, с отчаянностью стремилась к местечку Соли, где правый фланг вверенная мне войска вообще находился под командою господина бригадира и кавалера барона Беннингсена, которому воздать должное одобрение яко военноначальнику с предведением и испытанному уже в мужестве предоставляю я главному начальству. Распоряжения же его в оном сражении споспешествовали к полной победе над многочисленным неприятелем.

Для защищения местечка Соли отряжен от меня был Эстляндскаго корпуса 4-й егерский баталион под командою Ростовскаго пехотнаго полка подполковника и разных орденов кавалера барона Сакена, который с твердостию и противустоял неприятелю, но, видя превосходное число онаго, зажег местечка Соли и, отступая, отражал во множестве стремившихся перейти чрез брод по левую сторону моста на реке Ошмяне. Великое число неприятелей с леваго их фланга приближалось к берегу, не видя против себя поставленной за кладбищем батареи, так и всего Тамбовскаго полка под командою полковника и кавалера Деева, который со всем оным полком примыкал к мелкому лесу вдоль берега реки. Мятежники немедля встречены были жестоким огнем с упомянутой батареи под управлением артиллерии подпоручика Друговцова, который, с отличною расторопностию действуя

вверенными ему орудиями, не только остановил сию стремящуюся толпу, но, причиня поражением оной величайшую разстройку, обратил мятежников в бег...

Переправа чрез реку и множество неприятельской конницы препятствовали мне преследовать за ними, почему и удовольствовался поражением бегущих во множестве от жестокаго огня нашей артиллерии, от чего великое число бунтовщиков погибло. Увидя же на возвышениях за рекою еще выстроившагося неприятеля, что было уже по полудни в 4-м часу, решился сам атаковать, для чего и отрядил подполковника и кавалера Деева с Тамбовским пехотным полком, пятью полковыми орудиями и 40 козаками, Псковскаго пехотнаго подполковника и кавалера Люиза с отрядом пехоты, секунд-майора Глазенапа с 3 ротами Псковскаго пехотнаго полка и Изюмскаго легкоконнаго подполковника Баркова с 2 эскадронами...

Едва сия часть вввереннаго мне войска показалась против неприятеля и открыла по нему канонаду, то многочисленная сия толпа и пустилась в бегство по виленской дороге. В погоню за ними отрядил я Изюмскаго легкоконнаго полковника Трегубова с 4-мя эскадронами, подполковника и кавалера Шилинга Эстляндскаго корпуса с 1-м егерским баталионом, полковника Киреева с козаками его полка и Эстляндскаго 4-й егерский баталион под командою подполковника и разных орденов кавалера барона Сакена. Но неприятель с такою поспешностью бежал, что невозможно было инаго учинить, кроме истребления его арриергарда. Мятежников погибло множество и немалое число взято в полон.

Сражение началось поутру в 4 часа и продолжалось до 8 по полудни. Неприятельский урон состоит убитыми более 1000 человек, число пленных до 200 и отбит 4 пушки. Потеря же с нашей стороны: Изюмскаго легкоконнаго полка из рядовых убит один, ранено четырнадцать, лошадей убитых 18, раненых 12, Эстлянд-

скаго корпуса 1-го егерскаго баталиона убитых капрал 1, егерей 3 человека и 4 раненых, итого убито 6 и ранено 32 человека...

Копія. Надрукавана: Энгель А.
Архив виленского генерал-губернаторства.
Вильна, 1870. Т. 2. Ч. 1. С. 354—360.

№ 19. 10 ліпеня. Прадпісанне Т. Касцюшкі гродзенскаму генералу А. Казаноўскаму аб выбары рэкрутаў з 10 дымоў

Акт ліста Касцюшкі Казаноўскаму ад дня 26 месяца ліпеня 1794 г.

Стаўшы перад зямянскімі актамі Гродзенскага павета абывацель і генерал-маёр Казаноўскі падаў у акты асабіста напісаны ліст такога зместу. Дазваляю табе, генерал, па моцы майго ліста выбіраць з Гродзенскага і суседніх паветаў на абарону Айчыны людзей не толькі з 50 дымоў, як таго права патрабуе, а, калі можна, і з 10-ці дымоў браці. Спадзяюся, што абывацелі добраахвотна і без затрымкі выканаюць універсал і свой першы абавязак для абароны Айчыны і сябе саміх. Дык вось, пачынай кіраваць сваім палком як мага хутчэй і чынней, злучайся з іншымі камандамі паблізу, нападай на непрыяцеля ў краі і за мяжой. Будзь смелым і станеш шчаслівым. 10 ліпеня 1794 года ў абозе пад Крулікамі. Пад тым лістом подпіс — Тадэвуш Касцюшка. Ніжэй маецца прыпіска з таго ж адрасу: Яго мосць пан... Зараз маскалі атакавалі генерала Заёнчака, які некалькі соцен паклаў на плацу. Спадзяюся, што хутка з імі пакончыць.

Гэты ліст генерал-маёру Казаноўскаму ў Гродна па прадстаўленні ўпісаны ў акты зямянскіх кніг Гродзенскага павета. Згодна з арыгіналам гродзенскі земскі рэгент В. Эйсмант.

НГАБ, ф. 1755, с. 79, л. 754.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 20. 6 верасня. Акт апраўдання палкоўніка паспалітага рушання Гродзенскага павета А.В. Рыхліцкага

Палкоўнік, абывацель Войцех Рыхліцкі падаў у зямянскія акты Гродзенскага павета наступны ліст. Акт ліста абываццеляў Рыхліцкаму ад дня 12 месяца верасня 1794 года.

Мы, шляхта і абывацелі Гродзенскага павета, будучы ў паспалітым рушанні пад камандай шаноўнага палкоўніка, абывацеля Рыхліцкага, не панеслі ад камандзіра ніякіх крыўд, а наадварот, мелі ад паважаючага свой гонар начальніка поўнае задавальненне нашым скаргам і крыўдам і таму перад усім нашым Гродзенскім паветам сведчым і ўрачыста завяраем, што не маем да свайго палкоўніка ніякіх крыўд і прэтэнзій. Даны ў абозе пад Візнай года 1794 месяца верасня 6-га дня. Пад тым лістом і за вайсковай пячаткай наступныя подпісы:

Томаш Снарскі, ротмістр гродзенскі
Тадэвуш Скальскі, маёр міліцыі Гродз. павета
Казімір Шумінскі, ротмістр Гродз. павета
Норберт Кліманскі, ротмістр Гродз. павета
Антон Міцута, ротмістр Гродз. павета
Ваўрынец Шаняўскі, ротмістр Гродз. павета
Мацей Бачкоўскі, паручнік
Мацей Кулікоўскі
Мацей Бяляўскі, паручнік
Ежы Пуцяноўскі
Міхаіл Волмер, ротмістр Гродз. павета

НГАБ, ф. 1755, с. 79, л. 841.
Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 21. 21 чэрвеня. Рапарт завілейскай парадкавай камісіі аб сваім складзе

Рабілася на сесіі ў Свіры
года 1794 месяца чэрвеня 21 дня

Цывільна-вайсковая парадкавая камісія Завілейскага павета, паскараючы поспех загаду рэзалюцыі Найвышэйшай нарадовай рады ад 4 чэрвеня, дасылае ў Цэнтральную дэпутацыю ВКЛ спіс асоб цяперашняй камісіі, а менавіта, ягомосць пан Андрэй Бучынскі, Гіляры Хржаноўскі, Антон Юрага, Станіслаў Гізберт, Бенедыкт Пашкевіч, Пётр Халецкі, Ян Букоўскі, Канстанцін Хамінскі, Каетан Завіша, Іяхім Бакшанскі, Ігнат Невяровіч, Францішак Пятроўскі, Тадэвуш Гарадзенскі, Ігнат Свянціцкі, Юзаф Івашкевіч, Канстанцін Смігельскі, Ануфрый Рудзінскі, Караль Пеўцэвіч, Тадэвуш Каркузевіч-Федаровіч. З гэтых асоб згодна з прадпісаннем канстытуцыйнага сейма выбраны наступныя: ягомосць пан Канстанцін Хамінскі, Войцех Чаховіч, крымінальны суддзя, Юзаф Івашкевіч, Андрэй Бучынскі, Ігнат Невяровіч, Пётр Халецкі, Францішак Пятроўскі, Тадэвуш Гарадзенскі, Канстанцін Смігельскі, Ігнат Свентажэцкі, Ануфрый Рудзінскі, Караль Пеўцэвіч, Тадэвуш Каркузевіч-Федаровіч. Асобы ў земскі суд на апошніх сейміках вольна выбраны наступныя: ягомосць пан Францішак Янкоўскі, Юзаф Сарока, Антон Гутаровіч, Тадэвуш Ходзька, Францішак Хомскі, Мікалай Свентажэцкі, Даніэль Бучынскі, Юзаф Мікоша, Фларыян Ходзька, Ян Хмялеўскі. У крымінальныя суддзі Літоўскай намесніцкай радай намінаваны наступныя ягомосць панове; Мікалай Свянціцкі, Юзаф Мікоша, Войцех Чаховіч, Антон Даўгяла, Вінцэнт Шымковіч, Дамі нік Пятроўскі, Юзаф Невяровіч, Нарцыс Гансеўскі. Па зносінах з духавенствам аб прадстаўленні кандыдатаў, згоду на камісарства выказалі ягомосці ксяндзы Антон Шульц, дэкан свірскі, Мартын Пазняк, намеснік дэкана, Ігнат Высоцкі, плябан Кабыльнік, Барталамей Петрашкевіч,

плябан Лынтуп, ксёндз Вадалоўскі, плябан з Жадзева, ксёндз Трацэўскі, плябан Докшыц, ксёндз Стасіневіч, плябан з Жодзішак. Даны на сесіі як вышэй.

Андрэй Бучынскі, завілейскі цывільна-вайсковы і парадкавы камісар, старшыня

Станіслаў Студніцкі Гізберт, завіл. цыв.-вайск. камісар

Бенедыкт Пашкевіч, завіл. цыв.-вайск. камісар

Згодна з пратаколам *Ян Лазоўскі*, рэгент завілейс. парад. камісіі

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 12, л. 17—17 адв.
За пячаткай. Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 22. 18 ліпеня. Адказ ЦД ВКЛ на пытанні завілейскай камісіі

Рабілася ў Вільна на сесіі 18 ліпеня 1794 года

Цэнтральная дэпутацыя ВКЛ, выслухаўшы данясенне абываценя Пятра Халецкага, дэлегаванага ў сучасную дэпутацыю з кола парадкавай камісіі Завілейскага павета, дае адказ на пытанні таго ўпаўнаважанага дэлегата камісіі. 1. Паколькі Найвышэйшая рада першым пунктам дэкларацыі ад 4 чэрвеня бягучага года пастанаўляе, што ваяводствы, землі і паветы, зараз гвалтам адарваныя ад цела Рэчы Паспалітай, пасля вяртання зброяй нашых братоў будуць упраўляцца сваімі магістратурамі, астатнія ж часткі часова падпарадкоўваюцца парадкавым камісіям, з якімі бліжэй мяжуюць, то з гэтай рэзалюцыі Найвышэйшай рады дэпутацыя заключае, што яна не можа назначыць новую камісію Завілейскага павета, а той павет павінен падначальвацца ўраду і камісіі Ашмянскага павета. Паколькі парадкавая камісія Ашмянскага павета з-за сваіх пераходаў і прысутнасці Масквы ў Ашмянскім павеце не можа выконваць сваіх абавязкаў, то зараз існуючая завілейская камісія можа не толькі правіць у

Свенцянах, але можа перанесці сваё праўленне ў любое знойдзенае ёю бяспечным месца, паведаміўшы ў цяперашнюю дэпутацыю і абывацелям Завілейскага павета, куды яна перанесла сваё праўленне. І такім шляхам камісія Завілейскага павета датуль будзе існаваць, пакуль змена абставін не дазволіць парадкавай камісіі Ашмянскага павета пачаць сваю юрысдыкцыю. 2. Што да прэзідэнтства, то дэпутацыя загадвае парадкавай камісіі кіравацца правіламі арганізацыі парадкавых камісій. 3. Што да ардананса генерала камандуючага абывацеля Вяльгорскага генерал-маёру Завілейскага павета аб. Зяньковічу адносна пастаўкі 100 коннікаў пад харугву аб. Гарадзенскага, то дэпутацыя, прызнаючы за важную рэч, што ўсе арданансы вышэйшай каманды павінны выконвацца падначаленымі хутка і неадкладна, дэкляруе, што парадкавая камісія Завілейскага павета не можа працівіцца гэтаму арданансу, а дэпутацыя з клопату аб ахове кожнага абывацеля краёвай абаронай не заміне неадкладна паведаміць генералу, ягомосці Вяльгорскаму, па гэтаму прадмету.

Выдана з пратаколу, *Ігнацій Лянкевіч*, рэгент ЦД ВКЛ

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 12, л. 18.

Пераклад з польскага рэд-ра.

№ 23. 20 ліпеня. Рапарт завілейскага генерал-маёра К. Зяньковіча М. Вяльгорскаму

Рапарт шаноўнаму аб. Вяльгорскаму, генерал-лейтэнанту, камандуючаму літоўскай збройнай сілай

16-га дня пад час дыслакацыі ў г. Свенцянах даведаўся з рапарта аб набліжэнні да таго месца значнай непрыяцельскай сілы. Палічыўшы немагчымым абараняцца, уранку выйшаў на Пашэмуны, пакінуўшы, аднак, 40 паставых. На наступны дзень выслаў пад каманду намесніка аб. Рыдзеўскага патруль з 7-мі коней,

сам напаў на конных маскоўскіх гусараў, якія займаліся рабункам у Гадзюшках, паўмілі ад абоза. Пры тым забіў на месцы трох, аднаго смяротна параніў, астатнія паўцякалі, а я здабыў трох коней з усім экіпажам і зброяй без усялякіх са свайго боку страт. Дня 18-га паручнік, аб. Загорскі, пасланы з 16 коньмі ў засаду да Мелігянаў, аднаго на плацу паклаў, другога спаймаў у няволю, якога адразу ж адаслаў да вышэйшай каманды, а таксама здабыў двух коней з аснасткай. Каля 11 гадзін раніцы 19-га дня даведаўся, што непрыяцель, пакінуўшы пост у Свенцянах, нечакана рушыў на Пашэмяны, а даведаўшыся ад прыбыўшага з атакі абываценя Вышынскага, што на нас накіроўваецца толькі 30 коннікаў, для сустрэчы іх зрабіў розныя прыгатаванні: пакінуў у засадзе ў мястэчку Пашэмунах 180 стралкоў і 60 язды пад камандай палкоўніка абываценя Нікадзіма Цэзаковіча, а сам адправіўся рабіць парадак у абозе, дзе загадаў пану Камайскаму з 6 каньмі хутчэй паспяшаць да мястэчка, каб прасачыць за 400 коннымі гусарамі, высунутымі на флангу з двух бакоў, як трэба думаць, дзеля зрыву камунікацыі паміж абозам і мястэчкам. Убачыўшы гэта, я двойчы разаслаў свае ардананасы з загадам астатняй кавалерыі рушыць у падтрымку і разам з неадпраўленымі гарматамі адысці на Калтыняны.

Атрымалася так, што пры абозе засталося 30 коней язды з паспалітым рушаннем і заступцамі, якія кінуліся ў бліжэйшы лес, а сам я пры 6 канях, аточаны з трох бакоў і з-за пагрозы з занятага тылу, не змог управіцца, а таму спешыўся паўторна для адпраўкі трох гармат і багажу, што і было здзейснена. Тым часам некалькі гусар атачылі нас каля балота і праз паўмілі захапілі гарматы па прычыне сапсаванасці калёс і ўцёкаў прыстаўленых і няздольных людзей, акрамя скрыні з амуніцыяй багажоў і гармат, якія ўдалося вывезці. У такім стане я здолеў рэціравацца з мілю да Калтынян з вышэйзгаданай купкай язды. Пачуўшы ад хуткага эха, што частка палкоўніка

Чаховіча бачыла пад Калтынянамі значную колькасць непрыяцеля, я працягваю сваю рэцираду на Таўрогі з мэтай злучэння з рэшткамі сіл генерал-маёра Браслаўскага павета. Аднак мае намаганні аказаліся марнымі з прычыны яго нерастаропнасці і таксама з-за таго, што ў той жа дзень пад Казачызнай ён быў разарваны на дзве калоны. Таму я мусіў рушыць у Кукішкі і абараняцца ўжо ў акружэнні двух калон.

Стаўшы там сёння а 3-й гадзіне раніцы, я ўсё-такі дачакаўся палкоўніка, абываценя Чаховіча, зрабіўшага спраўную рэцираду ад усёй непрыяцельскай арміі. Гэты байцовы муж, выслаўшы з мястэчка язду пад камандай ротмістра абываценя Гарадзенскага, сам пасунуўся камандаваць стралкамі ў засадзе, аднак той збор дружыны, здольны ўчыніць значную дыверсію, пры першым непрыяцельскім стрэле страціў трох уцёкшых чалавек. А таму палкоўнік Чаховіч, убачыўшы свае надзеі дарэмнымі, акрамя атакі яго з усіх бакоў, праз рвы і плыты пайшоў напралом, учыніў непрыяцелю шмат шкоды ў людзях і толькі што злучыўся са мной. Нашыя страты невядомыя, бо пасля выхаду з пляца і разбегу пра многіх немагчыма даведацца. Некаторыя стралкі вярнуліся ў мой абоз і яшчэ б больш магло сабрацца, аднак стрымалі іх амаль усе тракты. Пры тым разам прадэманстравалі мужнасць ротмістры Гарадзенскі, Смігельскі, Закрэўскі, Вышынскі, паручнік Контаўт.

Маючы кволую сілу, не бачу ніякага спосабу вярнуцца ў свой павет, а каб не кінуць і яго, здольнага дапамагчы падаткамі і людзьмі сваёй велічынёй, прашу, шаноўны генерал-абывацель, тваёй дапамогі лінейнаму войску, бо непрыяцель пастаянным рысканнем і пажогамі нішчыць абываценяў, не дазваляючы тым выканаць ускладзеныя на іх павіннасці. Тыя дзве калоны войскаў складаюцца не з самых казакоў, а з пяхоты з гарматамі і гусар. Былі яны пераходам і ў Пашэмуні, аднак толькі конніца мелася для ўзаемнага дзеяння і для таго шмат мець магла.

Колькі гармат невядома, бо яны былі засланугы трыма доўгімі лініямі. Колькі ж яго ўсяго немагчыма даведацца, бо не маю рапарта аб будучай калоне ў Браслаўскім павеце, а ідучая за маім левым і правым флангам конніца мае некалькі дзесяткаў язды. Кажуць, што гэта каманда Рэпніна, якую чакалі з Глыбокага ў Паставах і якая быццам бы 13 гармат. Нельга прадбачыць дакуль буду маршаваць. Адно ясна толькі, што адна калона ў мілі ад Таўрогаў, а другую гэтым днём чакалі ў Лыгмянах. Абедзве за 3 мілі ад мяне. Аб тым усім пасылаючы дакладны рапарт, чакаю здольных пасілкаў.

Даны ў Кукуцішках 1794 г., 20 ліпеня, *Казімір Зяньковіч*, генерал-маёр Завілейскага павета.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 16-17.
Пераклад з польск. рэд-ра.

№ 24. 20 ліпеня. Рапарт М. Вяльгорскаму генерал-маёра Браслаўскага павета В. Беліковіча

Рапарт шаноўнаму абывацелю Вяльгорскаму, генерал-лейтэнанту, камандуючаму літоўскай збройнай сілай.

Калі непрыяцельскае войска, быўшае дагэтуль у Відзах пры 2 тыс. чал. язды і пяхоты, маючы досыць гармат, ужо рушыла з тых Відзаў Браслаўскага павета трыма калонамі, а пасля падзелу адна частка пацягнулася на Гардзюшкі, другая — на Палессе і Малячуны ў Завілейскім павеце, трэцяя хутка памаршавала з Грэльцаў на Казачызну, я зрабіў на тым тракце засаду з 110 стралкоў і 350 пікінераў. Хутка падышоў непрыяцель. Усе рассыпаліся нават не чакаючы дапамогі, якую я вёў (аб усім не маю нават рапарта). Дык вось, па страце Казачызны месца ўжо вольнае. Гуцішкі і Віці спалены. Пасля начлегу (непрыяцелі) падаліся да Гуцішак, абывацеля Бурага, якія разрабавалі, як і іншыя двары і вёскі. Потым пасунуліся на Солы, дзе і зараз знаходзяцца,

як мне паведамляюць, а гэтым днём збіраюцца выйсці з Салок і напасці проста на Таўрогі, праўда невядома якім трактам сілай з 500 галоў язды і пяхоты, з 2 гарматамі і разам з прыбываючымі бурлакамі і фурманамі агулам у складзе да 700 галоў.

Пасылаю шаноўны генерал разам з рапартам схопленага валанцёрамі з той каманды на рабунку салдата. Я не маю пры сабе болей людзей акрамя 5-дымовага ахвотніка, аднак не перастану чыніць абсервацыі і разасланыя каманды з абавязкам паліць і рабаваць стрымаю ад іх намераў. Мне даносяць аб выданні маскалямі плаката, які абвяшчае кардон да рэчкі Пацісны, што ў Відзах вызначана размясціць 1 тыс. людзей і што некаторыя абывацелі пад вымушаным прымусам выканалі прысягу, аднак гэтае данясенне патрабуе ўдакладнення.

Даны 1794 года 20 ліпеня ў Больцах. *Вінцэнт Белікович*, генерал-маёр Браслаўскага павета.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 18—19.

Пераклад з польск. рэд-ра.

№ 25. 21 ліпеня. Рапарт ротмістра А. Пляхневіча М. Вяльгорскаму

Рапарт з-пад Пашэмун яснавяльможнаму генерал-лейтэнанту Вяльгорскаму, камандуючаму цэлай збройнай сілай ВКЛ

Яснавяльможны генерал і дабрадзей!

Я вымушаны рапартаваць яснавяльможнаму пану аб падзеях у Свянцянах і пад Пашэмунамі. Згодна з даручэннем, я прыбыў тым жа днём са Свіры да Мяжан, што за адну мілю ад Пашэмун. Заспеўшы ў той вёсцы 30 карабінераў і 3-х казакоў, распужаў іх, забраў у іх 2-х коней, павозку, медзяны кацёл, паўміску, вялікі воз сухароў і каля 100 фунтаў вядліны, шапку і гадзіннік. Прыбыўшы

ў Пашэмуны, знайшоў 10 трупаў і 5 параненых. Я не здолеў вызнавацца аб тым у рапарце да яснавяльможнага пана, бо, маючы адважных 40 людзей, сабраных з розных парафій, хацеў было стаць на маршавым пляцы і такім спосабам павітацца з крыўдамі, учыненымі маёй фаміліі незабыўным масквіцянінам. Не ведаю куды адаслаць арданaнс пана генерал-маёру Зяньковічу, бо крэса ўжо няма. Адсылаю аж у Малаты, а адтуль яго адвязуць генерал-маёру Беліковічу.

Авасі Пляхневіч, верны падначалены ягомосць пана, ротмістр Завілейскага павета. Даны пад Пашэмунамі 1794 года 21 ліпеня.

Маскалёў, як гавораць, забіта ў нас 12, што могуць засведчыць быўшыя там ксяндзы.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 20—20 адв.
*Пераклад з польскай мовы рэдактара.**

№ 26. 23 ліпеня. Рапарт генерал-маёра В. Беліковіча М. Вяльгорскаму

Рапарт шаноўнаму абываце́лю Вяльгорскаму, генерал-лейтэнанту, камандуючаму літоўскай збройнай сілай

20-га дня бягучага года, разрабаваўшы і спаліўшы Казачызну з іншымі дварамі і вёскамі, непрыяцель скіраваў свой марш на Салокі. Маючы ў абозе пяхоты і кавалерыі (акрамя бурлакоў) каля 500 галоў з 2 гарматамі, без іншых у абозе патрэбных людзей, ён размясціўся на пагорку за месцам каля кляштара, робячы ўсялякія перасцярогі ад таўрогінскага і язерскага трактаў і акапаўшыміся з усіх бакоў воямі. Адразу ж былі разасланы малыя каманды рабаваць маёнткі абывацеляў. Атрымаўшы звесткі аб іх сіле, я натхняў акружаючы мяне люд колькі можна напіраць на непрыяцеля.

**Дакументы, што ідуць ніжэй, таксама перакладзены з польскай мовы.*

Атрымаўшы сапраўдных валанцёраў, я зараз жа рознымі трактамі падаўся праз Бор на Салокі, пакінуўшы абоз пад Таўрогамі. Падышоў пад самыя Салокі і паслаў наперад некалькі людзей у камандзе абывацеля, паручніка Юзафа Лавейкі, якая знішчыла атакай пікет на таўрогінскім тракце. З другога боку, на левае крыло пад кляштар каля лесу, я паслаў праз спамянуты бор палкоўніка абываце ля Казіміра Беліковіча з двума цугамі пры 25-ці вершніках, а на правае крыло з такой жа купкай людзей — маёра абываце ля Юзафа Герцыка.

Вышэйспамянутыя абывацелі мужна і кемліва напалі на згаданы абоз, паклалі трупамі каля 50 людзей, таксама шмат коней і людзей пакалечылі, так што непрыяцель паспеў толькі схапіцца за зброю. Калі ж у гэты час на пляцу сабраўся перавышаючы нас колькасцю непрыяцель, то я вымушаны быў прыстойна рэціравацца, зрабіўшы для лепшага засаду са стралкоў. У той сутычцы я не страціў ніводнага чалавека, нават не маю падстрэленых нікога з людзей і коней. Маскалі ж пры адыходзе спалілі мястэчка Салокі, забілі ксяндза і хутка пайшлі на Плавы, разабраўшы мост з Язер, дзе яны дагэтуль стаялі абозам. Малалікасць мая не дазволіла гнаць іх далей, бо пазіцыя таго месца патрабуе дапамогі. Пры гэтым рапарце пасылаю шаноўнаму генералу схематычную табліцу аб падначаленай мне вайсковай сіле. Браслаўская парафія з-за частага праходу непрыяцельскага войска не выдала ротмістру той парафіі 5-дымовага ахвотніка. А размешчана яна пад самым кардонам новай Расіі. З гэтага рапарта, шаноўны генерал, май ласку даведацца, што пры маім абозе зараз знаходзіцца з павета ўвогуле 327 пяхоты і кавалерыі. Такім войскам я змагу абараніць ад непрыяцельскага нашэсця толькі частку астатняга павета.

Дадзены 1794 года 23 ліпеня ў абозе пад Таўрогамі.
Вінцэнт Беліковіч, генерал-маёр Браслаўскага павета.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 21—22

№ 27. 25 ліпеня. Загад М. Вяльгорскага М. Агінскаму на паход пад Дынабург

Міхаіл Вяльгорскі, генерал-лейтэнант, камандуючы цэлай літоўскай сілай пад начальствам Тадэвуша Касцюшкі

Гэтым арданансам даручаю абывацелю Міхаілу Агінскаму неадкладна пайсці з абозу пад Вільна ў Завілейскі і Браслаўскі паветы, узяць пад каманду паспалітае рушанне і лінейнае войска ў кожным павеце з належным распараджэннем імі для адпору непрыцеля і старацца ўзмацніць збройную сілу тых паветаў, паскараючы поспех розных загадаў адносна паспалітага рушання. Гэты ардананс выдаецца і для генерал-маёраў вышэйзгаданых паветаў для іх інфармацыі і адсылаецца ў копіях да іх з абавязкам зносіцца з абывацелем Міхаілам Агінскім і паміж сабой за подпісам Вяльгорскага.

Даны ў абозе пад Вільна 1794 года 25 ліпеня. *Міхаіл Вяльгорскі.*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 12, л. 5. Друк.

№ 28. 28 ліпеня. Паведамленне Беляшэвіча М. Агінскаму аб розным

28 ліпеня 1794 года з Вільна.

Шаноўны абывацель і шэф. Пасля ад'езду ягомосць пана дабрадзея пакуль няма нічога такога ў цэлым, што можна было б паведаміць. Непрыяцельскае войска спакойна стаіць у тым месцы, якое ягомосць пан дабрадзей пакінуў. Кажуць, што яно чакае ў падтрымку Цыцыянава. Гэтымі днямі былі два кур'еры ад Хлявінскага, генерала, і Ваўжэцкага. Першы прывёз рапарт аб тым, што генерал Серакоўскі злучыўся з калонай Хлявінскага ў Свіслачы і што яны складаюць план атакі Дэрфельдэна, які перад імі за Нёманам і патрулі якога

сутыкаюцца з патрулямі Хлявінскага. Хлявінскі таксама даносіць, што выслаў з Вільна 4-ы полк і полк Азулевіча, якi зараз ужо пад Гроднам у камандзе генерал-маёра Франкоўскага. Генерал Вяльгорскі выдаў загад цывільна-вайсковай камісіі Мерацкага павета даставіць як мага хутчэй у Вільна 500 фурманак для пяхоты. Другі ж кур'ер ад Ваўжэцкага прывёз рапарт, што гэтымі днямі ён збіраецца атакаваць непрыяцеля, пад Ліпавай стаячага ў вялікай грамадзе, і што была невялікая сутычка нашых егераў з казакамі і непрыяцельскай пяхотай, аднак з нашым авантажам і без аніякай страты. Той жа кур'ер прынёс экспедыцыю ад курляндскага генерал-маёра Мірбаха разам з універсаламі, выдадзенымі ім да курляндскіх абывацеляў. Прысланы абывацелем Тызенгаузам кур'ер прасіў мяне засведчыць, што меў шчырую ахвоту як мага хутчэй вярнуцца з рэзалюцыяй да ягомосць пана дабрадзея. Падцвярджаю, што з-за хваробы генерала абывацеля Вяльгорскага ён быў затрыманы да двух гадзін апоўдня.

Шчыры слуга Беляшэвіч. Даруй пане, калі пры пісанні ў чым памылюся, бо будучы за вялікай працай, якая тут штодзень у канцылярыі, ледзь мог знайсці момант часу для напісання гэтага білета.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 47—47 адв.

№ 29. 30 ліпеня. Ліст генерал-маёра В. Беліковіча М. Агінскаму

Шаноўны абывацель! Прыбыўшы сёння ў абоз, даведаўся аб непрыяцелі і таму маю гонар адразу ж паведаміць шаноўнаму шэфу, што ў вёсцы Красная - паўмілі ад Браслава - тыя самыя маскалі, з якімі мы сутыкаліся пры рэцірадзе, якія пасля перавозу нарабаваных рэчаў абывацеляў за Дзвіну ў Краславу, дачакаўшыся дапамогі агулам з 800 галоў, вярнуліся ў згаданую вёску і адтуль рушылі на Відзы, куды не

прыбылі, а куды збіраюцца павярнуць свой марш, я не маю ніякіх звестак. Кажуць, што быццам бы па праўдзе маскалі загадалі жыхарам у Опсе і Дрысвятах не збіраць жыта з палеткаў, тым часам абвясціўшы сагнаным людзям пажаць яго і вымалот аддаць на іх авантаж, што і па іншых месцах робяць. Чакаю ад шаноўнага шэфа загаду як і куды трэба павярнуцца з маёй камандай.

Даны 1794 года 30 ліпеня з абозу пад Таўрогамі. *Вінцэнт Белікові*ч, генерал-маёр Браслаўскага павета.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 57

№ 30. 1 жніўня. Ліст М. Агінскага ў Цэнтральную дэпутацыю

Генерал-маёр Завілейскага павета, абывацель Зяньковіч пасылае ротмістра Гайжэўскага з 30 коннікамі з паспалітага рушання пад Рымшаны над Віліяй, дзе, па даходзячым да мяне рапартах, павінны быць маскоўскія багажы пад вартай некалькі дзесяткаў казакоў. Калі тых багажоў не акажацца або калі тая экспедыцыя не атрымаецца, тады ротмістру Гайжэўскаму загадана спаліць новапастаўлены мост у Рымшанах і, патрулюючы берагам Віліі, паліць або затапляць паромы, акрамя непрыдатных, рэгулярна рапартуючы розныя весткі пра непрыяцельскія абароты. Па-другое, калі атрымаю паведамленні, што маскалі стаяць у Відзах і адтуль не кранаюцца, то я вышлю некалькі людзей генерал-маёра на Даўгілішкі і столькі ж на Камаі з наказам выпячы хлеб на 500 людзей у абодвух тых месцах. Па-трэцяе, як толькі даведаюся ад пасланых у Відзы і *(неразборліва — Я.А.)* патрулёў ротмістра Гайжэўскага аб усім, то загадаю часта паведамляць, дзе знаходзіцца генерал-маёр. Нарэшце, я асабіста пераканаўся у руплівасці і чуласці выканання генерал-маёрам сваіх абавязкаў і таму не сумняваюся ў яго стараннасці памятаць сваю каманду.

Аднак паколькі генерал Вяльгорскі загадаў яму ў сваім арданансе намагацца прывесці да выніку распараджэнне адносна паспалітага рушання ў Завілейскім павеце, то павінен з гэтага напомніць генерал-маёру аб усім, што трэба ўчыніць што толькі можна будзе для ўзмацнення збройнай сілы таго павета.

Даны ў Свянцянах 1 жніўня 1794 г. *Міхаіл Агінскі.*

Генерал-маёр абавязаны чуйна наглядаць за полацкім трактам, каб хапаць маскоўскіх кур'ераў для перапынення ўсякіх зносін паміж тымі, хто ўжо пад Вільна, і той тысячай, якая ідзе да мяжы.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 12, л. 2—2 адв.

№ 31. 3 жніўня. Рапарт ротмістра Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму

Адсылаю жыда, шпіка Юду Бярковіча, жывучага ў Засвіры за абывацелем Хжаноўскім, якога схапіў Казімір Сліжэўскі. Добра вядома, што ён - маскоўскі шпік, а што яшчэ больш - тры дні хаваў маскоўскага шпіка і наняў у фурманы Фёдара, падданага ксяндзоў кармелітаў за свірскіх. Гэты чалавек будзе сведкам таго, што наймаўся. Той жа Сліжэўскі ёсць жаўнер маёй каманды, які ў вёсцы Багатыры забіў маскаля, забраў каня, зброю і стаў у маёй камандзе як мой парафіянін. Той жыд меў ахову, якую жыды свірскага кагала ўжылі пад транспарт для аддачы пану. Пасылаю таксама жыда Альшэўскага, які няведама як быў падбіты ў шпіёнства разам з лістом, пасланым у Міхалішкі. Паведамляю яшчэ, што абывацель Хамінскі, вялікі палітык з Хойна, дагэтуль не паставіў ні заступцы, ні 5-дымовых, аб чым даносіць падначалены шаноўнага абывацеля генерал-маёр Завілейскага павета Зяньковіч.

1794 года 3 жніўня са Свіры. *Юзаф Гайжэўскі*, ротмістр Завілейскага павета з-пад Свіры.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 23

№ 32. 3 жніўня. Вытрымка з прыказа Р. Гедройца адносна субардынацыі афіцэраў

Усе афіцэры, якія з-за значнай колькасці палонных не намінаваны пры фарміраванні корпуса пад камандай генерал-маёра Агінскага, абавязваюцца ставаць на пляцоўкі ў якасці афіцэраў, якім будуць даручацца жаўнеры пад іх каманду. Спадзяюся, што ў адпаведнасці з духам афіцэрства і абывацельства яны будуць клапаціцца аб бяспецы ўсяго абоза і войска асабліва на пляцоўках, ад чаго залежыць агульная ваенная бяспека. Валанцёры ж без афіцэрскіх рангаў, якія не адносяцца да корпуса, будуць адбываць ваенную службу на пляцоўках па чарзе пад камандай таго ж генерал-маёра, дзеля чаго ўсе афіцэры без выключэння, так і валанцёры, падпарадкоўваюцца генерал-маёру Агінскаму, які вызначыць парадак іх службы і прадставіць спецыфікацыю іх харчавання.

Падпісана *Рамуальдам Гедройцам*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 12, л. 6

№ 33. 3 жніўня. Ліст Е. Пясчынскага М. Агінскаму аб шкодніцтве яўрэяў

Па абывацельскай дбайнасці маю гонар данесці аб наступным. 1. Трэба вельмі моцна баяцца свянцянскіх жыдоў, бо ходзіць розгалас, што сярод іх шмат шпікоў. 2. Што жыдок з карчмы ў Азыні, якая належыць да Свенцян пана Чаховіча, гэтак жа як і арандары Свенцян Моўша і Гелля, былі заспеты з параконнымі вазамі, на якіх яны везлі розную адзежу, катлы і трубы, атрыманыя ад маскалёў, аб чым даносіць верны сваёй Айчыне абывацель. Звыш таго, як нам стала вядома аб Маскве, то паведамляю пэўныя словы, што Масквы ў Відзах 1,5

тысячы і ўначы чакаецца яшчэ больш, а ў Камаях спадзяюцца на раніцу.

Емельʼян Пясчынскі

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 37

№ 34. (4 жніўня). Ліст завілейскага генерал-маёра К. Зяньковіча М. Агінскаму

Шаноўны абывацель. Я так высока шаную тваё абывацельскія сентыменты і асобу, што шчыра хацеў імгненна стаць у Свянцянах для супольнага злучэння і ўжо збіраўся асабіста выехаць, як тут у Калтыняны пачалі з'язджацца цывільна-вайсковыя камісары Завілейскага павета, дзе яны збіраюцца пачаць сесію. Для паразумення з імі, менавіта тым, каб яны заняліся патрэбамі нашаму войску, асабліва харчаваннем, вымушаны чакаць сесію і выйду ў Свенцяны адразу па яе завяршэнні.

Казімір Зяньковіч, генерал-маёр Завілейскага павета

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 58.

№ 35. 4 жніўня. Ліст генерал-маёра П. Грабоўскага В. Беліковічу

Ліст, маючы характар ардананса. З моцы каманды, прадастаўленай мне генерал-лейтэнантам, абывацелем Вяльгорскім, камендантам цэлай збройнай сілай ВКЛ пад Вільна, загадваю генерал-маёру Браслаўскага павета Беліковічу, каменданту паспалітага рушання таго ж павета, у кожным здарэнні зносіцца з стаячым у Браслаўскім павеце з шэфам корпуса стралкоў Рэчы Паспалітай абывацелем Агінскім і даносіць таму аб усіх абаротах і выпадках, а таксама дапамагаць яму сваёй камандай, паколькі абывацель Агінскі мае ад абывацеля

Вяльгорскага, генерал-лейтэнанта і камандуючага цэлай збройнай сілай ВКЛ, важныя сакрэтныя інструкцыі на тое з патрабаваннем суровага выканання з поспехам усяго яму даручанага.

Даны на гаўпвахце ў Вільна месяца жніўня 4 года 1794.
Павел Грабоўскі, генерал-маёр, камандуючы.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 12, л. 3.

№ 36. 4 жніўня. Данясенне браслаўскай парадкавай камісіі М. Агінскаму аб выкананні даручэнняў

Рабілася на сесіі ў Анікштах 4 жніўня 1794 года

Парадкавая камісія Браслаўскага павета, з чуласцю атрымаўшы зварот камандуючага Завілейскага і Браслаўскага паветаў, шаноўнага абывацеля Міхаіла Агінскага адносна вяртання ў Таўрогі і выканання там абавязкаў, паведамляе, што не можа задаволіць гэтаму намеру без завяршэння экзамена вялікай колькасці арыштаваных бурлакоў, вываз якіх у Таўрогі без завяршэння распачатай справы ўчыніў бы далейшую валакіту з вызначэннем меры пакарання пры хуткім правасуддзі. Што да распараджэння аб паспалітым рушанні, то парадкавая камісія даўно выдадзенымі ўніверсаламі паведаміла абывацелям святлейшага Браслаўскага павета быць поўнасцю гатовымі выканаць яго як мага дакладней і вызначыла ў парафіі дазорцаў з інструкцыямі аб тым, каб кожны дазорца па атрыманні абвяшчэння выканаў усё тое паспяхова ў сваёй парафіі, што толькі яму даручана інструкцыяй і што можа быць прадпісана кватэруючай камандай.

Рабілася як вышэй на ранішняй сесіі ў Анікштах.

Юзаф Славінскі, камісар Браслаўскага павета, старшыня

Юзаф Рудомін, стольнік, камісар Браслаўскага павета

Юзаф Чарноцкі, стражнік і камісар Брасл. павета

Юзаф Чарневіч, будаўнічы і камісар Брасл. пав.

Ксёндз Пётр Тачылоўскі, камісар Брасл. пав.

Дамінік Каменскі, цывільна-вайсковы камісар Брасл. пав.

Юзаф Мазуркевіч, парадкавы камісар Брасл. пав.

Станіслаў Гусціла, камісар Брасл. пав.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 25

№ 37. 5 жніўня. Ліст ротмістра Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму

5 жніўня 1794 года. Паведамляю пра мае чыннасці за 2 дні тыдня. 3 жніўня выйшаў са Свіры і ўначы стаў у Вішневе, дзе даведаўся, што некалькі казакоў хацелі прыбыць для палення Вішнева. Не знайшоўшы іх, я падаўся лясамі ў Спігліцу і Свінкі, а адтуль — на Данюшава. Не сустракаючы іх нідзе, хацеў я падацца да Смаргоні, але мяне перасцераглі, што праз Смаргонь праходзіць 500 пяхоты з Мінска. Пасланы шпік паведаміў мне, што тыя ішлі пад Вільна і сталі ў Лошы, а ў Смаргоні засталося 50 пяхоты і мабыць столькі ж казакоў. Маю пэўную звестку, што яны выпякаюць у Смаргоні хлеб. Таксама ясна, што з Полацка прыбыло 300 фурманак з мукой і крупамі, з якіх 100 пакінулі ў Смаргоні, а 200 адправілі пад Вільна. Не ведаю хто паведаміў у Смаргонь, што я падаўся на Вайстам. Супраць мяне адразу ж з Смаргоні выправілі 50 пяхоты або 40, якіх пасадзілі за перавозам смаргонскім у Кушчы разам з некалькімі дзесяткамі казакоў — пра гэта паведаміў пасланы шпікам свірскі жыд. Апошнім перасцярог мяне амбаршчык са Святлян, едучы з млына, што, магчыма, тыя выйшлі з месца вызначэння. Тады я пайшоў з Данюшава на Жодзішкі, спусціўшы паромы. Мы маршыравалі да Рымшанят, дзе таксама я загадаў спусціць паром і разабраць мост. Вада сарвала і знесла дрэва гэтага няцэлага маста. Уступіўшы ў Нестанішкі, я збіраўся забраць тут шпікоў. Адзін з іх аказаўся ў маскоўскім

абозе, а адзін, па прозвішчу Зуска, быў вокаімгненна схоплены пры нашым уездзе разам з безліччу рэчаў. Не маю часу спісаць іх рэестр — занадта доўгая атрымалася б пісаніна. Вымушаны выйсці да Шамятоўшчыны з усёй маёй камандай. Таксама маю данясенне, што некалькі казакоў рухаюцца адлучыўшыся ад смаргонскай каманды. Зараз жа іду на іх, бо ўжо ў цэлым гатовы, трэба толькі выстарацца грошай. Даносіць аб гэтым падначалены шаноўнага абываццеля, генерал-маёра Завілейскага павета *Юзаф Гайжэўскі*, ротмістр Завілейскага павета.

Даны як вышэй пад Свірам

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 6

№ 38. (5—6 жніўня). Ліст невядомага з-пад Дусят М. Агінскаму

Прыбыўшы ўначы ў Дусяты, зараз жа рапартую аб усім у Вішнева. Аднак ведаючы ад жыда, што шаноўны генерал падаўся з Вішнева ў Анталепы, і што мой рапарт спазніцца, паведамляю паўторна з таго месца аб шчаслівым прыбыцці ў Дусяты. Пасля трэцяга рапарта рушыў з камандай на Антучова і Аляксандрава. На дарозе з Імротаў на Дусяты дакладна даведаўся, што маскалі пайшлі на курляндскую мяжу і што з-за гэтага каля Дусят значная прастора вольная ад непрыяцеля. Аб рассыпаным або згуртаваным пад Езяросамі непрыяцелі яшчэ не чуваць. Дзе Марыконі і падначаленыя знаходзяцца, не ведаю. Ротмістры пасля язерскай рэцірады яшчэ не знайшліся і аб іх не чуваць. Паведамленне аб тваім, шаноўны генерал, хуткім прыбыцці з валанцёрамі вельмі абадзёрыла, быццам бальзам. Чакаю далейшай дыспазіцыі ў Парошыне або прыбыцця. Жадаю ўсяго.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 7

№ 39. 7 жніўня. Ліст маёра Ракіцкага М. Агінскаму з-пад Дусят

З Дусят 7 жніўня 1794 года. Шаноўны генерал добрадзей.

Маскалі тут рабуюць ваколіцы і спалілі мястэчка Свяцк. Зараз паслаў разведаць куды далей пасунуцца. Я сам стаю тут у Дусятах з малай купкай, бо пасля разгону нашых пад Езяросамі здолеў сабраць ледзьве 100 людзей. Такую маю кампанію, ды і тых палова не мае зброі. Ротмістр Вайшвіла таксама са мной, але і пры злучэнні таго ў камплект з маёй кампаніяй не дасць болей як 150 коней. Таму, шаноўны генерал, калі выправіш нам дапамогу, то станем мацней для адпору непрыяцеля. Пасылаю рапарт дазорцы, ягомосць пана Шукшты, аднак не ведаю, ці дакладныя весткі аб колькасці непрыяцеля, бо я сам пры атацы ў Езяросах хваляваўся за сваю асобу. Магу меркаваць, што іх не менш як 600 пяхоты з 6 гарматамі. Гэта я ясна ўласнымі вачыма бачыў. Зараз выслаў на ўсе бакі досыць моцныя патрулі, а сам з невялікай купкай стаю за мастом у Дусятах.

Пры тым данясенні з найвялікшым шанаваннем ягомосць пана добрадзея ніжайшы слуга маёр Ракіцкі

РДВГА, ф. ВПА. с. 2726, ч. 9, л. 69—69 адв.

№40. 7 жніўня. Рапарт ротмістра Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму

Шаноўны абывацель генерал. Будучы паслухмяным указам і арданансам і гатовы выконваць іх колькі можна, як і цяперашні загад шаноўнага абывацеля, які дастаўся мне 6-дня раніцай у Вішнева, дзе я займаюся выбарам ахвотнікаў і 5-ці дымовых, або конных заступнікаў. Люд, усё яшчэ збунтаваны Масквой, не хоча слухацца. Вяртаю яго да паслухмянасці Айчыне і выбіраю 5-ці дымовых, а

таксама перапісваю люд згодна з арданансам да мяне генерал-маёра Завілейскага павета. Сяляне бунтуюць таксама ў Шамятоўшчыне і Чарлёнах і не жадаюць даваць 5-дымовых рэкрутаў. Гэтым днём прыбыў у Чарлёны і як толькі выберу і адашлю рэкрутаў у Свянцяны, сам з камандай падамся да Стахоўцаў каля кардону і да Кабыльнік, а ўжо адтуль - на Свенцяны. Аб непрыяцельскім войску добра ведаю, што ў Смаргоні яго 200 пяхоты і 30 казакоў. Яшчэ больш яго прыйшло ўчора ў Вузлы з абозам. Войска невялікае, вялікі абоз стаіць у полі, усё возіцца коламі ў Паставы. Гэта паведамлена з заручэннем тых людзей, якія тое выразна бачылі. Трэба прынімацца ад Камаяў на пастаўскім тракце, а я бы атакаваў з тылу з чэрню, калі б ведаў, што адтуль панства атакуе малалікае войска. А без гэткай моцы можа б і ўдалося зрабіць хаця бы якую-небудзь спробу. Аб тым даносіць падначалены шаноўнага абываценя, генерал-лейтэнанта Браслаўскага, Завілейскага і Вількамірскага паветаў, Юзаф Гайжэўскі, ротмістр Завілейскага павета, Свірскай парафіі. 1794 года 7 жніўня з Чарлён.

Пасылаю пашпарт маскоўскі і ліст пані Кунцэвічавай. З сабою прывязу каляску і фурманку, якую адаслаў без поўнага сведчання.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 32—32 адв.

№ 41. (8 жніўня). Рапарт Ф. Вышынскага М. Агінскаму

7-га дня атрымаў паведамленне з Палесся, што маскалей у Паставах знаходзіцца 73 кавалерыі і мала пяхоты. Той рапарт паслаў крэсамі пану. Патруль, які быў пасланы ў Лынтупы, прывёз мне ліст эканома лынтупскага, які таксама згодны з першым паведамленнем аб тым, што ўчора днём у Камаях было 13 (а можа і ў Паставах). Гэтыя звесткі паміж сабой згодныя. Адны гавораць, што збіраюцца ў Відзы, другія — што

вяртаюцца ў Глубокае. Другі патруль яшчэ не вярнуўся з-пад Мелягянаў. З важных вестак паведамляю пану, што абывацель Барткевіч даставіў 5-дымовых пяхоты, але двух без зброі і дзідаў. Я паслаў яго па магчымасці выстарацца зброі. Ягомосць пан ротмістр выехаў распарадзіцца са шляхтай і абывацелямі, але не ведаю, ці сабраў каго, ці не. Данясу аб усім, як толькі даведаюся. Францішак Вышынскі.

Паведамляюць, што ім вядома быццам бы ад жыдоў аб нашым стаянні і што збіраюцца нас распужаць. Я стаю ў старым замку на той выпадак, каб назіраць за нізінай з высокай гары.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 15—15 адв.

№ 42. 8 жніўня. Паведамленне завілейскай камісіі М. Агінскаму

Рабілася на сесіі 1794 года 8 жніўня ў Калтынянах

Цывільна-вайсковая камісія Завілейскага павета пад начальствам Тадэвуша Касцюшкі. Усё, што толькі складае наш абавязак і патрабуюць ад нас жаданні шаноўнага абывацеля, аб тым усім цывільна-вайсковая камісія клапаціцца выканаць свой абавязак цягам хуткага часу. Звесткі аб кроках непрыяцеля ў нашым павеце аднастайныя. Пасля акцыі ў Камаях, дзе Масквы 73 (чал.), учора каманда з 300 чал. зноў напала на Камаі і, па яго знішчэнні, не маючы ўжо з рабункаў карысці, у вялікай злосці забрала эканома Дукшэўскага, цалкам добрага патрыёта. З жалем паведамляючы аб усім, для доваду высылаем вымышленыя ім білеты.

Францішак Пятроўскі, цывільна-вайсковы камісар Завілейскага павета, старшыня аддзела скарбовых патрэб

Каэтан Завіша, цывільна-вайсковы камісар з аддзела вайсковых патр.

Пётр Халецкі, цывільна-вайсковы камісар з аддз. інструкцый Зав. пав.

Канстанцін Смігельскі, цывільн.-вайск. камісар і парадкавы з аддз. бяспекі

Андрэй Рудзінскі, цыв.-вайск. камісар Завіл. пав. з аддз. парадку

Згодна з пратаколам *Мацей Багуцкі*, рэгент камісіі

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 31

№ 43. 9 жніўня. Ліст ротмістра А. Пляхневіча М. Агінскаму

Шаноўны генерал добрадзей.

А 12-й гадзіне апоўначы сюды прыбыў з Камаяў чалавек з Верашчатаў Емельян Песячынскі з паведамленнем, што маскалі колькасцю ў 500 (чал.) з 5 гарматамі пайшлі на Верашчаты. У той жа час прыходзіць і другая вестка, што 1,5 тысячы Масквы прыйшло з Відзаў і ранкам спадзяюцца быць у Гадзішках. Падначалены шаноўнага ягомосць пана Авасі Пляхневіч з Камаяў 9 жніўня 1794 года.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 45

№ 44. 10 жніўня. Паведамленне Т. Свянціцкага ротмістру Ю. Гайжэўскаму

Мяркую, што ягомосць пан хутчэй паведаміць абывацелю Агінскаму пра абароты расійскіх войскаў. Я жа сумленна даношу, што ў Вілейскім старостве 3 дні стаяла частка тых, якая пераправілася на рымшанскім даравозе, і якая пайшла на Глыбокае, у колькасці быццам бы да тысячы коней з павозкамі, абозамі і розным быдлам, забраным па розных баках. А каб затым яны не з'явіліся нечакана ў Глыбокім, няхай ягомосць пан добрадзей

паведаміць аб тым вышэйшай уладзе, якая можа выслаць у той бок абарону з Вілейкі.

(Тадэвуш) Свянціцкі. 10 жніўня 1794 года. Трасчуны.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 40

№ 45. 11 жніўня. Рапарт С. Няклюдава Кацярыне II аб абставінах блакады г. Дынабурга М. Агінскім

От 2 числа настоящаго месяца я имел честь всеподданейше донести вашему императорскому величеству, что мятежники, переправясь на здешнюю сторону и впав в границу империи вашего величества, атаковали город Динабург, а теперь от полковника тамошнего, коменданта и кавалера Гулевича, получил я два уведомления.

Первое, что 31-го минувшаго июля, прибыв к Динабургу в состоящую против онаго на берегу слободу, более 500 мятежников из регулярной польской конницы под начальством командующаго ими Огинскаго, и произведя большой крик и угрозами требовали к переправе на здешнюю сторону для их перевоза. Увидя таковое их к недостижению, ушли назад. Зделан тотчас баталионными служителями на берегу реки Двины вид сопротивлению, что, усмотря, мятежники учинили отпор и, находясь в одной от Динабурга версте в мызе Калкун, учредили по всей той стороне р. Двины и окружности динабургской пикеты, изыскивали между тем в немалом количестве людей к переправе мелководии и, найдя в одном месте, начали переправляться на здешнюю сторону, которых до несколько человек уже и переправилось.

Приметив сие, комендант отрядил против их при одном офицере до 50-ти баталионных служителей, кои делали с ними перепалку и тут у мятежников убито три человека. А сим самым и недопущены более к переправе. Комендант же, узнав, что они за непременное положили в

большем числе на здешнюю сторону переправиться, взял знамена, всех баталионных воинских чинов и запер все стороны, в Динабурге земляным валом обнесенные (в) укрытии, которое несколько посредством его старания одним офицером поправлено.

А на другой день мятежники, собравшись в кучу, прошли мимо Динабурга. Через нарочнаго трубача, откамандированнаго теми мятежниками, которых слишком было до 2-х тысяч, вышепомянутым Огинским прислано к коменданту письмо, требующее, чтобы он с горнизоном, амунициею, принадлежащим к тому воинским снарядом и всем городом сдался без всякаго кровопролития. Комендант же, видя таковое противное требование, взаимно требовал сроку на три дни единственно проволакивая время в поджидании приближением по отношениям его на помощь военной команды, дав при том знать, что он по долгу службы и сделанной присяги приступить к сему не может, в противном же случае должен будет всеми мерами стараться мятежников не допустить к желаемому ими успеху. Но они нечаянным образом переправились чрез реку Двину динабургскаго уезда в поместье подкомория Зиберха против фольварка его Кируп, взяв для сего от брата его роднаго, живущаго в Курляндии в мызе Дветах генерала Зиберха, достаточное число людей, сделали на город Динабург 1-го числа сего же августа нападение, при чем сперва учинили, начиная от квартиры коменданта зажигательство, отчего и выгорело две части городскаго деревяннаго строения со всем имуществом жителей и коменданта. Еще сожжены казенной соляной деревянной магазейн с солью, коей состояло по ведомости к 1-му числу августа 929 пудов, и присутствующия места, а потом делали на крепость нападение, против которых комендант с баталионом, состоящим в некомплекте, и еще с истребованными к вспомошествованию от суда староства динабургскаго *(неразборліва — Я.А.)* крестьянами,

которых было до 170 человек, сопротивляясь, выступил с оружейными и пушечными к сему семь чугунных в тамошнем укреплении от древних лет находились.

Мятежники же успешно скрылись между пожегов в городе и в окружности онаго. Тогда комендант, отрядя команду с офицерами и крестьянами, сделал выласку, при чем последовало с ними сражение, где убито их человек до десяти и несколько ранено и отбито четыре их значка, а с нашей стороны убит 1 только крестьянин. После сего мятежники отступили от города, поставя от себя немалое число по лесам и уезде для раздачи своих универсалов о вольности народа, переправились в трех местах в поместье означеннаго Зиберха, проходя коею деревни, немалое число оных и обширности кордоны, начиная по границе от Динабурга до фольварка Кируп, сожгли. Динабургские же город ские жители все от страху выбрались в леса, поелику мятежники, разъезжая иные по местам окружности городской, ожидают, якобы, в помощь до несколько тысяч вооруженными.

Ехавшие из Несвижа курьерами майор и поручик мятежниками захвачены на дороге владения Зиберха при фольварке Колуп и коль по вышеписанным резонам комендант от нижняго земскаго суда потребовал на помощь от помещиков показаннаго Зиберха и Шадурскаго с мызы Езефова крестьян, то они в сем отказались и еще Зиберх при возвращении тех мятежников за границу дал им на дорогу 50 талеров. По неимению же у крестьян, находящихся в динабургском укреплении пропитания, приказано от него, коменданта, выдавать им из магазейна провиант и крупу. А динабургский исправник Лабунской в рапорте ко мне объяснил, что мятежники, возвращаясь из Динабурга, сожгли помещика Зиберха 16 крестьянских дворов со всеми их пожитками, две корчмы и два стоящия на берегу реки Двины казенные кордоны. Сверх сего, осми хозяев разграбили, а когда намерились сжечь деревню Ванкуляны, а тогда чрез

посланнаго от помещика Зиберха были прошены, чтоб от столь крайныго разорения удержались, тогда требовали они 50 червонцов, а напоследок взяв 45 рублей, от таковаго злодеяния отступили и, забрав сильным образом помещичьих семь и крестьянских 5 лошадей, принудили крестьян, кроме побоев, намереваясь вооруженною рукою, а то убить к учинению им помощи в переправе за границу. Но, не дождавшись вскоре оной, перебрались на поданном с этой стороны чрез их пикеты лоткою паки за границу.

Второе. Что подполковник Сакен со своим отрядом 6-го числа сего месяца прибыл к защищению границы от нападений польских мятежников при Динабурге лагирем расположился и тоже майор Бешенцев с отрядом курляндскою стороною к Динабургу приблизился. А поелику прибывших в Динабург большое количество мятежников хотя и возвратилось за границу, но однако часть оных для раздачи своих универсалов о вольности народа на здешней стороне осталось и несомненно комендант полагает, что они уговаривают других к мятежу, которых в динабургском уезде может быть де собраться немалое число, да и за границею мятежники ежедневно делают свои разъезды, ожидают время только к совокуплению с здешними и учинить вообще нападение, завладеть городом и обывателями, а потом пробираться и далее. Я посему предписал, во-первых, подполковнику Сакену с его отрядом оставаться в Динабурге и его округе впредь до повеления и разъехавших в уезде мятежников с универсалами стараться истребить и очистить тамошний край, узнавая между тем не прилепились ли и не прилеплются ли к ним из здешних обывателей, а естли бы кто-либо из них в сем случае виновным оказался, то таковых, яко изменников, брать под караул и отсылать в ближайший город для доставления ко мне.

Во-вторых, динабургскому и всем нижним земским судам, равно комендантам и городничим в Полоцкой губернии состоящим, предложил, дабы они, если

универсалы у кого-либо окажутся в городах и уездах, непременно истребили, внушив каждому обывателю, что они суть те вещи, которые совершенно вредны самим им и всему обществу и что, паче чаяния, у кого-либо оные вовсе окажутся, то не потерпим и тот подвергнет себя всей строгости, законами определенной.

Я же не премину за исполнением сего наикрепчайше наблюдать, а между тем осмеливаюсь всеподданейше вашему императорскому величеству донести. 1-е: что его сиятельство господин генерал-аншеф, кавалер князь Николай Васильевич Репнин от 5-го числа текущаго месяца известил меня немедленно, что от его сиятельства предписано господину генерал-майору Кнорингу к Динабургу отправить нимало немедля и с крайним поспешанием генерал-майора Германа с корпусом его на истребление мятежника, на очищение Динабурга и динабургской границы. 2-е. В здешней губернии все состоит спокойно и благополучно и 3-е, чтоб кто-либо из здешних обывателей прилеплялся к мятежникам, о чем от нарочно мною посыланным и ни от кого из чиновников, кроме показанных коменданта Гулевича, уведомлениев, сведений поныне не имею и впредь осторожности дворянским предводителям, комендантам, городничим и капитанам исправникам подтвердил по обязанности и долгу стараться самим или чрез них обывателям сохранять благоустроенной в губернии порядок, тишину и спокойствие, а в крайнем случае для принятия надлежащих мер благовремянно давали б знать мне. Я же с моей стороны по долгу звания моего не оставлю пещись о предупреждении и о доставлении спокойствия и тишины во вверенной мне от вашего императорскаго величества губернии.

Августа 11 дня 1794 года. Полоцк. Вашего императорскаго величества верноподданный *Сергей Неклюдов.*

ДАРФ, ф. 926, с. 446, л. 15—21. Копія.

№ 46. 11 жніўня. Рапарт завілейскай камісіі М. Агінскаму з Калтынянаў

Шаноўны абывацель. Сэрца наша, запоўненае міласцю да Айчыны, адзіна вымушае паведамляць вам усе звесткі пра непрыяцеля. Прысвяціўшы сваё жыццё на абарону нашага павета, а тым самым і бяспецы месца нашага ўрадавання, ты, шаноўны абывацель, заслугоўваеш у нас аднолькавую і выразную падзяку за тое, што пры важных клопатах і справах давяраеш нам, аднак, увагі пра свае ўклады і аб усіх здарэннях. Толькі што мы даведаліся, што ў Відзах спынілася значная частка Масквы, якая збіраецца ісці ў тыя бакі для перашкод нашым чыннасцям. Гэты іх намер зробіць вельмі вялікую і шкодную змену і перад тым, як гэта можа здарыцца, просім шаноўнага абывацеля прыслаць нам якую-небудзь дапамогу для бяспекі нашай юрысдыкцыі і для адпору непрыяцеля.

Будзем абавязаны шанаваннем за тваe паслугі і яснай падзякай усяго народа, а нам будзе асабліва прыемна насіць у сваім сэрцы гэтую падзяку як свой мілы абавязак.

Даны на сесіі 11 жніўня 1794 года ў Калтынянах.

Каетан Завіша, цывільна-вайсковы камісар Завілейскага павета з аддзела вайсковых патрэб

Ігнацій Невяровіч, цыв.-вайск. камісар Завіл. пав. з аддз. справядлів.

Канстанцін Смігельскі, цыв.-вайс. камісар Зав. пав. з аддз. бяспекі

Юзаф Івашкевіч, цыв.-вайс. камісар Зав. пав.

Ануфрый Рудзінскі, цыв.-вайс. камісар Зав. пав. з аддз. парадку

Згодна з пратаколам Матэвуш Багуцкі, рэгент камісіі

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 13.

За пячаткай.

№ 47. 12 жніўня. Рапарт ротмістра Ю. Гайжэўскага М. Агінскаму

12 жніўня 1794 года. Рапарт шаноўнаму абывацелю Агінскаму, генералу, камандуючаму ў Завілейскім і Вількамірскім паветах

Шаноўны генерал абывацель! Зрабіўшы па магчымасці ўсё згодна з арданансам шаноўнага абывацеля, генерал-маёра Завілейскага павета, я прыбыў у Калтыняны, адкуль па вашаму загаду, шаноўны абывацель, збіраюся ісці ў Відзы. Аднак не маючы ніякай каманды для злучэння на загаданы паход у вызначанае месца, я затрымаўся і выклікаў арданансам усіх ротмістраў з маёй каманды. Раніцой пайду ў Відзы, каб выканаць па ўказу абсервацыю. Адусюль маю яшчэ невыразныя паведамленні, што маскалі пры вылазцы з Відзаў спалілі вёску Мілігяны. Я паслаў даведацца, ці праўда гэта, а пры ясных даведках пастараюся адрапартаваць. Цывільна-вайсковая камісія Завілейскага павета мітусліва соўваецца з месца на месца і не затрымалася ў Калтынянах, не ведаючы дзе і каму здаць забраных арыштантаў. Я папрасіў загадам усіх ротмістраў сабрацца. Не ведаю, шаноўны абывацель, ці даходзяць да вашых рук мае частыя рапарты, бо пасланы з рапартам мой кур'ер затрымаўся ў Дусятах, а рапарт пры ім узяў сабе генерал-маёр Марыконі. Хацеў бы ведаць, ці дайшоў да рук шаноўнага абывацеля ліст абывацеля Свянціцкага, напісаны да мяне.

Пры данясенні адсылаю толькі што атрыманую вестку аб тым, што маскалі стаяць у Відзах, аднак пастараюся сам іх убачыць. Сабраў у сваёй парафіі 120 пяцідымовых рэкрутаў, якіх зграмадзіў у Калтынянах і дзе іх размяркую. Там жа чакаю загаду. Вельмі спадзяюся на абывацеляў, якім неаднаразова загадаў паставіць (рэкрутаў) спачатку ў Свенцяны, а апошнім арданансам у Калтыняны, дзе для поўнага прыёму першых 5-дымовых пакінуў добра ведаючага ваенную справу абывацеля

Юзафа Вішнеўскага, які абавязаны прынімаць іх і весці ў поле. Не зусім чулым абывацелям загадаў па магчымасці даваць 50-дымовых і 5-дымовых заступцаў. Нікога не даставіў толькі аршанскі палкоўнік, абывацель Хамінскі. Не ведаю ў чым прычына той непастаўкі.

Аб чым даносіць падначалены *Юзаф Гайжэўскі*, ротмістр Завілейскага павета. Даны ў абозе пад Калтынянамі.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 10—10 адв.

№ 48. 13 жніўня. Ліст генерала Ю. Марыконі М. Агінскаму з-пад Дусят

Юзаф Марыконі. Даны 13 жніўня 1794 года пад Дусятамі.

Шаноўны абывацель! У той самы момант, як толькі я сабраўся ўжо выйсці з набранымі ў экскарт людзьмі на злучэнне з табой, шаноўным абывацелем, як атрымаў з Вільна такую навіну, што тое месца атакавана непрыяцельскім войскам 11-га дня бягучага і што нашае войска, выбітае з акопаў, выправілася на Мінск. Гэтую вестку трэба або падцвердзіць або абвергнуць. Аднак яна не ілжывая, бо, наадварот, атрымана ад заслугоўваючай даверу асобы. Таму мая выправа на Ілукшту мае слушную прычыну. Разам з тым маю падставу параіць і табе не губляць час, калі ты сам не ў стане распачаць паўстанне і не маеш сродкаў паскорыць тую справу. Тым часам можна скарыстацца для таго, аб чым напісаў учора - аб пасылцы ў Дынабург універсала, адтуль жа пайсці ў бок Браслава, дзе, шаноўны абывацель, убачыш, дзе патрэбна спыніцца. Далучаю прачытаны рапарт дазорцы *(неразборліва — **Я.А.**)*, адрасаваны генералу абывацелю Белbackslash-free Беліковічу для простай камунікацыі.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 10, л. 61

№ 49. 15 жніўня. Рапарт браслаўскай камісіі М. Агінскаму аб захопе Вільна непрыяцелем

Рабілася на сесіі ў Анікштах 15 жніўня 1794 года

Парадкавая камісія Браслаўскага павета, атрымаўшы дакладную вестку аб захопе Вільна непрыяцелем 12 жніўня, не марудзячы даносіць аб тым шаноўнаму абывацелю Міхаілу Агінскаму, генерал-лейтэнанту войск ВКЛ, і што браслаўская камісія, дагэтуль засядаючая ў Анікштах, у сваім жаданні прыблізіцца да свайго павета, з-за гэтага здарэння чакае ад шаноўнага генерала камандуючага інфармацыі, ці выдаліўся непрыяцель з павета, як далека ён ад мястэчка Таўрогі і ці можна наблізіць каманду для аховы. Даны як вышэй.

Юзаф Чарноцкі, стражнік, камісар і старшыня парадкавай камісіі Браслаўскага павета

Юзаф Рудомін, стольнік, парадкавы камісар Браслаўскага павета

Міхаіл ...., гараднічы і парадк. камісар Брасл. павета

Ян Ласкевіч, парадк. камісар Брасл. пав.

Юзаф Беліковіч, будаўнічы і камісар Брасл. пав.

Дамінік Каменскі, цывільна-вайсковы і парадкавы камісар Брас. пав.

Міхаіл Абрамовіч, цыв.-вайс. і парадк. камісар Брасл. пав.

ксёндз Францішак Кузніцкі, цыв.-вайс. і парад. камісар Брасл. пав.

ксёндз Пётр Тачылоўскі, камісар Брасл. пав.

Францішак Савіцкі, парадкавы камісар Брасл. пав.

Юзаф Мазуркевіч, парадк. камісар Брасл. пав.

Станіслаў Гусціла, парадк. камісар Брасл. павета

РДВГА, ф. ВПА, с. 2726, ч. 9, л. 24.
За пячаткай.

№ 50. 15 красавіка 1796 г. З успамінаў генерала Б. Кнорынга аб мерах падаўлення паўстання

... По обнародовании универсалов моих крестьяне, которые уже вооружены были и остались в покое, напали на вооружителей своих и предводителей и не могшие из оных спасатся бегством взяты были ими и к нам доставлены. Войски республики, приступившия уже около на тритцать верст, принуждены были отступить назади Слонима, по тому что подкрепление, обещанное им до тритцати тысяч черни, не токмо к ним по обещанию не явилось, но и самые составившее оное для земли угрожали обращением оружия своего противу них. Минской губернатор находился при сем случае в нерешимости. Желание его защищать губернию нимало не соответствовало оборонительным мерам, ибо по угрожающей опастности имел в виду паче лицо свое, нежели общее. Сия мною произведенная контрреволюция оградила ту часть губернии, которая с сим воеводством *(Навагрудскім — Я.А.)* граничит от крайней предстоявшей ей тогда гибели до прибытия войск из Бреста и Гродни, что щастливым оборотом дела предупреждено было ряд от угрожающей опастности, ибо воеводство оставалось не только в покое и в тишине, но и большая часть войск, кои были в движении, пользовались до новаго урожая из деревень бунтующих дворян пропитанием. По собрании со всех мест войск и сделав оным распорязение, шел я неприятелю в пределах его навстречу, продовольствуя оныя из имения бунтующаго дворянства, действовал оборонительно и наступательно по востребованию обстоятельств, удержал неприятеля от исполнения всех его намерений, поражая его везде, где не покушался. Князь Репнин повелел мне, чтоб взять Вильну нечаянным нападением, но я доносил ему, что время на то еще не приспело, понеже большие неприятельские корпусы действовали в окрестностях наших и движение которых

невозможно было еще воспрепятствовать, ниже прекратить. Ежели бы неприятель умел воспользоватся сим предписанным мне движением в Вильну, чрез которое я слишком удален стал от леваго моего крыла и от границ, то бы мог тем нанести вред границам нашим. Однако ж, как подчиненный генерал, не оставалось мне иное, как выполнять данное повеление. Нашел при Вильне неприятеля, укрепленнаго ретрашаментами, и по счастию поразил его прежде, нежели граф Велагурской подоспеть мог на подкрепление его двенатцатью тысячами...

РДАСА, ф. 193, с. 508, л. 4 адв.—5.

№ 51. 10 чэрвеня 1794 г. Камандзіровачны ліст ад падпалкоўніка М. Ахматовіча паручніку М. Беляку

Падпалкоўнік і камендант 4-га палка пярэдняй варты войск ВКЛ Мустафа Ахматовіч

На моцы загада, выдадзенага 22 сакавіка бягучага года вялікім гетманам Касакоўскім разам з літоўскай ваеннай камісіяй камандуючаму першай дывізіяй, генерал-маёру, ягомосць пану Беляку, а 9 мая загаданага мне тым генерал-маёрам з нагоды нядаўна завершанага гродзенскага сейма, даю гэты арданaнс ягомосць Мустафе Беляку, паручніку 4-га палка пярэдняй варты ВКЛ, зараз жа ехаць у г. Брэст-Літоўскі для пасяджэння ў парадкавай камісіі з правам рашаючага голаса ў рашэнні вайсковай справы. Пры прыбыцці ў Брэст ягомосць пан мусіць паведаміць той парадкавай камісіі, што прыбыў па арданансу для пасяджэння ў той камісіі і яму па праву загадана ўсё тое выконваць.

Даны на кватэры камянец-літоўскай 10 чэрвеня 1794 года. Ахматовіч, падпалкоўнік

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 6.
За пячаткай.

№ 52. 3 ліпеня. Ліст генерала Арлоўскага генералу К. Серакоўскаму

Учора атрымаў рапарт генерал-маёра Франкоўскага, датаваны 30 чэрвеня з Брэста, аб тым, што польскі пастарунак, стаяўшы ў ваколіцы Сухоцкай Волі, быў атакаваны казакамі і пасля сутычкі рэціраваўся ў Ломжу. З гэтага вынікае, што Масква скіравала свой марш на Брэст, толькі невядома яшчэ з якой сілай. Казакоў жа ў атацы, мяркую, магло быць некалькі соцен, паколькі пастарунак столькі ж складала. Толькі што атрымаў ад падляшскіх абывацеляў Будзінскага і Арсеці данясенне з Бельска і Мельніцы. Менавіта з Бельска ад першага таго ж месяца аб тым, што ў той момант прыбылі два абывацелі, уцёкшыя з Брэста з касай, з навіной, што збройная сіла той зямлі мела акцыю з прусакамі цераз Нараў. Таксама маю данясенне, што ў Візне абвешчаны акт паўстання абывацеляў, што там былі невялікія сутычкі нашага войска з прусакамі і што на тракту ў бок Брэста няма лінейнага войска, што Міжрэчанскае графства ў страху сабралася на абарону, тое ж самае наступіла і ў ***(неразборліва — Я.А.)*** графстве, што Франкоўскі са сваёй камандай ужо за Брэстам пад Чарнаўчыцамі, што непрыяцель у той час быў за 2 мілі ад Мельніка і, нарэшце, што ўжо блізка падступіў да Мельніка. Усё гэта паведамляю адразу генералу для інфармацыі аб стане той часткі края, дзе я знаходжуся са сваёй камандай, каб было відаць, якую пазіцыю ўтрымліваю адносна непрыяцеля. Не магу не паўтарыць пра пільны дазор за непрыяцелем, каб ён не пракраўся за Віслу і не перашкодзіў камунікацыі з Брэстам і з генералам Ціхоцкім, які зараз наглядае за ім у трохкутніку. Канешне, Брэсту і генералу Ціхоцкаму трэба часта звязвацца для ўзаемнага ведання пра непрыяцеля і сумеснай перасцярогі. Трэба спадзявацца, што генерал

паведаміў табе пасылкай, аднак для большай яснасці я са свайго боку пасняшаю з гэтым данясеннем.

Даны ў Варшаве 3 ліпеня. *Генерал Арлоўскі (Ян Аўгуст)*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 126—127

№ 53. 5 ліпеня. Зварот брэсцкай парадкавай камісіі да абывацеляў

Парадкавая камісія Брэст-Літоўскага ваяводства загадвае абывацелям на тракце даць паручніку Беляку, камандзіраванаму генерал-маёрам ваяводства Франкоўскім і па квіту таго ж, патрэбны фураж аўсом і сенам, а правіянт мясам і хлебам, гэта значыць на першы раз з разліку на аднаго каня па 4 гарцы аўса і 14 фунтаў сена, а на дзень аднаму жаўнеру 1 фунт мяса і 2 фунты хлеба.

Даны на сесіі 5 ліпеня 1794 года

Ксёндз Гіляры Грыгароўскі, ігумен, камісар, старшыня
Вінцэнт Выганоўскі
ксёндз Ігнацій Бухавецкі, камісар
Яцэк Пашкоўскі, камісар
Павел Ягмін, камісар
Лахоўскі, камісар
Войцех Рэймерс, камісар

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 146

№ 54. 8 ліпеня. Інструкцыя Т. Касцюшкі генералу К. Серакоўскаму

На рапарт генерала Серакоўскага ад 7 ліпеня з-пад Бучына адказваю, што ўзмацняецца патрэба дапаўнення каманд ахвотнікамі, валанцёрамі і кантаністамі, якіх шмат у Брэсце. Няхай генерал Франкоўскі таксама злучыцца з панам і, канешне, трэба ісці за непрыяцелем.

Пашлі, пан, варту да Вяльгорскага з паведамленнем, што ідзеш за непрыяцелем з такой і ўласнай сілай, што непрыяцель атакуецца такой моцай. Калі б спатрэбілася яшчэ ўзмацніць вашу, паны, сілу, тады няхай генерал Ціхоцкі па майму арданансу і з уласнай магчымасці дасць хаця бы адзін батальён пяхоты або кавалерыі. Пры неабходнасці можаш, пан, узяць у Бельскім ваяводстве некалькі стральцоў і кавалерыі. Тое вымагае стараннасці абывацеляў для памнажэння і выкарыстання моцных сродкаў на шкоду непрыяцеля, аднак трэба абавязкова ісці за ім і атакаваць пры зручнасці, нават калі ён пойдзе ў Курляндыю. Паведамі Вяльгорскаму, што сілу заўжды дастаўлю і май з ім пастаянную сувязь.

Абдымаю сардэчна. Дня 8 ліпеня 1794 года ў Рашыне.

Тадэвуш Касцюшка

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 155

№ 55. 11 ліпеня. Ліст М. Вяльгорскага К. Серакоўскаму з Воранава

З Воранава 11 ліпеня 1794 года. Абывацель генерал!

Сюды прыехаў кур'ерам паручнік Скалярскі і паведаміў мне, што ты стаіш у Збочыне для сачэння за корпусам Дэрфельдэна. Згодна з атрыманымі з Брэста рапартамі, генерал Франкоўскі рэціраваўся з Брэста ў Шарашова да абоза Хлявінскага, што генерал Кобрынскага павета Рушчыц - у Беразу, аднак не ведаю куды адтуль павярнуў. Дэрфельдэн заняў Брэст і Кобрын. У выніку трэба, генерал, пасунуцца за ім да Брэста як мага хутчэй, каб не даць непрыяцелю час на вываз тамтэйшых магазінаў. Чакаю як мага частых звестак пра абароты калоны. Будзь шчаслівым. Даны як вышэй.

Міхал Вяльгорскі

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 170

№ 56. 15 ліпеня. Ліст генерала А. Хлявінскага К. Серакоўскаму

Абывацель генерал. З задавальненнем атрымаў гэтым днём тваю, генерал, экспедыцыю. Даўно хацеў звязацца з каронным войскам, дзеля чаго пасылаў цікавіцца ажно да Бельска, аднак яшчэ не меў адказу. Толькі што генерал Вяльгорскі паведаміў аб тым, што твая калона стаіць пад Збучынам. Мая пазіцыя ў 5 мілях ад Слоніма, дзе стаіць князь Цыцыянаў з 4000. Думаў яго атакаваць і чакаю толькі падыходу да Ліды генерала Вяльгорскага для атакі той расійскай дывізіі, якая перад тым месцам. Атрымаў праз твайго кур'ера паведамленне, што маскалі з Брэста хочуць адрэзаць мяне з тылу пад Шарашова, якое я пакінуў ранкам генералу Цыцыянаву і адваротным маршам скіраваўся праз Ізабелін на Свіслач, каб не перапыняць з табой, генерал, камунікацыі. Атакуй іх хаця б наездам, і, непакоячы да Брэста яго прыпынкі і пазіцыі, а потым зможам ударыць з двух бакоў. У маёй калоне 4 батальёны стараслужачага складу, 2 новыя батальёны, 3 батальёны касінераў, батальён стральцоў, гармат толькі 12, некалькі тысяч добрай кавалерыі. Вельмі прашу ўтрымліваць частую камунікацыю паміж Бельскам і Свіслаччу. Я таксама не праміну даносіць аб усім. Зараз жа высылаю кур'ера з данясеннем да генерала Вяльгорскага. Застаюся з міласцю маёй шаноўнай прыязні.

Даны дня 15 жніўня 1794 года пад Жэрна. Генерал-маёр *А. Хлявінскі*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 180

№ 57. 16 ліпеня. Ліст А. Хлявінскага К. Серакоўскаму з Мсцібава

Абывацель генерал. Першы мой ліст, відаць, трапіў да генерала праз пасланага кур'ера, дзе я паведаміў пра свае намеры. Зараз даношу, што стаў у Мсцібаве, а раніцой буду ў Свіслачы, калі толькі непрыяцель не перашкодзіць з-пад Шарашова. Стану трохі ў тым месцы або за Свіслаччу каля ракі Нарвы. Таму хачу ведаць, дзе ты, генерал, будзеш пераходзіць рэчку, каб дапамагчы. Спяшаюся кончыць. Злучанымі сіламі верагодна пасунем непрыяцеля ў ягоныя межы. Чакаю паведамлення.

Даны пад Мсцібава 16 ліпеня 1794 года. *Хлявінскі*, генерал-лейт.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1. л. 183

№ 58. 19 ліпеня. Адрас брэсцкай парадкавай камісіі К. Серакоўскаму

Камісія Брэсцкага ваяводства, не маючы ніякага гарнізона ў месцы Брэст для ўтрымання арыштантаў, звяртаецца да генерала абывацеля Серакоўскага з просьбай прыняць у свой абоз пакінутых маскоўскіх дызерціраў, бо на аднаго абывацель Лазоўскі паскардзіўся ў тым, што ён з прыдадзеным казаком рабаваў двары і вёскі пад Кобрынам, а таму было б небяспечна адпусціць яго. Май ласку генерал абывацель Серакоўскі ўпэўніць у іх прыняцці, а камісія адашле з абозам.

Даны на сесіі ў Брэсце 19 ліпеня 1794 года

Ксёндз Ігнацій Бухавецкі, камісар, старшыня

Згодна з пратаколам *Мартын Пашкоўскі*, пісар камісіі Брэс. ваявод.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 194.
За пячаткай.

№ 59. 21 ліпеня. Ліст палкоўніка М. Пашкоўскага К. Серакоўскаму

Абывацель генерал. Брэсцкая парадкавая камісія ў сляпым трыманні літаральнага сэнсу рэзалюцыі Найвышэйшай рады, каб нічога не пачынаць без прысутнасці і ўклада поўнамоцнага Гараіна, ледзь толькі згадзілася разаслаць загады дазорцам парафій аб пастаўцы коннікаў з 50 дымоў. Тупа ідуць справы ў камісіі і цяжэй пойдуць сярод няроўных абывацеляў, а люд, усім багаты, не смее думаць аб абароннай сіле. Я сяджу тут як на іголках сярод узрастаючага раз пораз розгаласу аб тым, што Загражскі ад Драгічына і пінскага Янава ступае на Кобрын. Дай бог, каб тыя весткі былі вернымі, а я меў час у зборы ўсякай добрай язды выканаць арданакс генерала і пад яго павадырствам падзяліць заўжды ніштаватую для Айчыны працу.

З Брэста 21 ліпеня 1794 года. *Міхаіл Пашкоўскі*, палкоўнік

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1. л. 198

№ 60. 22 ліпеня. Ліст генерал-маёра А. Хлявінскага К. Серакоўскаму

Шаноўны генерал абывацель. Паведамляю генералу аб двух важных абставінах. 1. Масква наблізілася да Вільна трыма калонамі пад камандай генерала Кнорынга, брыгадзіра Бенігсена ў колькасці каля 8000. Генерал-маёр Мейен адбіў іх 2 калоны, а 3-я залезла ў віленскія акопы. Генерал камандуючы Вяльгорскі стаў пад Вільна і Розсцамі і адпіхне маскалёў. 2. Князь Цыцыянаў 19-га рушыў з-пад Слоніма на навагрудскі тракт з 2000 пяхоты, 16 гарматамі, 800 карабінерамі і 500 казакамі. Таму, каб і Цыцыянаў не пайшоў на Вільна і не зайшоў нашым у тыл, я паслаў некалькі дзесяткаў коней у Лідзексну і паслаў бы болей, калі б не прычынілася ўтрымліваць

каманду Дэрфельдэна пад Ражанкай. Зрабі ласку, генерал, прыспешыць свой марш, каб пры нашым зблiжэнні скласці ясны і моцны план аперацыі. Забяры, калега генерал, усю якая ёсць кавалерыю брэсцкую і кобрынскую, таксама здольных да службы стральцоў на ўскрай лясоў. Генерал Рушчыц мае на гэта мой ардананс. Я пакуль стаю ў Свіслачы, мой авангард пад Ізабелінам, Бяляк у Мсцібаве. Чакаю паведамлення аб пазіцыі і маршы генерала.

Даны ў Свіслачы 22 ліпеня 1794 года. Генерал-маёр *Хлявінскі*.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 205—205 адв.

№ 61. 26 ліпеня. Ліст палкоўніка М. Пашкоўскага К. Серакоўскаму з Брэста

Абывацель генерал. Першы дзень жніўня вызначаны абывацелям для дастаўкі конных жаўнераў. Прыкладу ўсе сілы з поспехам выканаць тое. Са смуткам даведаўся, што калі брэсцкая пяхота перайшла пад тваё начальства, то мая харугва, сабраная маім вялікім коштам, засталася ў дывізіі генерала Хлявінскага. Ведаю, генерал, што ты можаш праз зносіны з абывацелем Хлявінскім зрабіць так, каб і тая частка сабраных мною сяброў трапіла ў тваю дывізію, асабліва таму, што сярод іх ёсць людзі, якія прызначаны на афіцэрскія рангі да той сілы, якую я збіраю. А сярод іх годны камандаваць харугвамі падпаручнік Квінт і харунжы Такачэўскі, у намеснікі жа таварышы Пашкевіч, Такачэўскі, Касцюшка, Манюшка і Старжынскі. Зрабі ласку, генерал добрадзей, тым часам сваім стараннем і зносінамі прысланы тых людзей у маю каманду, а астатніх пакінь пры сабе або адашлі да мяне для прыстойнага экіпіравання і далучэння ўсяго майго палка па тваім указам.

Затым з шанаваннем твой падначалены суабывацель, палкоўнік Міхал Пашкоўскі. 26 ліпеня 1794 года з Брэста

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 217

№ 62. 27 ліпеня. Рапарт генерал-маёра К. Рушчыца К. Серакоўскаму

Стаў абозам пад Ражанкай для шчыльнага нагляду за непрыяцельскімі абаротамі і паведамляю весткі, атрыманыя ад абывацеляў і высланых шпікоў. Маскоўская калона, якая маршыравала на Пінск, стаіць у Янаве ў невялікай колькасці і ў пастаянным страху. Частка іх пайшла на Бездзіш. Асобна далучаю з агульным паведамленнем ведамасць, якую маю аб непрыяцельскім войску, даўно будучым і нядаўна злучаным пад Слонімам. Менавіта, генерал Загражскі з боку Ражан і Дзярэчына прайшоў праз Шчару і падаўся праз Нёман на Орлю. Маёнткі Добры Сялец, Ражан, Зельва, Дзярэчын секвестраваны ў скарб імператарскай Расіі, з нагоды чаго далучаю ў копіі мемарыял, які падаў губернатар тых добраў генералу Дэрфельдэну, і адказ таму. З-за сціласці часу яшчэ не маю паведамлення пра артыкулы секвестра, аднак пастараюся прыслаць іх зразумелымі. Ражанскія жыды ў вялікім падазрэнні за зносіны з непрыяцелем. Першага з іх, маскоўскага шпіка, пад імем Фішэля, прымаў у сябе Сялява пад час нашага адступлення з Кобрына. Сціласць часу не дазваляе зараз распазнаць усіх і пакідаю свае чыннасці з імі на вольны час. Да гэтых звестак далучаю яшчэ пэўна, што непрыяцель днямі і начамі імкліва маршыруе на Вільна. Я спадзяюся заўтра прыбыць у Зельву, калі толькі непрыяцель нечакана не зробіць якую-небудзь перашкоду майму пераходу.

Даны ў абозе пад Ражанам 27 ліпеня 1794 года. Генерал-маёр *Казімір Рушчыц*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 220—220 адв.

№ 63. 28 ліпеня. Адрас слонімскага кагала кіраўніцтву літоўскага войска

Рапарт у найвышэйшую каманду нарадовага войска

Пакольні 27 ліпеня гэтага года слонімскі кагал з-за выхаду маскоўскага войска не змог на лісце адрапартаваць найвышэйшай камандзе, а толькі вусна праз пасланца, то пасылае той самы рапарт ягомосць генералу Беляку, стаячаму ў Ваўкавыску, і паўтарае слова ў слова пасылкай у найвышэйшую каманду. Слонімскі кагал рапартуе найвышэйшай камандзе, што 27 ліпеня гэтага года ў ранку маскоўскае войска (якога было каля 10000 і якое кватэравала 2 дні, а з генералаў было трое, менавіта першы генерал-лейтэнант Дэрфельдэн, другі — Загражскі, трэці — Зубаў) пакінула Слонім. Гармат рознага калібру было 45 або 50. Адгэтуль пайшлі на віленскі тракт. Першую ноч у нядзелю начавалі ў Казлоўшчыне, у 3,5 мілях ад Слоніма, а гэтай ноччу будуць начаваць у Здзяцелі. Цяжкі іх абоз са Слоніма пайшоў у Ляхавічы, а адтуль збіраецца на Піншчыну. Адзін іх полк з тае іх арміі рушыў на Дварэц. Армія генерала Цыцыянава, якая першай была ў Слоніме і якая ўжо 2 тыдні як выйшла, па дакладна вядомых нам звестках пераправілася праз Нёман у Мікалаева, а раніцой у чацвер, гэта значыць 24 ліпеня, прыйшла ў Іўе. Бягучым днём, або 28 ліпеня, у Слонім прыбылі жыды з Хомска са збожжам, якія гаварылі нам, што ў Янаве, мястэчку на Піншчыне, знаходзіцца шмат маскоўскага войска. Гэты рапарт не за пячаткай, бо не вярнуўся пасланы з вусным рапартам учора ганец у бліжэйшую каманду і якому была дадзена кагальная пячатка для знакаў.

У тым верным рапарце застаецца з глыбокім шанаваннем найвышэйшай каманды нарадовага войска нізка прыпадаючы слонімскі кагал, 28 ліпеня 1794 года.

Допіс. *Нам вядома, што як толькі наш пасланец сеў на каня, як даведаўся, што тае самае начы ў Дзяцел*

*прыбег ад Цыцыянава чалавек да Дэрфельдэна, каб апошні як мага хутчэй прыбыў да Цыцыянава, а калі (неразборліва — **Я.А.**) хутка не прыйдзе, то адступіць назад.*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2828, ч. 1, л. 223—223 адв.

№ 64. 28 ліпеня. Рапарт К. Рушчыца К. Серакоўскаму з Ражан

Казімір Рушчыц, генерал-маёр збройнай сілы Кобрынскага павета.

Маю ліст генерала рускіх войскаў Вільгельма Дэрфельдэна ад дня 17-га бягучага месяца і года да абывацеля Заржэцкага, камісара маёнткаў абывацеля Францішкі Сапегі. Калі скінуць усе пазументы, то не ўсё ў справах непрыяцельскага войска выпадкова. Калі ў вольным краі даводзіцца слухаць іншыя ўказы (што не прынята), то тое - дзеля яўнай перамогі, або, лепей, каб застрашыць пужлівых абывацеляў і схіліць іх да сваёй хітрай волі. З гэтай мэтай нікчэмны ліст пазбавіў уласніка абывацеля Францішку Сапегу ягоных уладанняў у Брэсцкім ваяводстве і Слонімскім павеце і дзёрзка аддаў іх уладзе ягонага камісара абывацеля Яна Заржэцкага. Гэты ўчынак дзікага непрыяцеля выкананы ў краі, дзе кожны абывацель узброіўся на яго згубу, дзе аб'яднаныя палякі гоняць яго ўсюды перад сабой уцякаючым, заўжды перамагаюць і напаўняюцца ўпэўненасцю ў зварот здрадай і гвалтам забраных сваіх краёў. А раз старанны абывацель не павінен яго прынімаць, то я загадаю абывацелю Яну Заржэцкаму, камісару маёнткаў абывацеля Фр. Сапегі, не слухацца ўказа Вільгельма Дэрфельдэна, генерала расійскіх войскаў, ні ў чым, а трымацца таго ўрада, які даручаны яму раней яго панам і пры тым знішчыць той нікчэмны ліст. Калі ж моц таго ліста патрабуе яго найперш слухацца пад ґрымусам падзелу, то выкананне гэтага з міласці да краю і Айчыны

павінна быць праціўным яму, як асобе дбайнага абывацельства. Адмаўленне пацягне на яго тую кару, якая прызначана на ворагаў нарадовага паўстання.

Даны ў абозе пад Ражанам 28 ліпеня 1794 года. *Казімір Рушчыц*, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 225.
За пячаткай.

№ 65. 29 ліпеня. Прадпісанне ўпаўнаважанага Я. Гараіна брэсцкай камісіі

Копія прадпісання ўпаўнаважанага Гараіна Брэсцкай камісіі

Не трэба пераконваць старанных і светлых мужоў парадкавай камісіі Брэсцкага ваяводства ва ўпартай патрэбе ратавання Айчыны, бо самі лепш ведаеце існуючы стан, дзе кожнае прамаруджванне агульнаму ўзбраенню можа стаць момантам згубы края і знішчэння святога нарадовага паўстання. Таму з абывацельскай стараннасці і клопату спадзяюся, што ўсе мае ўказы, на моцы прадастаўленай мне Найвышэйшым начальнікам, будзеце выконваць як мага хутчэй.

Пры спыненні тут для зладжанага выканання ўказаў Рады і Найвышэйшага начальніка, я даведаўся, што брэсцкая парадкавая камісія дагэтуль яшчэ не выбрала рэкрута з 5-ці дымоў згодна з кракаўскай уставай, таксама не распарадзілася паставіць з 50-ці дымоў ва ўсім абмундзіраванні ўзброенага вершніка, а таму наказваю 50-дымовага чалавека даставіць 3 жніўня, а 5-дымовага кантаніста — на сёмы дзень таго ж месяца.

1. Саступаючы гаспадарчай неабходнасці, у паспалітае рушанне патрабуецца ўжо не палова сялян і шляхты, якая не плоціць падатку 10-га гроша, як гэта дасюль было, а 10-я асоба, экіпіраваная агнёвай зброяй, з плеценымі шапкай і торбай для харчу, прычым на кожнага пешага

трэба сабраць у месячны фураж 60 фунтаў сухароў, 3,5 гарцы круп, 20 фунтаў мяса (калі з тлустам — то 6 фунтаў).

2. Шляхта, якая не плоціць падатку 10-га гроша, таксама аднолькава абавязана даць у паспалітае рушанне 10-ю асобу, але не пешую, а конніка з пісталетамі, палашом, пікай і абмундзіраванага ў плеценыя куртку і шапку, якога пакінутыя ў хаце 9 асоб высылаюць з правіянтам і месячным фуражом для каня, гэта значыць 90 гарцамі аўса і 300 фунтамі сена. Шляхта ж, якой шчуплая маёмасць не дазваляе даць конніка, можа выступіць у вясковым паспалітым рушанні, што я, аднак, даручаю ўвазе парадкавай камісіі, якая дасканала ведае сітуацыю абывацеляў свайго ваяводства. У выпадку жа паведамлення аб прадузятасці, члены парадкавай камісіі будуць адказваць асабіста. (Допіс да пункта 2. У выпадку крайняй неабходнасці паспалітае рушанне аснашчаецца правіянтам і фуражом на 10 дзён усё цалкам, або напалову яго складу).

3. Тым не меней, па ўніверсалу Рады ўсе ўласнікі-вотчыннікі павінны стаць з агнявой зброяй акрамя тых, каго ўніверсал Рады вызваліў ад асабістай яўкі і хто, аднак, таксама абавязаны даставіць 3 жніўня на сваё месца з кожнай вёскі 2 чалавек на конях, цалкам узброеных і з месячным жалаваннем коштам хаця б на 250 злотых. Калі ж крайняя патрэба запатрабуе затрымаць іх у лінейным войску, тады абывацелі вотчыннікі абавязаны даць фураж згодна з вышэйзгаданым раскладам.

4. Ад парадкавай камісіі Брэсцкага ваяводства залежыць выбар з 50 дымоў узброеных кантантаністаў згодна з вышэйзгаданым універсалам у прадугледжаны час, якім фураж і правіянт дадуць фальваркі, захоўваючы пры тым прапорцыю аплаты 10-га гроша. А паколькі абывацелі часта адгаворваюцца недахопам броні, то няхай парадкавая камісія Брэсцкага ваяводства, пры засведчанні сапраўднай няздольнасці абывацеля паставіць за сябе двух чалавек, прымусіць яго аплаціць за бронь

грашыма па наступнай цане: за карабін — 36 злотых, за пісталеты — 36 зл., за зарады — 12 зл., за патранташ — 6 зл. Пасля выбару гэтай належнасці парадкавая камісія звернецца ў галоўны варшаўскі камісарыят аб дастаўцы броні і далейшых рэквізітаў са сведчаннем таму належнай аплаты вышэйзгаданаму. Кантаністаў, якія яшчэ не выбраны і якія вярнуліся дахаты пасля розных сутычак, патрабуецца сабраць 7 жніўня пад часовую каманду каменданта Брэсцкага ваяводства абывацеля Пашкоўскага, які затрымае тых столькі часу, сколькі будзе прызначана па майму загаду або камандуючага лінейным войскам абывацеля Серакоўскага, або колькі спатрэбіцца.

5. А каб войска не ведала недахопу харчу, як гэта ўжо здаралася, і з-за гвалтоўнага набору не апынулася прыкрым абывацельству, парадкавай камісіі Брэсцкага ваяводства належыць стварыць магазін у г. Брэсце, куды кожны абывацель павінен даставіць з дымоў 24 фунты сухароў, 24 фунты сена, 8 гарцаў аўса. Камісія абавязана дэлегаваць са свайго кола ў гэты магазін аднаго камісара, які абавязаны трымаць у парадку рэестры і за білетамі генерала камандуючага выдаваць фураж і правіянт. Паколькі для поўнага забеспячэння войска патрэбна і мяса, то парадкавай камісіі Брэсцкага ваяводства трэба вызначыць на карысць войска 10-ю частку фальваркавага быдла і даставіць харч у пажаданай патрэбе ў распараджэнне камісарыята. Калі ж здарыцца, што афіцэр праходзячай каманды возьме што-небудзь часткова, тады на яго залічыцца квота з цэлага.

6. Камісія мусіць абавязаць карчэмных жыдоў даставіць на час паспалітага рушання па 2 фурманкі - з аднаго вясковага дыма і з 5-ці гарадскіх дымоў - пад фураж і правіянт.

7. Згодна з універсалам Найвышэйшай рады кожнаму кантаністу прызначана даваць па 15 зл. грашовай платы і там, дзе гэта зроблена, сваім рапартам паведаміць ёй аб колькасці платы.

8. Паколькі зараз недарэчна, што войска Рэчы Паспалітай можа раптоўна здабыць хуткую і канчатковую дапамогу для направы сваёй Айчыны, то камісія Брэсцкага ваяводства мусіць абвясціць абывацелям тэрмін для дастаўкі лішкаў звыш неабходнай патрэбы, што будзе аплочана па рэверсах і па наступнай цане: конь звычайнай меры ў лёгкія нарадовыя палкі — па 15 зл., а большай меры — не даражэй 25 зл. Калі абывацелі не захочуць выканаць гэта, тады брэсцкай парадкавай камісіі дазваляецца ўжыць вайсковую дапамогу ваяводства для выбару коней, аднак па выданні згаданых рэверсаў і загаду камендантам пільнаваць усякую дысцыпліну і лагоду ў абыходжанні з абывацелямі.

9. Паколькі з большай і значнай часткі пушчаў Брэсцкага ваяводства дастаўлены яшчэ не ўсе стралкі, то парадкавай камісіі Брэсцкага ваяводства належыць звярнуцца да абывацеля Ягміна і іншых, у каго яны толькі знаходзяцца, з тым, каб яны пад адказнасцю ў крымінальным судзе даставілі 7 жніўня ўсіх жывучых у пушчы гаспадароў, умеючых страляць (акрамя парабкаў, не ўмеючых страляць), а таксама буднікаў з агнёвай зброяй.

Даны ў Брэсце-Літоўскім 29 ліпеня 1794 года. *Гараін*, упаўнаважаны Намесніцкай рады

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 228—229 адв.

№ 66. 29 ліпеня. Адказ генерала А. Хлявінскага палкоўніку М. Пашкоўскаму

Рэзалюцыя палкоўніку брэсцкай міліцыі, абывацелю Пашкоўскаму

У адказ на запыт ягомосць пана ад 21 ліпеня бягучага года адносна кавалерыі, якую раней генерал-маёр прызначыў у калону абывацеля Серакоўскага, загадваю ягомосць пану забраць усю тую кавалерыю і адаслаць у

маю калону перш за ўсё таму, што тая калона ўжо дастаткова забяспечана. Адсылаю рэкамендаваных падпаручніка Квінта, намесніка Пашкевіча і Такаржэўскага разам з таварышамі Байсонам, Манюшкам, Старжынскім і Відашэўскім.

Даны ў абозе 29 ліпеня 1794 года. Генерал-маёр *Хлявінскі*.

Загадваю імкліва спраўляцца, паколькі Масква зараз вывела на нас усе сілы.

РДВГА, ф. 2728, ч. 1, л. 284

№ 67. 31 ліпеня. Ліст камісара П. Ягміна да генерала К. Серакоўскага

Абывацелю і генерал-маёру Серакоўскаму

Брэсцкая парадкавая камісія, атрымаўшы адозву абывацеля і генерала Серакоўскага ад дня 28-га бягучага з абозу пад Лапяніцай, паведамляе таму генералу, што як толькі збярэ з ваяводства язду, чым яна вельмі зараз занятая, так адразу ж адашле яе ў абоз згаданага генерала без прамаруджвання. Збор яе ідзе без поспеху з-за вынішчэння ваяводства непрыяцельскім войскам, асабліва паколькі тое ваяводства не прыкрыта ад непрыяцельскага абозу, пад Янавам стаячага. Абавязаная пільнаваць дэзерціраў з варшаўскага батальёна, камісія загадала здаць іх у абоз генерала. Для зносін з палявым камісарыятам аб патрэбах войска і распараджэння гэтым, камісія паслала ў абоз са свайго кола абывацеля і камісара Яна Неміровіча, якому загадала зносіцца як з генералам Хлявінскім, так і з генералам Серакоўскім, каб пераканаць іх, што з-за таго вынішчэння ваяводства непрыяцельскім войскам паходзяць асаблівыя цяжкасці ў дастаўцы фуражу, аб чым абывацель і генерал Серакоўскі мог пераканацца пры праходзе са сваім корпусам. Прыбыўшы толькі што з Кобрынскага павета

маршалак павета абывацель і камісар Ягмін перадаў нам прысланую яму дахаты пракламацыю ад Дзівава, якую камісія далучае ў копіі. Зараз жа брэсцкая камісія атрымала ад люблінскай камісіі данясенне ад дня 28-га бягучага з такімі словамі: генерал-маёр Патоцкі кватэруе ў нашым ваяводстве для заслоны Віслы ад расійскага войска. Хелмская зямля і частка нашага ваяводства ажно да Пяскоў занята аўстрыйскім войскам, але на наш запыт, колькі яго ўкрочыла, дагэтуль не маем ведамасці.

Даны ў Брэсце-Літоўскім на сесіі 31 ліпеня 1794 года.
Павел Ягмін, камісар

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 1, л. 236

№ 68. 3 жніўня. Табліца аб стане корпуса К. Серакоўскага пад Слонімам

Вайсковая адзінка	**чалавек**	**коней**
Пры генерал-маёры	3	35
Фузілераў	7	9
Артылерыі	201	239
Стральцоў Ціхоцкага і Сакальніцкага	107	13
Стральцоў кобрынскіх	111	4
Коннай каронннай гвардыі	345	363
Нарадовай кавалерыі	158	189
IV полк пярэдняй варты	36	44
V полк пярэдняй варты	238	299
Кавалерыі кобрынскай	230	236

Працяг на наступнай старонцы

Вайсковая адзінка	чалавек	коней
Гвардыі пешай кароннай	282	34
V рэгімент		
(пешы фузілерны)	678	43
XV рэгімент (пешы)	264	28
XVIII рэгімент (пешы)	713	63
Батальён Кралікоўскага	478	48
Батальён Рафаловіча	258	41
Міліцыі брэсцкай	316	20
	4425	**1828**

Да таго: 26 гармат, 25 арыштантаў, 6 дэзерціраў, 26 забітых і 28 параненых.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 9—10

№ 69. 4 жніўня. Ліст Т. Касцюшкі да К. Серакоўскага

Касцюшка 4 жніўня 1794 года. Піша мне генерал Ясінскі аб гарматах, вельмі патрэбных яго дывізіі. Я не магу даць іх, бо тое войска не павінна выступаць з месца абароны. Май ласку, генерал, пазычыць яму некалькі штук з твайго парку. Калі ты, генерал, ужо злучыўся з Хлявінскім, то спадзяюся, што ўлагодзіш мае і грамадскасці чаканні і паведаміш у Кіевец аб вашым спатканні і пабіцці непрыяцеля.

Касцюшка

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 11

№ 70. 5 жніўня. Рапарт невядомага К. Серакоўскаму з Замосця

5 жніўня 1794 года. Рапарт з Замосця

Учора падпалкоўнік Ахматовіч прыйшоў з палком Беляка і стаў абозам пад Паперняй, а сёння ён сказаў,

што 300 казакоў пераправілася ўброд пад Паперняй. Афіцэры зараз купляюць харч дорага, газы цалкам парастрацілі і не маюць сродкаў як далей жыць.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 15

№ 71. 5 жніўня. Ліст Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму з-пад Пакутава

Касцюшка, 5 жніўня. Даю гэты арданананс генерал-маёру Серакоўскаму ў тым, каб па атрыманні гэтага ён даў батальён пяхоты лінейнага войска з 4 гарматамі і 400 коннікамі ў каманду здольнаму, адважнаму і асцярожнаму (афіцэру) для абароны г. Брэста ад непрыяцеля або выгнання яго адтуль.

Даны ў абозе пад Пакутавам 5 жніўня 1794 года.
Касцюшка

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 16

№ 72. 7 жніўня. Ліст Т. Касцюшкі да К. Серакоўскага аб розным

З вялікім задавальненнем, мой каханы генерал, я даведаўся аб павучальным завяршэнні боя войска пад тваёй камандай з лютым непрыяцелем нашай Айчыны. Гэтая ўдача павінна заахвоціць вас да новых дасягненняў і перамог: маеце для гэтага адкрытае поле, непрыяцель перастаў адыходзіць і трэба яго зносіць. Разам з тваім рапартам, каханы генерал, прыйшоў рапарт і з Вільна. Важная гэта сталіца застаецца ўцалеўшай нават пры моцным зборы сабранага там непрыяцеля. Маскоўскае войска пойдзе прахам, калі дывізія генерала Хлявінскага падыйдзе да горада (неразборліва - Я.А.) і зойме тыл непрыяцеля. Ты жа, генерал, пільнуй Дэрфельдэна і па злучэнні з ідучай на Вільна дывізіяй генерала Хлявін-

скага ўдарце яго. Было б цудоўна зрабіць дыверсію на непрыяцеля таксама, скажам, заўчасным маршам на Нясвіж, дзе яны маюць усе ўмовы рабаваць і лупіць вас. Аднак стасуй свае абароты з абставінамі, не выпушчай з вока Брэст і перашкаджай непрыяцелю прадрацца тым шляхам у тыя бакі. Дасылаю табе невялікі сяброўскі падарунак, другія раздай тым, хто вылучыўся, з выражэннем падзякі ад майго імя ўсім афіцэрам і войску. Змагайцеся і перамагайце. Узнагародай вам будзе чуйная слава і падзяка Айчыны. 7 жніўня 1794 года. Тадэвуш Касцюшка.

Загадваю генералу Серакоўскаму на моцы гэтага ардананса прыказаць камандуючаму дывізіяй Хлявінскаму, калі толькі не існуе гвалтоўнай патрэбы ў збіцці Дэрфельдэна, неадкладна маршыраваць на дапамогу г. Вільна. Яму павінна быць зразумелай важнасць утрымання таго месца, ад якога залежыць лёс усёй правінцыі. Касцюшка

РДВГА, ф. ВПА. с. 2728, ч. 2, л. 23—23 адв.

№ 73. 7 жніўня. Адказ ваўкавыскай парадкавай камісіі на зварот К. Серакоўскага

Рабілася ў Ваўкавыску на пленуме камісіі дня 7 жніўня 1794 года

Камісія, сабраная на пленум па звароту шаноўнага абывацеля, генерал-маёра Серакоўскага, разам з адказам далучае да таго адказу і некаторыя свае пажаданні ў наступных словах.

Шаноўны абывацель генерал. Камісія ахвотна задаволіць тваё, генерал, патрабаванне, бо бачыць іх карыснымі для ўмацавання краёвай сілы і перамогі над непрыяцелем. Таму атрыманы гэтым днём загад аб далучэнні міліцыі Ваўкавыскага павета да тваёй, шаноўны генерал, калоны быў адразу ж даведзены да генерал-маёра,

абываццеля Сегена з патрабаваннем задаволіць яму. Той абяцаў выступіць ранкам і затым адцураўся ад нашых пажаданняў. Камісія давяраецца чулай тваёй дбайнасці, шаноўны генерал, у паспяховым распараджэнні таго, бо месца нашай юрысдыкцыі пакінута выхадам са Слоніма нарадовага войска і нам вядома аб набліжэнні непрыяцельскага войска з двух бакоў (гэта значыць ад Дзярэчына і Кобрына), з чаго камісія справядліва баіцца зведаць лёс, які гэтак жа напаткаў кобрынскую камісію. Таму яна вельмі разлічвае на твае, шаноўны генерал, запэўніванні: ці бяспечна месца яе юрысдыкцыі і ці можа яна застацца ў Ваўкавыску? Ужо двойчы ў падобных здарэннях папярэджванні камандуючых генералаў прыводзілі да таго, што каса і акты засталіся без аховы. Да ўсяго камісія даносіць, што ў Ваўкавыску размясціўся значны лазарэт, прысланы з калоны літоўскага войска, аб чым ты не забудзеш у сваім клопаце.

Для пераказу ўсяго, што толькі ў трэці ахоплена гэтым лістом, пасылаецца заслугоўваючы нашага даверу ваўкавыскі мастаўнічы, абывацель Будневіч. Даны ў Ваўкавыску як вышэй. У той рэзалюцыі разам з загадам подпісы наступныя:

Ігнацій Аскерка, віленскі канонік, старшыня
Якуб Хаданоўскі, камісар
Адам Ельскі, войскі, камісар
Францішак Хайноўскі, камісар
Тадэвуш Сеген, камісар
Станіслаў Калупайла, камісар
ксёндз Стэфан Хадароўскі, камісар

Згодна з пратаколам *Казімір Пултрашэўскі*, рэгент парадкавай камісіі Ваўкавыскага павета

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 25

№ 74. 7 жніўня. Допіс аддзела парадкавай камісіі Ваўкавыскага павета генералу К. Серакоўскаму

1794 года, 7 жніўня. Рабілася ў Ваўкавыску

Камісія аддзела парадку Ваўкавыскага павета, атрымаўшы экспедыцыю ў адрас генерал-маёра, камандуючага каронным войскам, абываценя Серакоўскага, і прысланую па вядомых прычынах праз Ізабелін, Межырэч і Івашкевічы ў Слонім а 6-й гадзіне раніцы, адсылае гэтую экспедыцыю з далучэннем свайго загаду ізабелінскаму двару як мага хутчэй пераслаць зараз жа гэтую экспедыцыю ў межырэчанскі двор, той — да івашкевіцкага, а апошні — да самога абываценя генерал-маёра Серакоўскага пад адказнасцю за спазненне, а таксама каб кожнае месца на той жа рэзалюцыі адзначыла час адпраўлення згаданай экспедыцыі пад такой жа санкцыяй адказнасці. На вугле той рэзалюцыі наступны подпіс камісара: Станіслаў Калупайла, камісар аддзела парадку Ваўкавыскага павета.

Згодна з пратаколам штодзённых чыннасцяў, *Юзаф Завіша*, сакратар камісіі аддзела Ваўкавыскага павета

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 28. За пячаткай

№ 75. 7 жніўня. Прадпісанне Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму адносна платы жаўнерам

Тадэвуш Касцюшка, Найвышэйшы начальнік нарадовай збройнай сілы

Згодна з папярэднім і цяперашнім штатам, ухваленым на сейме, на каня намесніка, таварыша, унтэр-афіцэра, трубача і шараговага вызначана на фураж па 15 злотых. Паколькі зараз з кожнага каня ў скарб Рэчы Паспалітай вылічаецца па 12 зл. і застаецца толькі 3 зл., то я патрабую аддаваць іх кожнаму намесніку, таварышу, унтэр-афіцэру, трубачу і шараговаму на выпадак, калі

спамянутыя будуць служыць асабіста на конях, а калі без коней або паступова страцяць іх, тады тых 3 злотых не даваць зусім. Тыя грошы трэба трымаць у брыгаднай або палкавой касе для пакупкі або коней, або іншых патрэбных ваенных рэквізітаў. На справядлівыя прапановы брыгадных і палкавых камендантаў, каб пры так мізэрным скарбу штабныя і эскадронныя фурманкі найперш пакінуць у карпусах, патрабую плаціць за кожны штабны і эскадронны воз па 83 зл. і 10 грошай штомесяц, а за фураж да тых вазоў браць у скарб за кожнага каня па 12 зл.

Даны ў абозе пад Мокатавым 7 жніўня 1794 года.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 29

№ 76. 7 жніўня. Зварот бельскай парадкавай камісіі да К. Серакоўскага

Парадкавая камісія Бельскай зямлі, будучы ў пастаяннай трывозе ад набліжэння непрыяцельскай каманды Дзівава, што вынікае з уласнага паведамлення парадкавай камісіі Брэсцкага ваяводства і якое камісія мае гонар далучыць у арыгінале да сваёй просьбы да генерал-лейтэнанта войск Рэчы Паспалітай, абываценя Серакоўскага, каб ён меў ласку надзейна запэўніць у немагчымасці спынення непрыяцелем камунікацыі Літоўскага княства з Варшавай, што несумненна адбудзецца, калі б непрыяцель сабраўся прайсці з Шумска праз Белавежскую пушчу на Бельск паміж Гродна і Варшавай, дзе мы не можам мець аніякай абароны.

Даны ў Бельску на сесіі перад самым апоўднем 7 жніўня 1794 г.

Фелікс Трайноўскі, старшыня

№ 77. 8 жніўня. Рапарт ваўкавыскай камісіі К. Серакоўскаму

Рабілася ў Ваўкавыску

Паколькі дэлегаваны ўчора нашай камісіяй ваўкавыскі мастаўнічы, абывацель Будкевіч з экспедыцыяй да генерал-маёра, абывацеля Серакоўскага не даехаў да Слоніма з-за чуткі аб кватараванні непрыяцельскага войска ў Езярніцы і даверыў пасылку абывацелю Серакоўскаму, быццам бы стаячаму ў Ражанцы, руцэ жармунскага эканома і абывацеля Петрашэўскага, то ваўкавыская камісія на пленарным сходзе занепакоена - ці трапіла тая экспедыцыя ў рукі абывацеля генерала Серакоўскага і для таго прызначыла на такую экспедыцыю рэзалюцыяй са свайго кола парадкавага камісара Ваўкавыскага павета, абывацеля Тадэвуша Сегена, з якім пасылае пратакольную выпіску з пасланай учора экспедыцыяй і які абавязаны вусна выказаць усе пажаданні камісіі.

Даны 8 жніўня 1794 года

Ксёндз Францішак Хайноўскі, старшыня
ксёндз Ігнацій Аскерка, віленскі каморнік
Якуб Хадакоўскі, камісар
Антон Талочка, камісар
Стэфан Хадароўскі
Ян Бронц
Франц Севашэвіч
Станіслаў Калупайла

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 30

№ 78. 8 жніўня. Ліст галоўнакамандуючага М. Вяльгорскага да К. Серакоўскага

Атрымаў твой, генерал, рапарт аб атрыманым над непрыяцелем авантажу, з чым сардэчна цябе віншую.

У тваім рапарце да Найвышэйшага начальніка прачытаў, што з боязі трапіць у акружэнне, ты задумаў адступаць на Ражанку ажно да шарашоўскіх гацяў. Гэтае адступленне зусім агаліла б Гродна і цэлы край да самага Вільна. Канешне, трэба каб дывізія войска *(неразборліва — Я.А.)* пад камандай генерал-маёра Паўла Грабоўскага заняла пазіцыю над Нёманам. Я жа не разумею для чаго ты збіраешся апанаваць шарашоўскімі гацямі гэтак вялікім корпусам. На заняцце іх хапіла б некалькі батальёнаў, а твая пазіцыя паміж тымі двума карпусамі абнадзейвала б ад акружэння і магла бы забяспечыць сувязь паміж Гродна і Вільна моцнымі патрулямі, высланымі з літоўскай дывізіі на Нёман. Зараз жа яна не трывалая з-за праходу па тракту казакоў. У выпадку павароту Дэрфельдэна на Вільна, заўсёды ёсць магчымасць злучыцца з літоўскай дывізіяй і выканаць дыверсіі, адну з якіх ты здзейсніў вельмі кемліва і мужна. Перадай мае заўвагі генералу Грабоўскаму, добра ведаючаму дыспазіцыю тамтэйшых краёў і хутчэй прысылай заўвагі на тыя пункты. Пільнуйце Дэрфельдэна, бо зараз ад вас залежыць лёс Вільна і нават усёй Літвы. Пасылаю таго ж самага кур'ера, які прама ад вас паедзе ў Варшаву.

Даны ў Лейпунах дня 8 жніўня 1794 года. *Вяльгорскі.*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 31—31 адв.

№ 79. 9 жніўня. Наказ Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму на атаку Дэрфельдэна

Паколькі ад ліквідацыі калоны Дэрфельдэна залежыць лёс Вільна і бадай усёй Літвы, заклінаю цябе, генерал, міласцю Айчыны як досыць зараз моцнага па злучэнні з Хлявінскім пастарацца зрабіць гэта вынікова. Твае таленты і дбайная служба Айчыне дазваляюць мне спадзявацца на паспяховы вынік. Буду помніць аб

абываделі Настрэцкім, але толькі не ведаю, якім спосабам
узнагародзіць яго старраннасць.

Даны ў абозе пад Кокатавым 9 жніўня 1794 года.
Касцюшка.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 34

№ 80. 11 жніўня. Данос ражанскага губернатара К. Серакоўскаму

Пасля выхаду нарадовага войска з Ражаны ў гэты ж
самы 9-ы дзень чакаўся падыход маскоўскага войска, аднак
дагэтуль не відаць ніводнага казака. Тутэйшы падданы,
які быў вызвалены з маскоўскага абозу з адным толькі
валом і які прыйшоў учора, казаў, што маскалі стаяць
абозам каля месца, расцягнуўшыся ажно пад самае
Сакалова. Толькі што вызваленыя з Слоніма трое
тутэйшых кажуць, што маскалі стаяць вакол месца, а
багажы іх у тыле за месцам і, як давялося ім пачуць,
маскалі быццам бы збіраюцца пайсці праз Ражану на
Брэст. Іншых навін нельга атрымаць, паколькі адтуль
ніхто, акрамя фурманаў, не вярнуўся. Казакі малоцяць
збожжа на фальварках за 2 і 3 мілі навокал Слоніма,
што бачылі фурманы.

Даны 11 жніўня 1794 года. Губернатар Ражанкі

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 36

№ 81. 12 жніўня. Прадпісанне Варшаўскай рады адносна універсала Т. Касцюшкі аб харчаванні паўстанцкага войска і рэквізіцыях

Найвышэйшая нарадовая рада падае да агульнага
ведама ўсіх абывацеляў і польскіх жыхароў атрыманае
ад Найвышэйшага начальніка распараджэнне адносна
спосабу выбірання харчу, фуража і дастаўкі фурманак

для войскаў Рэчы Паспалітай, а дакладнае яго выкананне даручае Цэнтральнай дэпутацыі ВКЛ, парадкавым камісіям, магістратам гарадоў і дазорцам, пастаўленых і маючых стварыцца ў землях і паветах.

Тадэвуш Касцюшка, найвышэйшы начальнік збройнай сілы народа

Разам з павелічэннем збройнай сілы народа да мяне раз пораз даходзяць узрастаючыя скаргі як абывацеляў, так і ўрадаў на ваенных, якія раз'яджаюць часта без арданансаў або не жадаюць іх паказваць, якія прыціскаюць пры выбары фуража, правіянта і фурманак без неабходных указаў, платы і білетаў. Таму, жадаючы прадухіліць усе тыя вандроўкі і канчаткова захаваць патрэбную ў вольным народзе любоў паміж жаўнерам і жыхаром края, абвяшчаю наступныя правілы, якія належыць урачыста публікаваць ва ўсіх гарадах, вёсках, абозах і гарнізонах сярод абывацеляў праз Найвышэйшую нарадовую раду і ўсіх маіх падначаленых войска Рэчы Паспалітай і ад якіх ніхто не можа ўхіліцца пад найсуровейшым пакараннем.

1. Абавязваю Найвышэйшую нарадовую раду (ННР) і членаў яе аддзелаў харчу і патрэб заўсёды мець у гатоўнасці ў кожным ваяводстве, зямлі і павеце колькі можна харчу, фуражу, коней, вупражу, вазоў, крэсы і асабліва матэрыялы, якія патрэбныя для направы і задавальнення вайсковых патрэб і якія могуць знайсціся ў кожным горадзе і вёсцы, менавіта жалеза, здатнае пад паязды дрэва, скуры, волава, вяроўкі, воўну, палатно і г.д. А ўсё тое толькі з ведама дазорцаў і магістратаў гарадоў, каб камісары, прыкамандзіраваныя да праходзячых каманд, не змушаліся звяртацца ў самыя парадкавыя камісіі, а даведваліся аб усіх запасах і складах ад дазорцаў і шляхам перасылкі сваіх указаў паміж тымі і якія будуць адрасаваць іх у свае камісіі.

2. Для гэтага кожная камісія, калі яна яшчэ не зрабіла тое, загадае зрабіць добрасумленны і дакладны вопіс усіх

наяўных абываццеляў і вышэйзгаданых прадуктаў і ваенных патрэб і такі вопіс належыць мець не толькі камісіі аб сваім абшары, але і кожнаму дазорцы аб сваёй акрузе. Акрамя таго, парадкавым камісіям і паднача-леным ім дазорцам трэба заўсёды мець ведамасць аб збожжы, фуражу, мясе і ссыпцы, загаданых і даручаных урадам ім у трыманне. Як вопісы, так і табліцы ссыпак належыць падаваць і перасылаць камандуючым дывізій лінейнага войска альбо дэлегаваным з дывізій камісарам толькі па пастановах парадкавых камісій і дазорцаў.

3. Што тычыцца ссыпкі, то на час ідучай вайны і паўстання народа яе 2 разы ў год будзе ўскладваць і выдаваць аддзел харчу ННР, а абываццелям належыць бясплатна аддаваць і самастойна адвозіць яе туды, куды загадае ўрад. Усе жа іншыя прадукты, узятыя на вайсковыя патрэбы ў войскі Рэчы Паспалітай звыш згаданай ссыпкі, будуць аплочаны ўрадам.

4. Жадаючы ўвесці парадак і гаспадарскасць у распараджэннях войскаў Рэчы Паспалітай да жыхароў адносна харчу, фуража або ваенных патрэб, загадваю ўсім камандуючым асобнымі дывізіямі або гарнізонамі лінейнага войска адразу па атрыманні гэтага ардананса паставіць пры кожнай сваёй дывізіі палявы камісарыят, які абавязаны падлічыць і абагуліць усё аб вайсковых рацыёнах і парцыёнах разам з коштам запатрабаваных дывізіяй харчу, фуража і розных іншых ваенных патрэб і такую належную ацэнку падаць камандуючаму або камісару, прыкамандзіраванаму да дывізіі.

5. Для гэтага аддзелам харчу і вайсковых патрэб, напрактыкаваным ужо ННР спосабам, трэба мець пры кожнай асобнай дывізіі свайго камісара, які па зносінах з палявым камісарыятам і па загаду таго за подпісам камандуючага будзе прымаць, раскладаць ссыпку згодна спецыфікацыі і табліц, якія атрымае ад парадкавых камісій або дазорцаў у месцах свайго кватаравання, здаваць у палявы камісарыят розныя пастаўкі адпаведна

з размеркаваннем таго раскладу, за атрыманую ссыпку выдаваць абывацелям квіты або плаціць з засведчаннем адпраўленых у касы сваіх аддзелаў копій такіх сваіх накладаў і білетаў (палетаў), рапартуючы штомесяц аб усім у аддзелы сваіх парадкавых камісій. Палявы жа камісарыят абавязаны засведчыць абывацелям дастаўку гэтых вайсковых паставак, выдаваць тым жа камісарам грошы за прадукты, пастаўленыя звыш загаду або білетаў камісараў, і берагчы гэтыя прадукты так, каб жаўнеры і жыхары не цярпелі ўціску.

6. Там жа, дзе спецыфікацыя прадуктаў і вайсковых патрэб знойдзе ў абывацеляў больш мясцовай патрэбы і не будуць падрыхтаваныя табліцы ссыпкі, там для высвятлення і праверкі такіх прадуктаў і вайсковых патрэб у ваколіцах абоза трэба выслаць вайскоўцаў, якія разам з дазорцамі або дэлегатамі мясцовай парадкавай камісіі хутка перапішуць і здадуць камандуючаму дывізіі, а дывізіённы камісар разам з палявым камісарыятам па разборы такога перапісу паступяць вышэйпрадпісаным шляхам. Па атрыманні ад камісараў загаду на дастаўку харчу, фуражу і вайсковых патрэб, абывацелі абавязаны не марудзячы адвозіць іх у прызначанае месца (у выпадку валакіты або спазнення яны прымушаюцца вайсковай экзекуцыяй). Аднак вайскоўцы, разасланыя на гэтую экзекуцыю, маюцца прад'яўляць на тое ардананс камандуючага сваёй дывізіі, які таксама пасылае камісараў ад імя членаў палявога камісарыята для перапіскі тых са сваім аддзелам і для легітымацы сведчанняў і квітаў абывацеляў, якія прыходзяць за платай у касы аддзелаў.

7. Заснаваўшы такім чынам правілы, па якіх ад абывацеляў належыць патрабаваць, дастаўляць і аплочваць вайсковыя патрэбы, пастанаўляю, што абыякавы або непаслухмяны свайму начальству жыхар, які не аддасць або ўтоіць прадукты ці вайсковыя патрэбы і таксама не пажадае задавольваць легальныя загады, той

будзе пакараны сваёй вярхоўнай уладай. Хто не захоча выконваць прадпісаных яму павіннасцяў або завалацу-жыць іх спагнанне, той па даносу ў ННР будзе адасланы ў крымінальныя суды. Узаемна, сурова загадваю камендантам любой нарадовай збройнай сілы моцна сачыць за тым, каб ніводны жаўнер ніякай каманды не адважваўся асобна ад дывізіі выбіраць і браць у жыхароў пад харч і фураж фурманак ці якіх-небудзь вайсковых патрэб пакуль не прадставіць на тое выразны арданано або загад вышэйпрадпісаным спосабам, а парушальнікі гэтага распараджэння будуць неадкладна пакараны па даносу адпаведна з ваеннымі артыкуламі і пад адказнасцю з начальнікаў, рангаў і маёнткаў.

8. Такіх арданансаў і ўказаў не можа выдаваць зямянскі афіцэр любога рангу. Таксама забараняецца збіраць і ўтвараць самастойныя карпусы зямянскай збройнай сілы або паспалітага рушання, бо яны павінны падпарадкоўвацца заўжды дывізіі і камандзе лінейнага войска. Ардanансы і загады на розныя вайсковыя патрэбы выдаюцца толькі самімі камендантамі дывізій і абозаў лінейнага войска. Пры праходах або кватэраванні спамянутых вайсковых каманд, пры якіх не будзе прыстаўленых камісараў, ні палявога камісарыята, іх камандуючыя маюць моц распараджаць патрэбны для іх каманды харч і фураж праз мясцовыя парадкавыя камісіі з калькуляцыяй іх адпаведна вайсковым рацыёнам і парцыёнам. Па атрыманні тымі камісіямі выразных арданансаў камандуючых лінейных дывізій, камісіі будуць адрасаваць камандзіраваных з білетамі (палетамі) да складоў ссыпак або абывацеляў, а свае білеты высылаць у аддзел харчу ННР для абліку той жыўнасці па той цане, па якой яна будзе дастаўлена той камандзе.

9. За фурманкамі на патрэбы абозаў камандуючыя дывізій або камісары аддзелаў звяртаюцца асобна ў мясцовую парадкавую камісію, для дастаўкі якіх тая будзе выдаваць свае палеты з указаннем часу паслугі пры абозе і ўжываць вайсковую дапамогу мясцовай каманды

супраць непакорных. Дастаўленых па білетах парадкавых камісій фурманак і коней з правіянтам пад рознымі ўмовамі не затрымліваць і не ўжываць пры абозах пад пагрозай ваеннага пакарання.

10. Пастаўленыя на трактах абывацельскія пошты не павінны нікому даваць паяздоў і коней без прадстаўлення ардананса камандуючага дывізіі лінейнага войска на дазвол карыстання такой пошты, а ўсё гэта за 15 грошаў з каня ў адпаведнасці з распараджэннем і аплатай вопіса канстытуцыйнага сейма. Тадэвуш Касцюшка

Гэтымі правіламі ННР абвяшчае вам, абывацелі, што дакладнае іх выкананне вызваліць вас ад уціскаў і прыкрасцяў, а публічная справа больш не будзе цярпець ад валакіты.

Даны ў Варшаве на сесіі рады дня 12 месяца жніўня 1794 года

Алаіз Суліstroўскі, старшыня

Томаш Чэх, сакратар Найвышэйшай нарадовай рады

РДВГА, ф. 2728, ч. 2, л. 38—39. За пячаткай

№ 82. 12 жніўня. Паведамленне П. Грабоўскага К. Серакоўскаму аб штурме ворагам г. Вільна і яго абароне

Копія рапарта

1. 9 жніўня. Вечарам стаў у Вільна. Дня 10-га аб'ездзіў акопы і месца на Зарэччы і Паплавах, дзе пад камандай генерал-маёра і каменданта горада, абывацеля Грабоўскага, знайшоў акопы і шанцы без патрэбнай паміж імі камунікацыі і ўсякай заслоны падыходу непрыяцеля. 2. На лідскім і чорным, мінскім, трактах знайшоў 3 батарэі пад камандай генерал-маёра Мейена, моцна засланяючых горад з Нёмана ад падыходу непрыяцеля на добрую чвэрць мілі, аднак без усялякай камунікацыі пры астаўленні Зарэчча і Паплаў, супроць якіх акопаў і артылерыі стаў расійскі абоз, які на стыку з польскімі

Відзамі добра рэкагансцыраваны і мае каля 8000 жаўнераў. 3. Паміж радунскім і лідскім трактамі ў полі перад ярамі і ўзвышшамі, закрытым лазняком, уначы стала дывізія пад камандай генерал-маёра Франкоўскага без усялякай заслоны і акопаў. Далей ад Пагулянкі на гродзенскім тракце прыгатаваны невялікія багажы для вывазу на Панары гродзенскім трактам, якія ад Панар і гродзенскага тракта засланіла кавалерыя паспалітага рушання. Панарская гара прыкрыта адной кампаніяй пяхоты і кавалерыі паспалітага рушання Трокскага ваяводства.

4. З Пулаў на тракты да Алкенік і Радуні быў высланы палкоўнік, абывацель Стэфан Грабоўскі са сваім палком татар, палком кавалерыі пярэдняй варты і адной кампаніяй стральцоў, аднак ён невядома чаму пакінуў маё становішча за дзень да гэтага і пацягнуўся на Алкенікі, аб чым паведаміў рапартам. Аднак, як я не жадаў, не мог гэта прадухіліць. У той жа дзень ранкам для разведкі маскоўскага абозу і лепшага ведання непрыяцельскай сілы быў пасланы маёр Корсак з нарадовай кавалерыяй, што ён мужна і кемліва і выканаў: напаў на левае непрыяцельскае крыло, збіў непрыяцельскі нейкі пастарунак, забіў некалькі чалавек, забраў у няволю некалькі дзесяткаў і 270 казачых коней. Непрыяцельскія лініі некалькі гадзін стаялі пад зброяй. Тым часам у вечар па полацкаму тракту падыйшла калона непрыяцеля і расцягнулася на правым іх крыле. Тут жа прыбыў ад генерала Дэрфельдэна транспарт артылерыі з 8-ю 18-ці фунтовых гармат.

А 7-й гадзіне дня 11-га з ранку непрыяцель пачаў нас атакаваць маршам на акопы генерала Мейена, дэманструючы большай часткай свайго войска, што быццам бы ў тым месцы пачне кананаду, а на самой справе прадраўся ўсёй сваёй сілай па радунскаму тракту і ўдарыў на дывізію генерала Франкоўскага там, дзе ён, як піша, спыніўся. Пачалася жудасная кананада. Нашы мужна адказвалі. Пада мной, маім флігель-ад'ютантам Забелам і рот-

містрам Гяцэвічам палі коні. У генерала Грабоўскага конь паранены, аднак ён перасеў на другога. Касінеры двух батальёнаў пагалоўна кінуліся наўцёкі. Маскоўская кавалерыя ўдарам з тылу адсекла цэлы 3-ці пяхотны рэгімент, а калі ён стаў адступаць, то непрыяцельская кавалерыя яго неміласэрна паражала і амаль цалкам захапіла. Як ні кідаліся брыгадзір Касакоўскі з маёрам Корсакам усяляк атакаваць непрыяцеля, аднак рэгімента не маглі адбіць, які быў ужо ў самым замяшанні. Аднак яны столькі паказалі, што змораныя карабінеры не здолелі забраць зброі пабітых разам з палоннымі, якую (каля 150 штук) брыгадзір Корсак загадаў падабраць сваім шаранговым. Шэф 6-га коннага літоўскага палка Азулевіч таксама атакай свайго палка стрымаў імпэт непрыяцельскай кавалерыі, сам быў забіты, а ягоны маёр Халецкі некалькі разоў паранены.

У гэты момант непрыяцельская пяхота двума батальёнамі ўдарыла з пагоркаў на батальён першага нашага рэгімента, які доўгім агнём адганяў непрыяцеля, але не могучы стрымаць штыкі, адвярнуў з 4-ма 6-ці фунтовымі гарматамі сваёй батарэі і адступіў, выратаваў-шы толькі адну. Так усё наша правае крыло было змята і адступіла гродзенскім трактам праз Пагулянку на Панары. Генерал Мейен рушыў пад горад у злучэнні з адным рэгіментам дывізіі генерала Франкоўскага туды, дзе князь Казімір Сапега перацягнуў цяжкую артылерыю з гарматамі і паставіў батарэю. Непрыяцель стараўся зруйнаваць Зялёны мост і тую батарэю, аднак князь Сапега не толькі збярог мост з батарэяй, але агнём батарэі сваёй у адказ прымусіў адступіць непрыяцельскую батарэю. Багаж наш стаў выцягвацца за раку Вілію праз Зялёны мост, чаму ніхто не перашкаджаў, хаця ён і не быў добра закрыты. Дывізія ж, стаяўшая на Зарэччы і Паплавах, цалкам не дзейнічала.

Апанаваўшы ўсімі пагоркамі, непрыяцель з 10-ці гадзін раніцы аж да 9-ці вечара асыпаў замкнуты горад жудаснай кананадай. Непрыяцельская ж пяхота двойчы

спрабавала падступіцца да горада. *(Неразборліва — **Я.А.**)* абывацелі адчынілі-такі дзверы генералам а 1-й гадзіне апоўначы. Мая інфантэрыя, знясіленая няспынным 4-мільным маршам, патрабавала адпачынку. Без фуража прысталі коні, менавіта артылерыйскія. На шчасце мае патрулі і Корсака прывезлі ёй 32 фунты маскоўскага фуражу і 3-х карабінераў з казаком.

Па ўсіх згодных паміж сабой звестках Дэрфельдэн выйшаў на Моталь і нават загадаў арданансам эскадрону ў Антопалі прыбыць да абоза ў Моталі. Як толькі выпасу коней, пайду далей за імі. Аднак калі ён пакіне Моталь, то я не мяркую цягнуцца за імі больш, бо ім можа падаспець са Слоніма падтрымка, а я б надта далёка аддаліўся ад корпуса. Да Моталя адтуль проста 5 міляў, а гэта не зусім тое, што я зараз *(неразборліва — **Я.А.**)*. Горш таго, мы маем у абозе шпікоў, з чаго заключаю, што абаронны хамут - гэта залога Рэпніна. Панове таго месца былі ў абозе і падавалі рады. Я ўсё абдумаў, каб упэўнена паведаміць, што я адступаю абы замест злучэння мы самі не трапілі ў сёдлы. Пайду на Хомск або далей. Буду чакаць загадаў, а аб чым пэўна даведаюся, тое не замаўчу. Ардананс яго, пасланы экскартам, датаваны з Опаля на дарозе з Межырэчча ў Моталь.

Павел Грабоўскі, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 40—40 адв.

№ 83. 12 жніўня. Паведамленне А. Хлявінскага К. Серакоўскаму аб капітуляцыі г. Вільна

Горад адбіў сваёй пяхотай, стаячай пад мурамі. Калі непрыяцель па свайму звычаю запаліў прадмесце, то горад апынуўся ў жудасным стане. Прысланы да нас дэлегатам абывацель Пётр Шульц пытаўся, ці можна абараніць горад ад поўнага разарэння. Таму мы, згодна з думкай упаўнаважанага абывацеля Прозара, знаходзячы пазіцыю непрыяцеля ўжо перавышаючай нашу, горшую, таксама

ўжо небяспечную для рэгулярнага войска з-за захопу непрыяцелем пераправы, па якой выйшла праз Вілію нарадовая кавалерыя, адказалі, што дзеля захавання горада ад магчымасці поўнага зруйнавання робім капітуляцыю, а нашае войска адводзім за раку. Частка нашага войска з паспалітага рушання і касінераў, прыблізна да 1000, рассыпана і, можа быць, гэтак жа страчана пры вяртанні некаторых да непрыяцеля. Я жа маю 2 дэманціраваныя гарматы.

Даны ў абозе пад Дукштамі года 1794 месяца жніўня 12 дня *(Антон) Хлявінскі*, генерал-лейтэнант

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 42

№ 84. 13 жніўня. Адказ Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму на рознае

Адказ генерал-маёру Серакоўскаму на ліст таго ад 9 жніўня з-пад Беразы

Думку аб трыманні ў бяздзейнасці корпуса Дэрфельдэна хвалю, аднак пры тым трэба пільна сачыць, каб ён не напусціў дыму тым генералам дэманстрацыяй быццам бы ўсяе свае каманды і не дакрочыў да Вільна. Старайся як мага хутчэй умацаваць свой корпус коннымі і пешымі кантаністамі, як ужо сабранымі ў Брэсцкім ваяводстве, так і ў іншых. Спадзяюся, што не выпусціш з вока тыя 2 тысячы Масквы, што ідуць з Уладзіміра, і будзеш шкодзіць іх пасоўванню, а калі павернуцца на Варшаву, тады трэба паслаць за імі выдзел. Зараз тут вынаходзяцца сродкі, абы ўзмацніць каманду пана *(неразборліва — Я.А.)* як з Падляшша, так і Люблінскага ваяводства. Трэба не забываць пра прускую мяжу і пасылаць туды шпікоў для ведання абаротаў непрыяцельскага войска. Засведчыў імем народа маю падзяку палкоўніку Энгельгардту з палка Хлявінскага пад камандай маёра Мараўскага за аказаную вытрымку і баявітасць пры зрыве рэцірады ўсяго корпуса. Адпраў каго ў Упіцк і Гарадзенск, каб паспалітае рушанне рухалася на дапамогу Вільна.

Аддаюся вядомаму мне і вопытнаму твайму таленту. Далучаю патэнт палкоўніка для Ахматовіча.

Даны ў абозе пад Кокатавым 13 жніўня 1794 года.
Касцюшка

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 44

№ 85. 14 жніўня. Рапарт паручніка Я. Нямцэвіча К. Серакоўскаму

Ужо збіраю тут значны фураж для ўмацавання корпуса і быў бы рады на большае, калі б меў на тое прадпісаныя правілы. Не ставячы мэты ўмешвацца ў ваенную дырэкцыю шаноўнага генерала, тым не меней, з прычыны звязанай з тым дыслакацыі магазіна не магу спытаць — калі дабудзем Шарашоў? На цэлы магазін фураж можна ўзяць у той бок Брэста, а пэўная яго частка заўсёды на вазах гатовая для адпраўкі. Пры паведамленні эканомным абывацелям шляху пераносу магазіна з Шарашова на іншае месца, яны проста звязуць фураж з дамоў і гэтым папросту задаволяць вайсковыя патрэбы. У якім тады памеры заснаваць і ў якой пазіцыі ўрэгуляваць той магазін мне належыць, чакаю, шаноўны генерал, твайго адказу. Даны ў Шарашове 1794 года 14 жніўня.

Ян Нямцэвіч, брэсцкі паручнік

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 48

№ 86. 14 жніўня. Рапарт ковенскага генерала Абрамовіча К. Серакоўскаму

14 жніўня 1794 года з Радзіна. Абывацель! Па экспедыцыі, дастаўленай у Брэст за пячаткай генерала Серакоўскага палкоўніку і каменданту батальёна інфантэрыі, атрымаў загад Найвышэйшага начальніка аддаць тваёй ягомосці, абывацель, усіх маіх конных кантаністаў з тымі, сюды прысланымі, двума карпусамі

як мага хутчэй, толькі добра ўзброенымі і вышкаленымі, а таксама і пешых кантаністаў з косамі і пікамі і, калі можна, то са стрэльбамі. З нецярпеннем чакаем пераправы праз Віслу ўсяго непрыяцельскага корпуса і гатовы з гонарам злажыць жыццё і г.д і г.д.

Іяхім Абрамовіч, ковенскі генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 50

№ 87. 18 жніўня. Адозва Я. Ясінскага да брэсцкіх абывацеляў адносна самавольных рэквізіцый

Паколькі мне паведамлена, што ў Брэсцкім ваяводстве некаторыя ягомосці паны, маючы ад быўшых на службе афіцэраў дазвол збіраць ахвотнікаў супраць непрыяцеля, і на гэтай падставе збіраюць конных і 50-дымовых намеснікаў, з-за чаго церпіць страты і спусташэнне фундуш, прызначаны на рэкрутаванне рэгулярнай каманды, то я сваім імем мясцовага ўпаўнаважанага заяўляю, што думка Найвышэйшага начальніка тычыцца толькі саміх добраахвотнікаў, а не прызначаных правам на што іншае людзей, што НН хоча мець толькі такія новыя карпусы, на якія ўжо выдаў або збіраецца выдаць ясныя ардынансы, а таму той, хто збірае збройны люд без дазволу лінейнага генерала і не прадставіць на тое арданансу, той не толькі не заслугоўвае даверу як неправадзейны, а звыш таго будзе прыцягнуты і адкажа ў належным судзе.

Moscicki H. General Jakub Jasinski i powstanie Kosciuszkowskie. W-wa, 1917. C. 397.

№ 88. 19 жніўня. Прадпісанне Варшаўскай рады К. Серакоўскаму адносна шатроў

Аддзел вайсковых патрэб Найвышэйшай нарадовай рады, жадаючы ведаць колькі шатроў трэба паставіць

войску ў надыходзячы момант, просіць генерал-маёра, абываценя Серакоўскага распарадзіцца выведаць у карпусах сваёй дывізіі: 1. Ці маюць і колькі яны сапраўды маюць шатроў. 2. Ці застаўся лішак з атрыманых у мінулую кампанію, дзе і колькі іх зараз можна атрымаць. 3. Паколькі аддзел вайсковых патрэб не ведае камплекту карпусоў, то ён чакае спецыфікацыі колькі і якіх шатроў яны могуць патрабаваць. 4. Аддзел вайсковых патрэб гэтак жа цікавіцца і фурманкамі пад шатры і іншымі фурманкамі, патрэбнымі для маршу супраць непрыяцеля. 5. Не менш цікавяць і розныя палявыя рэквізіцыі, каб стараннай дастаўкай зрабіць запас не хапаючага на складзе.

Даны ў Варшаве на сесіі аддзела дня 19 жніўня 1794 года

Васілеўскі, намеснік *(неразборліва — Я.А.)* у адсутнасць старшыні

РДГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 61. За пячаткай

№ 89. 20 жніўня. Рапарт генерала Арлоўскага К. Серакоўскаму аб стане дысцыпліны і забеспячэння войска

Рапарт. Адсылаю толькі што атрыманую экспедыцыю палкоўніка, абываценя Гараіна і згодна з тым наказам даю пасведчанне абываценю Францішку Турскаму, які па паўстанні Брэсцкага ваяводства першым уступіў у ваяводскую міліцыю і па ўсім меў здольнасць несці сапраўдную службу ў кампаніі, аднак пры пачатку фарміравання міліцыі генерал абывацель Франкоўскі намінаваў яго аўдытарам у рангу капітана. Зараз жа, калі ранг аўдытара ліквідаваны ў павятовай міліцыі штатам Найвышэйшага начальніка, а ні адна кампанія брэсцкага батальёна не мае капітана, то калі прызначыць згаданага абываценя Турскага ў кампанію, паручнікі

харугваў якой сцвярджаюць па даўняму праву, што аўдытар без павышэння і што тая пасада ліквідавана, тады, згодна з іх довадамі, захаваецца гэтая нікчэмная спрэчка. Я патрабую, каб абывацель Турскі выконваў абавязкі капітана да апошняга распараджэння і аддаю гэта на тваю, генерал абывацель, апрабацыю.

Мне прыкра ў такі дарагі час распасціраццa з гэтым, аднак не магу адмаўчацца на прадпісанне Гараіна і просьбу капітана Турскага. Ад надзейных абывацеляў маю паведамленні, што цэсарскае войска трывала знаходзіцца ва Улодаве, а Масква ў Ражанцы і паміж Ражанкай і Сельцамі. Відаць, гэта вядома генералу абывацелю як і тое, што сіла іх стаіць і ў Лышкаве, праўда меншай часткай і на мой корпус. Звыш таго, шмат гавораць, што з Дзярэчына і Зельвы збіраюцца пайсці праз Ваўкавыск на Гродна. Дагэтуль яшчэ не ведаю ў які бок трэба падацца, калі спатрэбіцца рэціравацца. Чакаю ў тым твайго, абывацель генерал, загаду. Паколькі маеш, васпан, у сваім корпусе батальённыя і паркавыя гарматы рознага калібру, то да іх патрэбны боепрыпасы, якіх, па словах Найвышэйшага начальніка, у цябе мала. Таму прышлі ведамасць роду патрэбных боепрыпасаў і вазоў пад іх. Не магу па памяці ў тым распарадзіцца і навогул не маю ніякага спосабу прысласць іх. Чакаю ад васпана фурманкі, пад якія запасы будуць ужо нарыхтаваныя і якія затым без спазнення і хутка змагу ўпаркаваць і зараз жа адправіць. Высылаю васпану інструкцыю Найвышэйшага начальніка адносна выдачы харчу жаўнерам для абвяшчэння сярод жаўнераў твайго корпуса.

Даны ў Варшаве 20 жніўня 1794 года. Арлоўскі, генерал камандуючы. Маецца загад Найвышэйшага начальніка змазваць боты жаўнерам для іх працяглага захавання.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 64—65

№ 90. 20 жніўня. Рапарт К. Серакоўскаму брэсцкай парадкавай камісіі і генерала К. Рушчыца

Брэст-Літоўская камісія пасылае ведамасць з наступным паведамленнем. Мінулым тыднем быў пасланец з лістом ад аднае вядомай абываценькі, жывучай пад Ковелем, да сваёй маткі, у якім даносіць, што маскоўскі генерал Буксгеўдэн выдаў суровыя ўказы, каб тамтэйшыя абывацелі сюды нікому не пісалі і не пасылалі і гэтак жа адтуль ніякіх лістоў і газет не атрымлівалі. Прысланы ганец гаварыў, што верныя суседзі той жа абываценькі былі ў Дубне і самі бачылі абоз казакоў прыкладна з 10 тысяч. Усе асабліва адзначалі іх убранне ў чырвонае сукно. Той жа пасланец гаварыў, што 4000 пяхоты ідзе да Колкаў пад Ковелем і што маскалі закладаюць вялікія магазіны ў Уладзіміры, Луках і Ковелі. Ён жа паведаміў, што маскалі самі папярэджваюць абывацеляў хаваць каштоўныя звесткі і самі кажуць – мы ведаем, што палякі збіраюць кавалерыю, аднак мы таго жадаем, каб унікаць малых баталій.

Даны на сесіі ў Брэсце 1794 года аўгуста 20 дня

Данясенне другое, а той жа гадзіне атрыманае з Кобрына ў бок Пінска. Маю дакладную вестку, што брыгадзір Дзіваў рэціраваўся да Хомска і стаў абозам у Янаве. У дапамогу яму з Любашова прыйшло 1500 чалавек. З Ратна адно ведама, што ў павет укрочыла 6 казакоў.

Ксёндз Фабіян Саковіч, камісар, старшыня

Пагадзіўся стаць тут з некалькімі соцен касінераў і коней. Ім спатрэбіцца фураж і ***(неразборліва — Я.А.)***. Пры сабе не маю для людзей ніякага запасу. Ці не загадаеш, абывацель генерал, выдзеліць яго колькі можна са свайго камісарыяту пры тваёй калоне, бо пры мне нямала касінераў, якім сапраўды надта патрэбны хлеб. Пароляў і водгукаў не маю ні на гэты, ні на наступны дзень. Прысланых з тваёй, абывацель генерал, калоны

шпікоў разам з арыштантамі і маімі двума па атрыманні следства зараз жа высылаю ў Брэст для належнага пакарання.

Даны ў абозе пад Шарашова 1794 года месяца жніўня 20 дня

Казімір Рушчыц, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 67—68

№ 91. 21 жніўня. Рапарт К. Рушчыца К. Серакоўскаму

Атрымаў рапарт ад патруля, пасланага да Ратна, які высылаю ў арыгінале. Толькі сёння вярнуўся даўно пасланы на Жмудзь мой чалавек, які паведаміў, што Ліпава, курляндскае месца, пасля адпору і адгону мноства Масквы зноў у нашых руках. Той жа чалавек праездам праз Гродна і Свіслач чуў ад радцы месца Свіслач, што казацкія патрулі часта падыходзяць з Мсцібава пад Свіслач, аднак ніводны дагэтуль яшчэ не быў у Свіслачы, бо ўчора раніцай мой чалавек выехаў адтуль.

Даны ў абозе пад Шарашова 1794 года жніўня 21 дня.
Казімір Рушчыц

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 69

№ 92. 22 жніўня. Рапарт К. Рушчыца К. Серакоўскаму

Учора вечарам атрымаў ад цябе, генерал абывацель, ардананс, пасля чаго сёння ранкам вырушыў на Кобрын з брэсцкай міліцыяй пяхотнай і маёй кавалерыяй. Перад тым аддаў пад стражу генерал-маёра Ваўкавыскага павета абывацеля Сегена арыштантаў, прысланых з твайго, генерал абывацель, абозу, на што ўзяў рэверс. Далучаю ліст у копіі з паведамленнем у ім абывацелю

Кулакоўскаму пра абароты Масквы, а таксама прашу мець ласку паведаміць мне аб сваіх пераходах, каб не адхіліцца ад тваёй калоны.

Рабілася ў абозе пад Шарашова 1794 года месяца жніўня 22.

Казімір Рушчыц, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 73

№ 93. 24 жніўня. Акт апраўдання благанадзейнасці яўрэяў Моталя і Межырэчча

Мы, ніжэйпадпісаўшыяся, даем заручэнне генерал-маёру, камандуючаму корпусам абывацелю Серакоўскаму ў тым, што вызваленыя з арышту жыды, родам з месца Моталя, Іцка Шломавіч, Завель Абялевіч, Лейба Шмуйлавіч і родам з месца Межырэч Берка Хаймовіч пад час кватэравання ў Пружанах корпуса пад камандай таго ж генерала нікуды не будуць выязджаць, з'яўляцца і прадстаўляцца па кожнаму вызаву каманды. Усё гэта ў выпадку парушэння пад адказнасцю з асоб і нашых маёнткаў заручаецца і падцвярджаецца подпісам нашых рук.

Даны ў Пружанах дня 24 жніўня 1794 года (Без подпісу)

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 78

№ 94. 26 жніўня. Адказ упаўнаважанага Я. Гараіна К. Серакоўскаму

З Брэста 26 жніўня 1794 года

Маю гонар адказаць на жаданні абывацеля генерала камандуючага ВКЛ. Паколькі абілечванне фуража і жыўнасці ў Брэсцкім ваяводстве і Кобрынскім павеце цалкам даручана камісару абывацелю Нямцэвічу, то таго

камісара, пры абозе зараз будучага, мусіш абавязваць ты, абывацель генерал. Што да сітуацыі з коннымі кантаністамі, то толькі што атрымаў загад Найвышэйшага начальніка даць яму 1000 коней. У выкананне часткі гэтага, пасылаю яму некалькі соцен коней у Варшаву, роўна як і пешых кантаністаў. Тых жа коннікаў і пяхоту, якіх выберу ад цяперашняй даты, не замаруджу прыслаць абывацелю генералу. Гэтаксама высылаю сабраныя грошы, якія тут маюцца. Перадаю данясенне, прысланае сёння з Ратна абывацелю генералу. Той жа момант пасылаю ў той бок для пераканання. Поўны ўпэўненасці, што клапатлівыя намаганні абывацеля генерала не дазволяць непрыяцелю спыніць у тым ваяводстве зграмаджэнне збройнай сілы, роўна як і нарыхтоўку жыўнасці, ад якой залежыць поспех войска самога абывацеля генерала. Маю гонар заставацца з усім шанаваннем Гараін, наместнік рады нарадовай.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 83

№ 95. 26 жніўня. Два рапарты К. Рушчыца К. Серакоўскаму

Рапарт. Гэтым момантам атрымаў паведамленне ад пасланага да Дзівіна (чалавека), што 3000 Масквы павярнула з Любашова на Ковель і, пэўна, ужо сёння ў Ратна, адкуль пойдуць на Брэст і Кобрын. Роўна і ад Мінска памыкаюцца на Кобрын. Я заўжды ў вялікай асцярожнасці. З брэсцкай пяхотай буду мець шмат цяжару, з якога больш 80 штук нягоднай да ўжытку броні. Май ласку, генерал, прыслаць 100 коней кавалерыі, каб адразу засланіць пяхоту. Пароляў і адказаў не маю.

Даны ў Кобрыне 1794 года месяца жніўня 26 дня.
Казімір Рушчыц, генерал-маёр

Рапарт. Пра капітана Лойку, ляжачага хворым пасля разгону кобрынскіх касінераў у міхайлаўскай карчме,

захопленага маскалямі, вывезеным за Слонім і там памершага, распавёў адзін чалавек, які вярнуўся ў Брэст і які мусіў усюды прабірацца праз маскоўскія каманды. Усюды яго бараніў пашпарт, які яму выдаў на вольны пераход генерал Дэрфельдэн. Калі той чалавек сёння праходзіў Кобрын, то я цікавіўся ў яго пра абароты непрыяцеля і даведаўся, што ўся калона Дэрфельдэна і Зубава, стаячая пад Ражанам, збіраецца ў марш часткай на Слонім, а часткай праз Беразу на Брэст. Нават самі маскалі яго моцна запэўнялі, што нападуць на Брэст. Дадаў таксама і тое, што сам бачыў 5 насыпаных вялікіх магіл забітых пад Слонімам маскалёў. Аб чым паведаміў у першым маім рапарце аб маскалях у Ратна, тое ж і зараз (паўтараю).

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 84, 86

№ 96. 27 жніўня. Рапарт К. Рушчыца К. Серакоўскаму з Кобрына

Атрымаўшы а палове 12-й гадзіны начы прысланую з нарачным чалавекам тваю, генерал абывацель, экспедыцыю, зараз жа адказваю, што яшчэ не маю рапарта ад палкоўніка Ляпарскага, якога я паслаў вечарам пад Ратна. Спадзяюся, што зробіш ласку прыслаць мне кавалерыю, якую я прасіў, і хаця б адзін батальён з гарматамі. Выслаў у той бок патруль у складзе 24 чал. Акрамя таго, там мае шпікі, якія сочаць за кожным абаротам руху непрыяцеля і мне аб тым штодня даносяць. А я са свайго боку не пагрэбаю аб усім паведаміць табе, генерал абывацель.

Даны ў Кобрыне 1794 года месяца жніўня 27 дня.
Казімір Рушчыц, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 88

№ 97. 28 жніўня. Два рапарты генерала С. Макраноўскага К. Серакоўскаму

Не саромся, мой каханы генерал, што не было магчымасці працідзеяць насоўванню на Брэст корпуса Дэрфельдэна. Лепш памятай, што вельмі далёка ад Грабоўскага, якога зараз не магу адправіць, бо я думаю паслаць яго на нейкі час на Нёман для дапамогі адступаючаму Стэфану Грабоўскаму. Чакаю, каханы генерал, частых данясенняў пра твае абароты. Застаюся назаўсёды тваім сябрам. Здаецца мне, што калі ты станеш у Кобрыне, то будзеш у стане абараніцца ад непрыяцеля і пайсці на Брэст. С. Макраноўскі. Дня 28 жніўня 1794 года з Беластока

Пасылаю табе, генерал, копію толькі што атрыманага загаду ад Найвышэйшага начальніка. Пасяшаюся да цябе, але старайся згодна з тым наказам выбраць такую пазіцыю, каб разам сачыць і за маскоўскай калонай і за цэсарскім войскам. Знаю як цяжка выканаць гэта.

С. Макраноўскі з Беластока 28 жніўня 1794 года

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 94, 95

№ 98. 28 жніўня. Ліст падпалкоўніка М. Ціхоцкага К. Серакоўскаму

Абывацель генерал! Узняўшыся пасля хваробы, еду да цябе выконваць абавязкі. Маю гонар адаслаць уручаную мне экспедыцыю з Варшавы для генерала разам з 4 патэнтамі ў 4-ы полк лёгкай кавалерыі ВКЛ. Май ласку, генерал, загадаць абвясціць палкоўніка Мікалая Бранікоўскага генералам камандуючым войска Рэчы Паспалітай згодна з патэнтам Найвышэйшага начальніка ад цяперашняга 25-га дня. Таксама і мяне, маёра Міцуту Ціхоцкага, на падпалкоўніка ў каронным войску таго ж дня жніўня 25-га ў якасці ад'ютанта ягомосці Макраноўскага. Здаецца, ты памятаеш яго, шаноўны генерал.

Задаволіўшы гэта, застаюся з належным шанаваннем генерала Міцута Ціхоцкі.

Зрабі ласку, генерал, аддаць зараз лісты да Прота Крулікоўскага і Брута

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 96

***№ 99. 28 жніўня. Штат кобрынскай кавалерыі і брэсцкай міліцыі ў абозе пад Кобрынам** (стар. 141)*

№ 100. 29 жніўня. Данясенне рэктара брэсцкіх школ К. Серакоўскаму

29 жніўня 1794 года з Алтуша.
Рэктару брэсцкіх школ, ксяндзу.

Шаноўны мой генерал. Паведамляю, што ўчора каля апоўдня ад тых нечаканых гасцей завітала 8 рускіх казакоў у мундзірах блакітнага колеру. Адразу ўзялі з сабой 4 фурманкі і пыталіся адразу, ці выпраўляліся рэкруты. Потым з вялікім крыкам патрэбавалі паказаць паперы, а калі ім паказалі гаспадарчыя рэестры, самі з тойжа лаянкай рушылі ў астатнія пакоі, загадалі адчыніць замкнёны гардэроб, тут жа адбілі шкатулку і забралі адтуль грошы, потым забралі куфэрак, увесь запас паперы і што толькі знайшлі, потым ачысцілі амбары, забралі прыгатаваныя на ваенную выправу 18 пар ботаў, вялікія скуры і *(неразборліва —**Я.А.**)*, саланіну і распалены тлуст. Канешне, візіцёры пры паборы выклікалі мяне паказаць паперы і дамагаліся грошай. У рэшце рэшт яны замкнулі ў стайні майго пісара, білі яго палкамі і пыталіся пры мне, дзе схаваны паперы і грошы. І гэтак амаль 3 гадзіны. Нарэшце прымусілі напісаць загад на пастаўку фуража, або 116 корцаў мукі, 200 корцаў аўса, 20 корцаў круп, 1050 боханаў хлеба. Сяляне нашы ўсім нутром рады гасцям: як толькі паказваюцца нашы жаўнеры, то яны пакідаюць хаты, а як толькі паказваюцца маскалі, то яны з радасцю вяртаюцца ў двор і толькі глядзяць праз паркан, што з намі робіцца.

Штат кобрынскай кавалерыі і брэсцкай міліцыі ў абозе пад Кобрынам 28 жніўня 1794 г.*

Іа пасылках чалавек)	штаб	афіцераў	намеснікаў	таварышаў	унтэр-афіцэраў	трубачоў	шаранговых	коней	Усяго, чал.
Y патрулях	2	1	1	25 / 2			7 / 74	32	32 / 184
Y камісарыяце				34 / 2			15	53	53 / 4
Іад Брэстам	— / 1			2			8		10 / 2
Іад Бугаевам			1	4			1 / 24		6 / 30
астаецца ў службе	3 / 5	2 / 6		13 / 20	2 / 2	3	8 / 190	92	31 / 481
Усяго: *Кобрынскай кавалерыі*	5	3	2	78	2	3	39	177	132
Брэсцкай пяхоты	6	8		22	2		290		788
Разам	**11**	**11**	**2**	**100**	**4**	**3**	**329**	**177**	**820**

* У лічніку — кобрынскай кавалерыі, у назоўніку — брэсцкай пяхоты

Крыніцы: РДВГА, ф. 846, воп. 16, с. 2728, ч. 2, л. 106

Таму яны заўжды спазняліся і ўпарціліся даваць рэкрутаў. Мы даўно прасілі светлую камісію аб вайсковай дапамозе для прывядзення ў паслухмянасць упартых сялян, аднак гэтай дапамогі не дачакаліся. Пашлі адразу гэта для ведама светлай камісіі. Піша ягомосць пана добрадзея ніжэйшы слуга Г. Мілеўскі.

Гэтыя казакі, як можна меркаваць, падаліся назад у Тураў

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 99адв.—100

№ 101. 30 жніўня. Ліст генерала П. Грабоўскага К. Серакоўскаму

Абывацель генерал. Толькі што атрымаў рапарт аб тым, што паблізу Руды паказалася частка Масквы, якая выйшла са Слоніма ў бок Ратна. Дагэтуль не маю весткі, ці пакінулі каманды Слонім. Паведамленне генерала Макраноўскага праз кур'ера пра маё акружэнне паміж Грынкамі і Рудой не зусім вартае. Калі б ён затрымаўся ў Грынках, то я магу лёгка адысці ад Руды. Калі непрыяцель кіне Грынкі і стане ў Рудзе, то я адыйду з яе ў Белавеж, а дакуль пайду, яшчэ не ведаю пры такім вялікім аддаленні ад корпуса генерала. Гэта мэта майго такога рашэння. Абывацелі тут галодныя, абыякавыя і напужаны суседствам моцнага непрыяцеля. Дабіваўся пад артылерыю 10 коней, але ледзь 5-ці дапрасіўся. Гэтак ва усім: каронная гвардыя рушыла, шаранговыя пачынаюць уцякаць. Калі давядзецца сустрэцца з непрыяцелем, то не спадзяюся, што выведу нават палову людзей. Гэткая карысць ад рэкрутаў, якіх, як не кармі толькі, а супраць непрыяцеля яны непатрэбныя.

Не разумею, чаму генерал учапіўся за Брэст. Пакуль мы будзем бараніць гарады, да той пары нас саміх ганяць будуць. Калі б мы занялі ўсім нашым корпусам белавежскую пушчу, то нас цяжка было б збіць там, дзе

адзін пастарунак можа падтрымаць другі. Такім спосабам можна было б пагражаць Дзярэчыну, усяму гродзенскаму наваколлю, частцы Брэста і Ваўкавыску. Нарэшце, няхай пан мяркуе як лепей, толькі няхай не дапусціць, каб мяне адрэзалі, чаго я больш баюся, чымсці рашэння маскалёў атакаваць Волю. Калі з генералам Макроноўскім добрая камунікацыя, то прашу перадаць яму гэты ліст, бо я мяркую, што ён яшчэ пры калоне генерала. Калі ж гэта не так, то прашу даць мне рэзалюцыю. Чакаю выпадку чыніць верна.

Даны ў абозе пад Грынкамі 30 жніўня 1794 года. *Павел Грабоўскі*, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 103

№ 102. 31 жніўня. Пахвальны ліст Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму

Атрымаў, генерал, твой рапарт. Добра зрабіў, што не пайшоў за Дэрфельдэнам. Зараз пішу да генерала Макраноўскага, ад якога будзеш чакаць наказаў. Будзь здаровы. Тадэвуш Касцюшка. 31 жніўня 1794 года.

Прыпіска: Добра зробіш, калі станеш з гэтага боку Брэста, або ад Варшавы

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 102

№ 103. 1 верасня. Стан корпуса К. Серакоўскага пад Кобрынам (стар. 144)

№ 104. 3 верасня. Ліст С. Макраноўскага К. Серакоўскаму з Камянца

Даношу табе, генерал, што атрымаў ардананс Найвышэйшага начальніка маршыраваць з тваёй калонай пад

Стан усяго корпуса пад камандай генерал-маёра К. Серакоўскага пад Кобрынам 1 верасня 1794 года

	Галоў		Усяго галоў	Коней	
	у службе	хворых		баявыя	цяглыя
Генерал-маёра (штаб)	4		4	4	44
Інжынерныя	6		6		9
Артылерыя каронная	204	12	216		346
Артылерыя літоўская	35	3	38		30
Стральцы					
Ціхоцкага і Сакальніцкага	105	6	111		9
Стральцы кобрынскія	90	7	97		10
Гвардыя конная каронная	395	12	407	377	39
Кавалерыя нарадовая	153	5	158	158	30
III полк пярэдняй варты ВКЛ	255	24	279	278	30
IV полк пярэдняй варты Кароны	34	1	35	34	7
IV полк пярэдн. варты ВКЛ	154	27	181	174	84
V полк лёгкаконны	224	11	235	229	57
Полк Казаноўскага	308	6	314	313	46
Кавалерыя драгічынская	66	6	72	72	
Кавалерыя кобрынская	137	3	140	174	10
Гвардыя пешая каронная	267	7	274		34
V рэгімент фузілераў	632	21	653		45
XV рэгімент	251	10	261		28
XVIII рэгімент	623	115	738		66
Батальён Кралікоўскага	403	63	466		57
Батальён Рафаловіча	223	37	260		37
Міліцыя брэст-літоўская	302	24	326		26
	4871	400	5271	1813	1044

Сапраўды знаходзіцца гармат рознага калібру штук: каронных 26, літоўскіх 2, усяго 28, з якіх пры кожным батальёне па 2 штукі. Да тых гармат вазоў з амуніцыяй і зарадамі — 35. Арыштантаў 8. Прыбыло 9.

РДВГА, ф. ВПА. с. 2728, ч. 2,

Варшаву. Гэта так далёка, што пад інфантэрыю мне загадана браць фурманкі. Выходзь раніцай і паведамі мне якім шляхам пойдзеш, каб ведаць, дзе з табой ранкам або апоўднем з'ехацца. Прашу, мой генерал, не выдавай, што на Варшаву маршыруем.

Даны ў Камянцы-літоўскім дня 3 месяца верасня 1794 года

Макраноўскі, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 113

№ 105. Копія загаду Т. Касцюшкі генералу С. Макраноўскаму

Копія ліста Найвышэйшага начальніка ад даты 3 верасня напісаны

Адпісваю на рапарт, прысланы мне праз генерала Грабоўскага. Паведамляю шчаслівую навіну, толькі што атрыманую з Вялікай Польшы. Уся гэта правінцыя ўжо паўстала, выбіла прусакоў з некалькіх гарадоў, спаліла іхнія магазіны і захапіла амуніцыю. Аднак, здаецца, і 1000 нядрэнна для нас, а даверам абяцаю не памыкацца. Таму, узмацніўшы наколькі можна дывізію генерал-маёра Серакоўскага і тую, якой камандаваў генерал-маёр Хлявінскі, скіруйце тыя сілы згодна з абставінамі на паражэнне непрыяцеля і знясіленне яго.

Даны як вышэй

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 114

№ 106. 4 верасня. Ліст Я. Нямцэвіча К. Серакоўскаму з-пад Рэчыцы

Шаноўны абывацель і шаноўны генерал!

Пасылаю ліст з Улодава ад тамтэйшага радцы месца. У ім весткі аб цэсарскім войску, хаця і не малаважнай надзейнасці. Не было моманту, у які б абывацелі не

асыпалі мяне скаргамі на затрымку фурманак у
каронным камісарыяце па некалькі тыдняў. Не магу
цалкам запусціць гэтую аказію. Той крыўдзе лепш
услужыць і таму, шаноўны генерал, прапаную табе, май
ласку загадаць, каб атрыманыя фурманкі былі заменены
фурманкамі па білетах з месцаў блізкіх да абозу. Наш
магазін збіраецца патроху, але не можа ён доўга расці, бо
ўсё меней застаецца месц, на якія ўся надзея ў тым. Таму,
шаноўны генерал, калі ў твае планы ўваходзіць хутка
пакінуць Кобрын, то няхай жыўнасць таго павета зараз
паслужыць тваім патрэбам, а нашы, тутэйшыя, запасы
няхай застануцца надалей.

Даны ў Рэчыцы-палескай 4 верасня 1794 года. *Ян Нямцэвіч*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 111

№ 107. 5 верасня. Ліст С. Макраноўскага К. Серакоўскаму з Турна

Адказваю на тваё, генерал, учарашняе пытанне да мяне. Цалкам ухваляю перамяшчэнне галоўнага лазарэта ў Вуграва. Забяры з сабой часткі палкоў Ахматовіча і Хлявінскага, бо іх не даваў Найвышэйшаму начальніку. Я з цэлай калонай пайду пад Варшаву. Распарадзі марш так, каб яны заўсёды былі ў ар'ергардзе за некалькі міляў ад калоны. Высылаю загад Брэсцкай парадкавай камісіі аб фурманках пад пяхоту. Я сёння еду ў Брэст.

Даны ў Турне дня 5 верасня 1794 года. *Макраноўскі*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 115

№ 108. 6 верасня. Паведамленне Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму аб здымцы мясцовасці за Бугам

Капітан корпуса інжынераў кароннага войска, ягомосць пан Гаўлоўскі, складаўшы карту памежжа паміж Бугам

Генерал Караль Серакоўскі.

і Віслай, падаў мне копію адной часткі той карты, або ад
Буга да Краснага Става. Я даў рэверс *(подпіс на адвароце
— Я.А.)*, што нікому не буду перадаваць копіі і не дазволю
перакапіраваць.

Даны ў Любліне 6 верасня 1794 года. *Тадэвуш
Касцюшка*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 120

№ 109. 10 верасня. Рапарт К. Рушчыца К. Серакоўскаму

Абывацель генерал і добрадзей

Маю дакладныя і горкія весткі аб палкоўніку 7-га
рэгімента Стэфане Грабоўскім, які са сваім батальёнам,
палком Кіркора і з 1000 касінерамі выйшаў у Літву на
Мінск. Па тым паведамленні, генерала абывацеля
напаткаў досыць нешчаслівы канец сваёй выправы, бо
непрыяцель, атачыўшы яго з усіх бакоў, прымусіў здацца,
адных паланіў, другіх, параспытаўшы, распусціў. Сам
Грабоўскі тымі ж днямі ўцёк з 4-ма афіцэрамі ў Беразу
Картузскую. Гэтая вестка менавіта ад тых. Не хачу аднак,
каб гэта ад мяне першага паходзіла. Зрабі ласку,
абывацель генерал, не афішыруй, што атрымаў ад мяне.
Спадзяюся, што яе раскажа сам Райскі, аднак раз паміж
імі ўмешваецца сваяцтва, то мабыць і ён не захоча быць
данасіцелем. Тут у нас зноў спакойна. Масква на адным
месцы трымаецца, менавіта ў 7 мілях ад Кобрына за
Антопалем. Учора памёр пакінуты пры лазарэце фельшар,
нягледзячы на моцныя намаганні тутэйшага мясцовага
лекара. Хворыя маюць розныя выгоды і заўсёды
папраўляюцца з дапамогай фельшара.

З належным шанаваннем ніжэйшы слуга *Казімір
Рушчыц*, генерал-маёр. 10 верасня 1794 года з Кобрына

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 117

Другі рапарт К. Рушчыца ад таго ж дня.

Шаноўны абывацель і генерал-маёр!

Паколькі палкоўнік абывацель Ляпарскі выязджае да Найвышэйшага начальніка, пасылаю паўторна рэкамендацыю яго на палкоўніцтва. Разам далучаю рэкамендацыю на палкоўніка абывацелю Феліксу Рушчыцу, а на маёра — абывацелю Гераніму Верашчаку, абодвум у кавалерыю. Зрабі ласку, абывацель генерал-маёр, з усім тым падацца да Найвышэйшага начальніка, каб яны маглі атрымаць патэнты згодна таго хадайніцтва. А заадно, будзь ласкавы, не забудзь пра мой інтарэс, табе, абывацель генерал, прапанаваны ў Слоніме. Аб чым просіць з належным шанаваннем абывацеля генерала ніжайшы слуга *Казімір Рушчыц*. Дня 10 верасня 1794 года з Кобрына.

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 127

№ 110. 14 верасня. Два рапарты К. Рушчыца К. Серакоўскаму з Кобрына

Ледзь толькі я паслаў табе, абывацель генерал-маёр, рапарт з данясеннем аб тым, што здарылася ў Дзівіне, як пасланы пад Дзівін таварыш нечакана прынёс мне наступную вестку. Пасля таго, як маскалі пакінулі Дзівін, ротмістр Струцінскі, камандуючы высланым патрулём, паслаў каманду з 60 людзей на разведку за ўцякаўшым непрыяцелем. Як толькі яны выйшлі за Дзівіна, як адразу былі акружаны адусюль непрыяцельскай сілай да 200 казакоў з кавалерыяй, схаванымі ў лесе, і, як можна было бачыць, яшчэ і пяхотай пад лесам. Тая каманда, няздольная бараніцца, мусіла рэціравацца да патруля, а не будучы ў стане стрымаць непрыяцеля разам з патрулём, упяклі ў Кобрын. Непрыяцель праследваў іх каля мілі, але потым затрымаўся. У той акцыі найбольшыя страты — 5 стральцоў — у абывацеля Казноўскага з-за худых коней і недахопу зброі. Той

патруль сюды яшчэ не прыбыў. Я для маёй бяспекі трымаюся ў гатоўнасці да маршу.

Даны ў Кобрыне 14 верасня 1794 года. *К. Рушчыц*, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 129

(Другі) рапарт.

Атрымаўшы ад патруля з-пад Дзівіна рапарт, добра ведаю, што маскалі былі ў Дзівіне колькасцю *(неразборліва — **Я.А.**)*, дзе выбіралі фураж. Аднак з падыходам пасланага патруля, напалоханыя начным нападам на сваю пяхоту і стрэлам, яны не бавіліся ў месцы больш гадзіны і, забраўшы з Дзівіна бурмістра, эканома і яшчэ 3-х жыдоў, памкнуліся ў Ратна, адкуль вярнуліся за 30 корцамі фуражу, які ў Дзівіне забраў наш патруль. Пакуль што ад Пінска няма непакою.

Даны ў Кобрыне дня 14 верасня 1794 года. *К. Рушчыц*, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 130

***№ 111. 14 верасня. Стан корпуса К. Серакоўскага пад Цірaспалем** (стар. 150)*

№ 112. 15 верасня. Рапарт генерала Княжэвіча К. Серакоўскаму

Маю гонар паведаміць абывацелю генерал-лейтэнанту, што маршырую ў Брэст з калонай пяхоты. З набліжэннем падам рапарт аб колькасці галоў. Гэтай ноччу кватэрую пад Станіслававым і як толькі можна буду прыспяшаць свой марш па сядлецкаму тракту. Няхай абывацель і генерал-лейтэнант з ласкі сваёй мне паведаміць, ці дабраўся да яго мой рапарт.

Даны ў абозе пад Станіслававым 15 верасня 1794 года. Княжэвіч, генерал-маёр

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 132

14 верасня. Стан корпуса К. Серакоўскага пад Цiраспалем

Каманды	Чалавек		Коней
	у службе	усяго	
Генерал-маёра (штаб)	3	3	35
Інжынераў	7	7	10
Артылерыі	192	217	346
Стралкоў каманды Ціхоцкага	43	44	6
Стралкоў палка Сакальніцкага	57	62	3
Стралкоў кобрынскіх	82	96	10
Гвардыя конная каронная	391	405	414
Кавалерыя нарадовая	150	158	188
Полк Хлявінскага	256	263	256
Каманда палка Вірцембергскага	34	35	41
Полк Ахматовіча	159	185	262
Полк Кёнінга	224	235	275
Полк Казаноўскага	307	312	355
Кавалерыя драгічынская	68	73	72
Гвардыя пешая каронная	339	349	34
5-ы рэгімент фузілераў	667	751	45
13-ы рэгімент Ціхоцкага	280	291	28
18-ы рэгімент Красінскага	664	831	67
Батальён Кралікоўскага	490	552	58
Батальён Рафаловіча	514	597	51
	4927	**5466**	**2556**

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 131

№ 113. (15—16 верасня). Ліст Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму

Піша мне Агінскі з Сакалова пад учарашняй датай, што туліцца паміж Венграва і Сакалова. Таму абдумай, васпан, абы яны не трапілі ў руку непрыяцеля. Перад наступаючым непрыяцелем, васпан, пасувайся на Варшаву асцярожна, так, каб непрыяцель не разбіў ушчэнт тваю каманду. Старайся, васпан, хутчэй адправіць да Варшавы жыўнасць і фураж колькі можна, бо гэта нам тут вельмі патрэбна. Генерал Гаусман спешна маршыруе ў Сядлец і мае загад злучыцца з васпанам. Прашу выбіраць заўсёды карысную пазіцыю і хаця бы толькі нанач засланіць батарэямі, каб не толькі адбіцца ад непрыяцеля, але па абставінах і пабіць яго. Калі пад Венграва тыя самыя гарматы, што прызначаны ў Гродна, то няхай іх хутчэй адправяць хаця б для бяспекі *(неразборліва — Я.А.)*

Тадэвуш Касцюшка

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 133—133 адв.

№ 114. (8—19 верасня). Чарнавыя запіскі А. Суворава аб паходзе з Нямірава ў Крупчыцы

Рэляцыя.

Ея императорскаго величества часть войск выступила из Немирова 14 числа августа к Варкович до 300 верст. Прочия же ранее от 350 до 400 все прибыли к назначенному там рандеву 22-го числа, где более 2-х суток перепекали и сушили хлеб и, запасшись оным почти на месяц, продолжали марш на Луцк до Ковеля по худой от дозжей или весьма пещаной дороге 176 верст. Там соединились с летучим корпусом генерала майора и кавалера Буксгевдена 28 числа. В ожидании обозов простояли тут свыше двух суток и соединились на тракте при местечке Выже с вышедшим навстречу вторым

летучим корпусом. Маршировали над 92 верст худшею прежней дорогою, где бригадир и кавалер Исаев разбил казаками неприятельскую партию. Тож сильнее при Кобрине, при чем неприятель потерял до 500 конных пленными. С нашей стороны убит пятидесятник, ранены войска Донского полковник Борис Греков и два казака. При Кобрине, отошед от Дивина 35 верст, войски расположились 4-го пред полднем и назавтра по полудни в 5 часов оказались неприятеля две партии сот по пяти конницы против нашего праваго крыла и фронта в отдалении верст 7-ми. Как мы до сего шли скрытно и неприятель кроме казаков не видал, приказано было бригадиру и кавалеру Исаеву не вступать в бой, а только задержать, что он и учинил. При наступлении же ночи схвачен был один пленный, который показал, что Сироковский с инными генералами и, по прежним известиям свыше 16000 при 28-ти орудиях, выступя из-под Бреста, расположился при монастыре Крупчиц от Кобрина 15 верст в намерении нас на другой день атаковать. Сей мятежнической корпус состоял из лутчих их войск знатной части старых коронной гвардии и иных полков исправно выэкзерцированных.

В те же сутки на 6-е число по полуночи в 2 часа, отошед 5 верст, переменили мы позицию и стали на разстоянии в линию на выгоднейшем месте. Не приметя у неприятеля никаких важных движений, определено было его атаковать! Выступя в 7-м часов утра, на трех верстах марша перешли мы реку Мухавец, конница вброд, пехота и артилерия по мосту. В 8 часов были в виду неприятеля в разстоянии 3-х верст и разогнулись из колонн в линии и формировали части атаки. Неприятель начал полчаса ранее пальбу. Наша полевая артилерия открыла огонь в 9,5 часов. В тож самое время пехота, переправившись чрез топкой ручей, впадающей в Мухавец, в то самое время вступила в атаку в 10 часов, а конница леваго фланга за ней спустя 1/4 часа, а казаки ударили на передовую

неприятельскую конную партию и прогнали чрез деревню Перки до их стану. Праваго же фланга, перейдя два раза речку Мухавец, последний загативши песком. По одолении непреборимаго местнаго положения, одержана полная победа. В 6-м часу по полудни, как Ваше сиятельство изволите усмотреть из плана баталии и рапорта генерал-поручика и кавалера Потемкина.

РДВГА, ф. 43, с. 101, л. 3—4 адв.

№ 115. 2 кастрычніка. Рапарт А. Суворава П. Румянцаву-Задунайскаму аб баі пад Брэстам

Сентября 8-го числа в час по полуночи поднялись мы из сигналов из-под деревни Трещин, перешли вброд два раза речку Мухавец и в 5-м часу реку Буг, скорым шагом построили наши линии. Неприятель быстротою наших движениев был удивлен.

Сероковский хотел отступить накануне пред вечером, но, от только часть наших козаков, не думал быть всему войску и удержан был Гораином, так называемом народным пленипотенциалом. Между тем они сильно заняли Бржесц и как выходы его, так и мост чрез Буг на Терешполь оградили пушками во ожидании нашей атаки чрез сей город и отнюдь не чрез брод. Однако после положили учинить отступление. 8-го числа в 7 часов утра и с вечера отправили обозы. Гораин, усмотря издали наши войска, бежал.

Неприятель встретил нас пушечною пальбою. Мы не отвечали. Под оною вмиг построил три колонны толстотою двух взводов. В интервалах между ими разделил артиллерию и начал ретираду. Маневры его были живы и проворны при непрестанном пушечном и ружейном огне, с отчаянным боем. Генерал-майор Исленьев, отправляя должность при мне генерала дежурнаго с отличными трудами и похвалою, особливо в

обеих баталиях при Крупчице и Бржесце, пособил весьма победам его благоразумными рапортами. Сей безпримерной храбрости генерал с левым крылом нашей кавалерии тотчас в карьер пустился в атаку и изрубил козаков. Под толь неустрашимым бригадиром Исаевым, бывши в двух огнях между колонною и пехотной засады с пушками, которая вся изрублена. Напоследок дорубили и докололи они ея, паки устроенную за деревнею Коршин.

Генерал-майор Шевич в сей день, толико мужеством прославившийся с кавалериею праваго крыла отрезал неприятелю путь в челе и порубил наголову массы двух первых колонн. Генерал-майор Буксгевден, обещевающий в себе великого генерала, нашим операциям много пособил очищением леса егерскими баталионами и побиением в них всех встретившихся. Нашей полевой артилерии только действующия легкия четыре орудия искусным управлением ее офицеров наносили непрятелю знатной урон и разстройку. Когда егерския баталионы в лесу очищали, прекрасно было видеть страшныя неприятелю наши две линии пехоты с полевою их артилериею, следующая вблизи скорым и стройным шагом в резерве за кавалериею. Генерал-поручик Потемкин был всеместной директор атак! Сей муж великих талантов превзошел себя в сей знаменитой день. Рапорт его ко мне, означающий подробность победы, имею честь Вашему сиятельству в покорности моей поднести, как и план сей баталии при Бржесце.

... Баталия, продолжавшаяся 9-ть часов, кончилась совершенною победою по полудни в 3 часа. Нашему урону при сем ведомость. Неприятель почти весь погиб и пленных мало случилось. 30-ть конных при обозе, толикое ж число раненых и до десятка два в сторону тракта к Седлецу отправленных из-под Крупчицы. Отсюда ж не больше семидесяти пеших и частью босых из болот с генералом Сироковским, его дежурным офицером, адьютантом и двумя капитанами ординанцами. Тоже генерал Понятовский. Генерал же Красинский с прочими

погиб. Следующия два дни пехота и казаки с егерями искололи не здавшихся, скрытых в лесах и топких местах.

На 14-е число бригадир Владычин с 2-мя баталионами, пятью эскадронами и двумя стами казаками выступил с неприятельскою артилериею за оставлением здесь 4-х дватцатью четырмя орудиями на Кобрин, Ковель и на Луцк (куда он сего числа прибудет до границы). Тут и пленныя 365 человек, коих с дезертирами было бы больше тысячи. Их и неподозрительныя распущены в домы. Офицеры ж при полковнике Верещаке 13 человек — на реверсы.

АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1836, л. 3—5 адв

Заўвага рэдактара.

Надрукавана: А.В. Суворов. Документы. Т.3. М., 1952. С. 372—375. Там жа змешчана карта-схема бойкі пад Крупчыцамі ў маштабе 1:8400 (100 сажняў), якую зрабіў квартармайстр, падпалкоўнік Пётр Івашоў. Таксама там жа надрукавана і копія арыгінальнага плана боя пад Ціраспалем. Вышэй працытаваны дакумент налічвае 11 расійскіх палкоў, што ўдзельнічалі ў бітве пад Крупчыцамі. Пазней графу А. Сувораву прадставілі фармуляры тых палкоў, праўда без штабоў. З іх вынікае, што пад Крупчыцамі адных радавых і малодшых афіцэраў змагалася 10857 чал. (РДВГА, ф. 43, с. 115, л. 1—10, с. 117, л. 1—390), што ўдвая перавышае сілу К. Серакоўскага. Гэтыя лічбы, тым не меней, патрабуюць праверкі.

№ 116. 1 кастрычніка. Рапарт генерала П. Пацёмкіна А. Сувораву аб баталіі пад Ціраспалем (Брэст)

Его сиятельству, высокопревосходительному господину генерал-аншефу, начальствующему войсками и разных орденов кавалеру графу Александру Васильевичу Суворову-Рымникскому рапорт

Вследствие победы, одержанной над неприятелем при монастыре Крупчиц, о новой и наиблистательной победе, одержанной Вашим сиятельством в околичностях Бржесца, представляю.

Когда приближение ночи остановило после первой победы стремительную нашу погоню за неприятелем, победоносные войски начальства Вашего, утомившись от трудов и бою, приняли покой. В то время по воле Вашего сиятельства раненые все уврачены, пленные призрены, человечество имело все попечение поелику было возможно. Отдохнув 8-м часов, войски на 7-е число выступили в два часа по получи для достижения неприятеля. Следы его покрыты были убитыми коньми и людьми ранеными, а при селе Бульковe след сей пошел за реку Мухавец влево. Имев отдых 4 часа при Булкове, достигли войски наши к ночи до деревни Трещин, разстоянием до Бржесца 6-ти верст, и там под закрытием лесу взято было отдохновение.

В час по полуночи на 8-е число войско паки выступило. Лозунг дан оному - С нами бог. Выполняя предположение Вашего сиятельства, чтоб обойти неприятеля и миновать Бржесц, надлежало принять влево полями троекратно реку под отводною стражею неприятельской. Положение (его) стану с вечера было обозрено и броды найдены. Вскоре по выступлении достигли до броду речки Мухавец, чрез которую при осенении лунного света перешли без малейшего помешательства. Пехота шла водою по колена. Отошед еще 300 сажень, перешла паки рукав Мухавца. Таким же образом продолжали путь далее. На разсвете достигли до реки Буга, которую с большим трудом переходить надлежало. Но какое препятствие сильно остановит войски под Вашим начальством! Тот час козаки и за ними вся конница переехали Буг. Артилерия перевезена, пехота шла в воде выше колена.

При самой переправе наших войск чрез Буг в Бржесце и Терешполе ударили в набат. Как только все войски

перешли Буг, немедленно устроены в ордер баталии, имея конницу на обеих крылах. Правое крыло оной под командою генерал-майора и кавалера Шевича составляли три эскадрона Ольвиопольскаго гусарскаго полку в команде бригадира и кавалера Боровского, 5-ть эскадронов Переяславскаго полку конных егерей под командою бригадира и кавалера Craля, полк Александрийский легкоконный в команде полковника Гижицкого, полк Черниговский карабинерной в команде бригадира и кавалера Поливанова. Левое крыло под командою генерал-майора и кавалера Исленьева, три эскадрона оливиопольских гусар при подполковнике Радуловиче, пять эскадронов Переяславскаго полку конных егерей с премьер-майором и кавалером Кнорингом, Мариупольской легкоконный полк в команде полковника Анненкова, Глуховской карабинерный в команде полковника Текутьева.

Вся пехота под командою генерал-майора и кавалера Буксгевдена, Смоленской пехотный полк и эскадроны Кинбургскаго драгунскаго полку оставлены были к прикрытию обозов, но имели при том повеление, чтоб на разсвете, зближась к Бржесцу, показывать вид к переправе на броды в правой руке с тылу от неприятеля. Горя ревностию к службе и (о)жидая славы, все войско, устроясь в ордер баталии, шло спешно и открыло пред собой неприятельской стан. Неприятель примыкал левым своим крылом к Тересполю, правым - к лесу. Как скоро наши войски устроились, приметно было в неприятельском стану замешательство. Войски наши удвоили шаг в полном строю.

Неприятель, открыв сильную пушечную пальбу, стройно потянулся вправо. Бригадир и кавалер Исаев с козачьими полками, предшествуя с леваго нашего крыла конницы, прислал ко мне донесение, что неприятель отступает. Тотчас приказано козачьим полкам и всей коннице его атаковать и в то же время присланный от Вашего

сиятельства секунд-майор Бурнашов подтвердил, который с сим повелением поскакал к генерал-майору и кавалеру Исленьеву и подполковник, князь Одоевский послан к генерал-майору и кавалеру Шевичу с тем же повелением. Четырем баталионам егерским приказано во весь бег поспешать и генерал-майор и кавалер Буксгевден сам ими руководствовал. Херсонской гранодерской полк за егерями шол поспешно. Азовской и Рижской мушкетерския полки составляли последнюю линию. Локальное положение дало построение войскам лесницей.

Неприятель, чувствуя раны перваго своего удара при Крупчице нанесеннаго, чуждался от новаго бою с войсками под предводительством знаменитаго героя, коего единое имя ужас им наводит. Начальник неприятельских войск Сераковский, устроя пехоту свою в три густыя колонны и каждую из них оградя пушками с прикрытием конницы, спешил занять выгодное место на высоте за деревнею Коршин и на плотине оной, окопанной рвами, устроил три батареи, каждую о четырех пушках и одну из трех колонн, так как и конницу с нею остановя, показал вид к атаке на наше левое крыло.

Тут храбрый генерал-майор и кавалер Исленьев, усмотря неприятельское приготовление, отрядил с подполковником Радуловичем три эскадрона оливопольских гусар и два удела охотников, чтоб подкрепить казачьи войски команды бригадира и кавалера Исаева, которые уже вступили с неприятелем в бой. И в то же время, призвав бога в помощь, приказал полковнику Текутьеву с Глуховским карабинерным полком атаковать левой неприятельской фланг, овладеть батареею и врубиться в пехоту, полковнику Анненкову с Мариупольским полком опрокинуть неприятельскую конницу, обратитца на вторую неприятельскую батарею и, овладев оную, врубится в средину неприятельской колонны, а премьер-майору и кавалеру Кнорингу с 5-ю эскадронами конных егерей атаковать правой фланг колоны и

завладеть третьею батареею, обратясь впереди сам при оных.

Все помянутыя начальники полков и ескадронов единовременно, смотря на предводительствующаго ими генерала, в неприятеля ударили, но были встречены толь сильным огнем, а наипаче залегшею в лесу неприятельскою пехотою при пушках батареи маскированной, что на первой раз несколько остановились. Но храбрый генерал-майор Исленьев, справя в ту ж самую минуту, с вящим жаром и мужеством атаковал и врубился. В самое время сего удара бригадир и кавалер Исаев с козачьими полками и двумя уделами вышесказанных охотников ударил во фланг на неприятельскую конницу, смешал оную и сел на ея плечах.

Неприятель не мог сдержать толь стремительнаго удара, мечем единым наносимаго. Полковник Текутьев с Глуховским полком, врубясь в пехоту, овладел четырмя пушками. Мариупольского полку полковник Анненков, врубясь в неприятеля, овладел одною пушкою и подполковник Радулович с гусарскими ескадронами овладел также пушкою. Тут по левую сторону к деревне скрытая свежая пехота во рвах, незапно открыв огонь, чаяла воспрепятствовать стремлению нашей конницы поражающей, но чрезмерная храбрость в сем случае генерал-майора Исленьева и оказанная штаб- и обер-офицерами и твердость солдат нимало не поколебались, а неприятель, чая нанести нам вред, сам погибнул, оставя на месте кучи побитых, побежал к деревне Коршине, где покушался на возвышенном месте построится.

Пред сим временем мужественный генерал-майор и кавалер Шевич с правым крылом нашей конницы, обскакивая вокруг и замечая неприятельское движение к деревне Коршине и поравняяся с левым атакующим крылом нашей конницы, лишь только усмотрел, что неприятель в стройных колоннах отступает при пушках, имея пред собою и позади знат ную часть конницы и

показывающих вид наступить на него, тот час подался вправо и к лесу ему преградил путъ и тут, зделав разпоряжение, приказал бригадиру Поливанову с полком Черниговским и полковнику Гижицкому с Александрийском легкоконным полком атаковать. Храбрые бригадир и кавалер Поливанов и полковник Гижицкий ударили в неприятеля с таким стремлением и мужеством, что несмотря на жестокой пушечной и ружейной огонь, мгновенно в неприятеля врубились до вступления в деревню и положили на месте груды тел.

Все штаб- и обер-офицеры содействовали найотличнейшим образом, нижния чины храбростию достойною россо ознаменовались. Но, к сожалению, оба сии храбрые начальники своих полков ранены. Отличной и всегда храброй бригадир Поливанов ранен картечью в щоку, полковник Гижицкий пулею в ногу.

Потом генерал-майор и кавалер Шевич, быстро взяв перед у неприятеля, выступившего из деревни в порядке колонами, и предводительствуя лично всею линиею сам пред 5-ю ескадронами конных егерей, ударил в переднюю из них, а бригадир и кавалер Боровский с 3-мя ескадронами оливопольских гусар купно на неприятельскую передовую конницу, Черниговской же и Александрийский — во вторую колонну и при ней находившуюся конницу столь быстро, столь стремительно, что неприятель поголовно поражен, потеряв шесть пушек. Третию же колонну, оставшую и принявшую влево, генерал-майор и кавалер Исленьев, с левым крылом конницы ударив, поразил совершенно и истребил. Между тем приказано 4-м баталионам егерей, коими генерал-майор и кавалер Буксгевден предводительствовал, итти с самою поспешностию наперерез чрез близлежащей лес в левой стороне и с ними 4 орудия полевой артилерии для достижения оставшаго неприятеля.

Неприятель, разстроенный, старался сколь быв можно прикрыть свое бегство, удаляяся к деревне Добрине,

придерживаяся к лесу, и хотя мосты, рвы и ограды препятствовали нашим скоро пройтить и вновь его атаковать, но посланные от генерал-майора и сиятельства два удела охотников, подкрепляемые Мариупольским полком и 5-ю ескадронами конных егерей в команде премиер-майора и кавалера Кноринга и 3-мя ескадронами гусар оливиопольских в команде подполковника Радуловича, не замедлили приспеть *(у адным варыянце тэкста — **пройти** — **Я.А.**)* к деревне и сесть на плечах неприятельских в погоне. Тут подоспели из числа отраженных 4-х орудий одна пушка с порутчиком артилерии Протто и другая вскоре за нею с порутчиком артилерии Гинне. Трудность вести артилерию по пашне и усталь коней не позволили скорее подоспеть.

Действием подоспевших пушек нанесли неприятелю величайший вред повсюду, где оный в строениях или в оградах искал убежища. Он был выгнат и поражен и как храбрость сих офицеров, так рвение и замечательное искуство особливаго внимания достойны. Вскоре за ними прибыл с оставшими двумя орудиями старший артилерии порутчик Татаринов и действовал с таким искуством, храбростию и расторопностию, что справедливость требует о нем представить Вашему сиятельству. Когда была подстрелена лошадь под генерал-майором и кавалером Шевичем, то команду на время принял над всею колоною генерал-майор и кавалер Исленьев. Оба крыла конницы, купно имея с собою четыре орудия, несмотря на усталь лошадей, неустанно продолжали гнать и поражать неприятеля до остатку, которой слабо уже отпор делая, оставлял пушки, снаряды и бежал к деревне. Чтоб преградить совсем путь неприятелю, генерал-майор и кавалер Исленьев приказал порутчику Тищенку и штаба Вашего сиятельства секретарю Мандрикину с охотниками, которыми они во все время баталии командуя храбро и искусно везде отличились с неустрашимостию, подкрепляемы Мариупольским полком и 5-ю ескадронами конных

егерей, обойтить деревню *(у адным тэксце — оную — Я.А.)* и старатца впереди неприятеля зажечь строение, а полковнику Новицкому с Черниговским полком, над которым он после раны бригадира Поливанова принял команду, взять с правой стороны деревню и когда будет выходить неприятель ис деревни истреблять полевой же артилерии порутчику Татаринову с его орудиями под прикрытием оставших полков поражать и изгонять неприятеля из деревни картечами.

Таковым наступлением неприятель, видя неизщетное множество убиваемых и неизбежную погибель, бросился из деревни частию кучами, а другия начали бежать стремглав, кидая с себя оружие и амуницию. Первых охотники и посланные полки поражали, последних брали в плен. Кавалерия неприятельская, состоящая из лутчих войск, загната в топкое болото в правую сторону гребли, там погрузя своих лошадей, частию погибла, частию, спешив, бежали с малыми остатками пеших кучек, и легкия войски наши по повелению Вашего сиятельства под командою бригадира и кавалера Исленьева далее за ними гнались.

Подоспевшие в первых Лифляндскаго корпуса егерей 4-й баталион под командой подполковника Ржевского особливою ревностию и храбростию преисполненною и 2-й баталион в команде премиер-майора Жукова, приняв вправо, очистили лес и там кроющавося неприятеля истребили, а Белорускаго корпуса 2-й баталион в команде подполковника Талызина и 3-й в команде подполковника Елчина, по опушке лесу взяв, очистили и прошли до деревни, лежащей вправо, где подполковник Талызин взял в плен двух офицеров и более ста рядовых.

Таким образом совершена сия знаменитая победа. Неприятель, имея корпус до поражения при Крупчице свыше 16000, едва ли до ста пятидесяти человек спасти мог, а генерал Сероковский с Понятовским, двумя офицерами и толиким же числом нижних чинов токмо

бежал. И тем оная знаменита, что единая наша конница начала и совершила толь знаменитую победу. Вся неприятельская артилерия 24 пушки и 2 гаубицы медных и 2 пушки чугунных, всего 28 орудий в наших руках, множество ящиков с снарядами, два знамя корпусные, из коих одно белое для пехоты, а другое светло синее для кавалерии, присланы из Варшавы от народнаго правления. Более же никаких знамен не было. Пленных до 500 человек. Сие число невелико в разсуждении сокрушения всего неприятельскаго корпуса, но ожесточенные наши войски почти нигде пощады не давали. Тут погиб Красинский генерал с полковыми и баталионными начальниками, как и всеми офицерами.

Погоня конницы остановилась при деревне разстоянием от Бржесца 16 верст, отколь, по очевидному Вашего сиятельства обозрению, посланы были козаки еще далее и в подкрепление их 2-й баталион егерей Лифляндскаго корпуса, но оные, малые остатки догоняя, еще последних оттянувших истребили.

РДВГА, ф. 43, с. 101, л. 8—12; АЗПРІ, ф. 79, воп. 6, с. 1836, л. 10—14 адв.

№ 117. 22 верасня. Рапарт К. Серакоўскага Т. Касцюшку з апісаннем боек пад Брэстам

Павінны рапарт

Пасля некалькіх кароткіх рапартоў ужо без трывогі, уласцівай толькі вінаватаму чалавеку, і без страху, які невядомы чалавеку, выканаўшаму ўсе свае абавязкі, аднак са смуткам абавязаны праінфармаваць Найвышэйшага начальніка аб дэталях акцый майго корпуса пад Крупчыцамі і пры маршы з Ціраспаля.

Як толькі мой корпус прымаршаваў з Булкава ў Крупчыцы, я даведаўся, што Сувораў са сваім корпусам стаў у Кобрыне і зараз жа загадаў зрабіць абарону

насыпаннем батарэй калі не для адбіцця, то хаця б для доўгай затрымкі далёка ад сябе мацнейшага непрыяцеля. Дзень 16-ты гэтага ж месяца прайшоў у цэлым спакойна, акрамя невялікіх сутычак паміж фарпостамі і патрулямі, пры якіх без забітых нам дасталіся ў няволю 7 маскоўскіх гусараў. Назаўтра, або 17-га, а 8-й гадзіне раніцы мне паведамілі, што непрыяцель паказваецца здалёку перад фронтам. Войска тут жа імкліва стала ў ружжо так, як і было прадпісана.

Перад сабой мы мелі багністую рэчку Трасцяніцу з грэбляй да карчмы, ля якой была насыпана батарэя з 2 гарматамі пад камандай падпаручніка Арлінскага і якую засланяла дывізія пяхоты з адным батальёнам фузілераў. Правым крылом камандаваў генерал Панятоўскі, левае было даручана генералу Красінскаму. Рэзервам жа кіраваў палкоўнік Кёніг.

У 9 гадзін мы ўбачылі ўжо бліжэй перад фронтам падыходзячую пяхоту, а за яе каркамі і ў разрывах гусар, стральцоў і карабінераў. Напачатку акцыі досыць доўга гукалі нашыя батарэі, паражаючы язду непрыяцеля, аднак без усякага адказу маскоўскіх гармат. Відаць, непрыяцель скарыстаў гэты час для фарміравання калоны за лесам, каб з аднаго боку ахапіць наш правы фланг, а з другога — адрэзаць ад брэсцкага тракта. Убачыўшы, што процьма пяхоты з гарматамі стала набліжацца да батарэі Арлінскага, я загадаў яму паволі адступіць праз грэблю, а для забеспячэння яго загадаў 2 батальёнам рассыпацца на тым баку Трасцяніцы і разіць наступаючага непрыяцеля.

Тут і маскалі пачалі агонь са сваіх гармат. Хаця іх кананада была вельмі частай, аднак наша пяхота як і рэгіменты коннай гвардыі стойка цярпелі сыпаўшы на іх агонь. У гэты момант мне паведамілі, што непрыяцель з вялікім форсам ідзе на наша левае крыло. Убачыўшы, што яго сіла маю шмат перавышае і што ён без цяжкасцяў можа вельмі значна перастроіць калоны, чаго

я не ў стане выканаць, я загадаў рэзерву пайсці туды, а ўсяму корпусу паволі павярнуць улева, цалкам змяніўшы свой фронт супраць непрыяцеля з роўнаадлеглага на касы. Суправаджаў тое ўвесь час моцны агонь з нашых і непрыяцельскіх гармат.

Тут я прыкмеціў, што непрыяцель адразае мяне на левым баку ад брэсцкага тракта на Булкаў і хоча ахапіць наш правы фланг. Я загадаў кавалерыі адступіць паволі і прыкрыць адыход з абодвух бакоў гарматамі. Напачатку самога адыходу непрыяцель пачаў моцны агонь з ручной броні, на які гэтак жа адказала і наша пяхота. Палкоўнік Ахматовіч на чале свайго палка адважна атакаваў напіраючую з левага боку непрыяцельскую кавалерыю і прынудзіў яе павярнуць, аднак на другім баку рэгімент коннай гвардыі кароннай не вынес націску шматлікіх атак непрыяцельскіх эскадронаў і кінуўся наўцёкі разам з 5-м палком Казаноўскага. За імі пайшла язда непрыяцеля. Убачыўшы тое, я даў ардананс падпаручніку Сулкоўскаму вярнуцца з гарматамі і даць з іх агня. Толькі адзін стрэл адвярнуў усю непрыяцельскую кавалерыю, а рэгімент коннай гвардыі самкнуўся, акрамя некаторых, якія ганебна кінулі пляц гонару і панеслі ў сваіх сэрцах страх і трывогу.

Засталося затым працягваць пачатую рэціраду. Конная гвардыя пастаянна нас прыкрывала. І так, маршыруючы ўсю ноч, маючы ззаду лютую сілу праследуючага нас непрыяцеля і шмат запаленых вёсак, 18-га дня я ўкрочыў у Брэст і стаў абозам за Бугам пад Ціраспалем.

У той акцыі, якая з 9-ці раніцы працягвалася 6 гадзін, найбольшую пахвалу заслугоўвае пяхота, стойка вытрымаўшая непрыяцельскі агонь і найбольш захаваўшая парадак пры адступленні. Асаблівую растаропнасць і адвагу прадэманстравалі камандзіры батальёнаў Грабоўскі, палкоўнік Сушкоўскі і падпалкоўнік Фантана. Свае абавязкі выканалі амаль усе афіцэры ад інфантэрыі. Не магу забыць Рудніцкага з батальёна 18-га рэгімента,

які смяротна паранены карцеччу, якому заставалася толькі хвалебна памерці, усё яшчэ заахвочваў сваіх жаўнераў словамі : «Не хвалюйцеся, брацця, маёй смерцю, слухайце афіцэраў, беражыце парадак, авось пераможаце». З такой жа мужнасцю ўпраўлялі рассыпанымі афіцэры артылерыі, а менавіта паручнік Клос, падпаручнік Арлінскі і Бучкоўскі, а падпаручнік Сулкоўскі заслужыў сабе найбольшыя пахвалы сярод іншых сваёй рашучасцю і нічым не запалоханай адвагай. З рэгімента кароннай коннай гвардыі магу гэтак жа вылучыць многіх афіцэраў, прынамсі, падпалкоўніка Гормана і маёра Касмоўскага. З самога абывацельства толькі ўпаўнаважаны Гараін пастаянна быў пры мне ўвесь час сутычкі і мацнейшай кананады. Сярод афіцэраў забіты капітан Краеўскі, паручнік Сушкоўскі, з новаразмеркаваных паручнік 18-га рэгімента Рудзінскі, з рэгімента коннай гвардыі падпаручнікі Крукоўскі і Дрэвінскі. Зрэшты, што да жаўнераў, то колькасць забітых і нягодных параненых яшчэ меней, акрамя рэкрутаў, якія паразбягаліся.

Стаўшы ў Брэсце, я не мог пайсці далей з-за патрэбы даць адпачынак замардаванаму войску, адрамантаваць артылерыйскія рэквізіты і замяніць коней у парку замест забітых. Учора вечарам я даведаўся што непрыяцельская язда цягнецца за намі ў Брэст. Перакананы, што мы не ў стане зусім даць адпор такой моцнай калоне, я разумеў, што нам трэба сысці і, відаць, выйшаў бы тае начы, калі б не бачыў, што пасля бітвы і 14-тыднёвага маршу войску патрабуецца моцны адпачынак, а сапсаваныя рэквізіты немагчыма адрамантаваць за адну ноч. Усё гэта прымусіла мяне ўсю ноч прастаяць у Брэсце. Аднак ранкам пры першым паведамленні патрулёў аб набліжэнні непрыяцельскай язды я зараз жа загадаў войску выступіць і рушыць трактам на Белую. Пачалася рэцірада ў поўным парадку і ўжо здалёку ўбачылі паказаўшуюся пяхоту непрыяцеля. Для большай бяспекі адступлення, я далучыў да рэгімента коннай гвардыі ідучы

ў ар'ергардзе эскадрон 5-га палка і каманду з палка Хлявінскага. *(Абрыў — Я.А.)*

Нечакана тут непрыяцель атакаваў кавалерыю, якая ў частцы змяшалася, часткай разбеглася. Рэгімент коннай гвардыі тут жа ўзяўся арганізоўваць уцякаючых, аднак фузілеры з ар'ергарда кінуліся далей. Батальёны сталі кідаць гарматы і амунічныя вазы і так спрытна ўяджаць, што ранейшы парадак цалкам згінуў. Яго зноў вярнуў паручнік Клос, але авангард пачаў маршыраваць яшчэ хутчэй, так што паміж мной і корпусам узнікла вялікая брэш. У гэты момант гусары напалі на першы батальён фузілераў, закрываўшы левы флаг батарэі, і, нягледзячы на апор, часткова яго рассеклі, часткова рассыпалі. Той жа час раскалоўся батальён Кралікоўскага, які быў на правым флангу батарэі для прыкрыцця яе з абодвух бакоў. Уцякаючая каманда з палка Хлявінскага паламала батальён Кралікоўскага і пацягнула за сабой кавалерыю авангрaда ў такія далёкія ўцёкі, што затрымаць яе не ўдалося ні крыкамі, ні гукам трубы, якія да іх проста не далятал. Ніякім спосабам не ўдалося затрымаць для адпраўкі гармат артылерыйскіх коней, часткай нядоль-ных, а яшчэ больш раскаваных. Раскалоты ўласнай кавалерыяй, батальён Кралікоўскага быў атакаваны гусарамі і зведаў аднолькавы з фузілерамі лёс. Ледзь толькі непрыяцельская язда абрынулася на нашу кавалерыю, як і яна ўся кінулася наўцёкі, ганебна пакідаючы гарматы, якія ўжо не маглі паспець.

У час, калі ўсё гэта адбывалася на правым флангу войска, рэшткі корпуса былі цалкам адрэзаны ад срамотна аддаленага авангарда, так што пасланы да яго з загадам харунжы коннай гвардыі Плятар ужо не мог да мяне вярнуцца. Баюся, што ён застаўся пры авангардзе. Я жа палічыў сваім абавязкам прысутнічаць там, дзе чакаўся рашаючы напад праціўніка.

Разам з афіцэрамі мне ўдалося вярнуць парадак у коннай гвардыі і потым рухаў яе разам з 4 асобнымі ад авангарда батальёнамі пешай каронннай гвардыі

(Рафаловіча і Красінскага) і 2 фузілернымі, стрымліваючы наколькі магчыма напіраючую кавалерыю адзін раз засеўшымі ў ляску фузілерамі, а другі — агнём гармат. Усё гэта рабілася з мэтай даць час праваму крылу вывезці свае гарматы. Непрыяцельская кавалерыя, нарэшце, загарадзіла нам дарогу цалкам, што поўнасцю змяшала пяхоту так моцна, што 200 ахвотнікаў не пасмелі паказаць сябе, як я не спрабаваў з часткай іх прабіцца скрозь непрыяцельскія эскадроны. Такім чынам, мне фатальна засталося адступаць праз балота, а 4 быўшыя пры мне гарматы загваздзіць і ўтапіць. Не без значнай страты мы, нарэшце, пераправіліся сюды праз цеснае балота, адкуль пакрочылі ў Янава толькі з 1000 пяхоты з эскадронаў коннай гвардыі, папярэдзіўшы перад тым на пляцу бітвы генерала Княжэвіча адыходзіць не ў Белую, а да Янава.

У тым апошнім маршы, распачатым а 3-й гадзіне ранка, я страціў 300 пяхоты, замардаванай нязмернымі працамі таго дня. Так што я злучыўся ў Янаве з генералам Княжэвічам, не маючы і 700 галоў пяхоты. Вельмі заняты зборам і фарміраваннем распыленай маёй сілы. Застаецца мне тут жа прадставіць як тых, хто апаганіўся ў бітве, так і тых, хто з гонарам пакінуў наша жыццё або атрымаў шрамы за Айчыну. Падам іх потым Найвышэйшаму начальніку поўна разам з тымі, хто, не выканаўшы абавязку жаўнера, кінуў сваё месца ў канцы бітвы. Пры тых спамянутых батальёнах находзіліся наступныя афіцэры: пры батальёне пешай гвардыі — палкоўнік Гебдоўскі, маёр Рушкоўскі, капітан Гратоўскі, паручнік Ляшчэжынскі, падпаручнікі Костка і Дунін, харунжыя паручнікі Гумінскі, Гадоўскі і харунжы Шчот з 15-га рэгімента. Асабліва асароміліся маёр Кісароўскі з коннай гвардыі, падпалкоўнік Кулеша з батальёна Рафаловіча. У той другой аказіі маем забітымі афіцэраў: маёра Лучынскага з батальёна Рафаловіча, капітана Кушэўскага з 18-га рэгімента, капітана Красінскага з 15-га рэгімента.

Такі вось адказ Найвышэйшаму начальніку аб днях 17 і 18 гэтага месяца, аб тым, што ўсе — рыцары, вартыя імя паляка, што ўдалося б захаваць парк артылерыі і не ўсе страцілі б нашыя гарматы самавольна — і кажу смела — ганебна, калі б не ўцёкі кавалерыі. Прашу Найвышэйшага начальніка назначыць камісію для пунктуальнага высвятлення таго, хто першы пасеяў страх, які потым перадаўся войску і стаў значнай прычынай такога паражэння, і, па-другое,—што да пакарання,—каб усе афіцэры майго корпуса, хто зараз знаходзіцца ў Варшаве, прад'явілі адпускныя, а хто не будзе мець, няхай тады панясе заслужанае пакаранне за пакіданне войска. Што да параненых і забітых, то я падам свой рапарт тым жа днём з погляду на прыбываючых штодня да мяне з розных бакоў і дарог уцалелых.

Даны ў абозе пад Мордамі дня 22 месяца верасня 1794 года

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 139—149. Без подпісу.

№ 118. 20 верасня. Прадпісанне Я. Ясінскага генералу Р. Гедройцу

Па сіле ўказа генерал-лейтэнанта Макраноўскага загадваю гэтым арданансам генерал-лейтэнанту, камандуючаму 1-й дывізіяй Гедройцу ўзяць каманду над калонай пасля ад'езда генерал-маёра Ваўжэцкага і, далучыўшы дывізію генерал-маёра Франкоўскага, стаць у ваколіцы Прэвалкі па абодвух баках Нёмана, зрабіць мост для камунікацыі або пераправы генерала Несялоўскага з яго рэгіментам і часткай кавалерыі, паслаць не меней 300 коней з пяхотай і столькі ж стралкамі з 2-мя 6-фунтовымі гарматамі, акрамя батальённых, у Мяцелы, дзе, стаўшы абозам, сачыць за непрыяцелем, а Бышэўскаму загадаць у той жа час са сваім палкам і 2-мя батальёнамі 7-га рэгімента як мага хутчэй маршыраваць у Гродна, дзе ён атрымае далейшую дыспазіцыю.

Moscicki H. General Jakub Jasinski ... С. 402.

№ 119. 21 верасня. Загад Я. Ясінскага А. Казаноўскаму на выправу

З выразнай волі генерал-лейтэнанта Макраноўскага гэтым арданансам загадваю абывацелю Казаноўскаму з гэтага дня ўзяць у сваю каманду ўсе карпусы і салдат пад любой назвай у Гродна, таксама каманды стралкоў і нарадовую кавалерыю ў Скідзелі, каманду палка ў Саколцы разам з палком Улана, і распараджацца тымі ўсімі камандамі, атрымоўваць ад іх рапарты і мне аддаваць іх. Акрамя таго генерал абавязаны выканаць наступнае: дагледзіць, каб заведуючыя карпуснымі складамі мясцовыя цывільна-вайсковыя камісіі як магу хутчэй запоўнілі іх належнасцю і нічога не выдавалі ніводнаму корпусу без майго выразнага ардананса, каб паліцыя горада спешна працавала над асначэннем рэзерва артылерыі, а таксама, каб чынілася розная паслуга як Цэнтральнай дэпутацыі, так і камісіі ў вайсковых патрэбах. Для гэтага яму дазваляецца ўзяць з Саколкі каманду 1-га палка Улана і Корсака, featureрознага тыпу патрулі пад Гродна і аб усім мне рапартаваць.

Moscicki H. General Jakub Jasinski ... C. 402.

№ 120. 23 верасня. Загад Т. Касцюшкі генералу Арлоўскаму аб высылцы з Варшавы самаадлучных афіцэраў

Тадэвуш Касцюшка, Найвышэйшы начальнік нарадовай збройнай сілы

Загадваю генерал-лейтэнанту Арлоўскаму прысланы мне на апрабацыю прыгаворы, прысланыя сюды са спісамі усіх афіцэраў, якія вяртаюцца без дазволу або ардананса генерала Серакоўскага. На каго жа тут немагчыма падаць спісаў, тых неадкладна выслаць у корпус генерала Серакоўскага, а камандуючы ўжо прыгаворыць каман-

дзіраванага афіцэра за невыкананне свайго абавязку і
мне прышле на апрабацыю.

Даны ў абозе пад Мокатавым 23 верасня 1794 года. Тадэвуш Касцюшка. Згодна з арыгіналам *Арлоўскі*, генерал камандуючы

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 151

№ 121. 24 верасня. Рапарт К. Рушчыца аб стратах кобрынскай кавалерыі

Спіс кантаністаў, заступцаў і ахвотіткаў, збеглых з кобрынскай кавалерыі

Пад час кананады пад Крупчыцамі: таварышаў з коньмі і рэчамі — 6 галоў, шаранговых — 4 гал.

Пад час кананады пад Брэстам: таварышаў з коньмі і рэчамі — 3 гал., шаранговых з тым жа — 21 гал.

З тых жа шаранговых адзін звёў 4-х скарбовых коней, другі — 2 коней, а ўсяго 6 коней. Трэці жа шаранговы забраў каня маёра Верашчакі з ружжом і пісталетамі і ён жа дэзерціраваў з канём, ружжом і пісталетамі харунжага кобрынскай кавалерыі Васілеўскага.

Усяго з-за дэзерцірства страчана таварышаў і шаранговых 47 галоў, усіх коней са скарбовымі і афіцэрскімі — 59 штук.

Казімір Рушчыц, генерал-маёр. Даны ў абозе пад Ходава 1794 года месяца верасня 24 дня

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 152

№ 122. 23 верасня. Уласнаручны загад Кацярыны II князю М. Рэпніну на поўнае ачышчэнне Літвы ад паўстанцаў

Князь Николай Васильевич!

Занятие Ковны отрядом генерал-майора Бенигсена служит новым свидетельством усердия и расторопности

сего отличнаго воина и подтверждает нас в мнении, что сколь скоро по предыдущим предписаниям нашим обратятся все различные части войск, в команде Вашей состоящия, к наступательным действиям, то все они, несомненно, достигнут предметов им предопределенных и не токмо обнимут Литву и черту Вам означенную, но, разместясь по земле сей, занимая нужные посты и учредя взаимное сообщение, истребят все бунты мятежнические и тем самым и всю область сию удержите в спокойствии и повиновении.

А посему желание наше было бы видеть, что Вы отряд сей без содействия от прочих войск, столь удачно очистивших весь берег Немена от Олиты до Ковны и прогнавший мятежников за реку сию, не остав лял плоды подвигов своих, но, пользуясь оными, продолжал бы их далее в споспешествование действий генерал-майора Германа и генерал-поручика князя Голицына. Вам довольно известно, сколь важно для польз наших и сколь желаем мы скорейшаго очищения Самогитии, дабы возстановлением тут повиновения и спокойствия обеспечить оное и в Курляндии и в самих пределах наших. Отступление же от Ковны может подать повод и дать время мятежникам занять важной пост сей.

Ожидание нашествия бунтовщиков к Вильне для поражения их при сем городе не в выгодах наших, ибо несравненно полезнее предупредить их и не перепускать чрез Немен им ожидать при Вильне, давая им захватывать большое пространство земли, чем они только усилиться могут, и допуская их до такого города, который ни положением своим, ни разположением обывателей отнюдь для войск наших не выгоден. Способы же Ваши к повсеместному наступлению превосходны, но токмо умалением способов пораженных и изгоняемых мятежников, но и усилением действующих войск наших прибытием графа Суворова-Рымникскаго в Бржест-Литовский и соединением с ним или с генерал-поручиком Дерфельденом войск наших, бывших за Вислою, чем не

токмо фланг, но и вся линия Ваша и вся Литва закрыта быть может от всякаго нападения от стороны Варшавы. Так что Вы в полной обезпеченности повсюду наступательно можете обратить корпус генерал-поручика Дерфельдена и прочия войски для скорейшаго занятия Гродны, Ковны, Самогитии и всей Литвы, открывая надежное сообщение и с прускими границами, чем, до конца изстребляя мятежи литовские, обезпечите себя и в пропитании, кое Вы из Прусии доставать предполагали.

Не можем мы оставить, чтобы не подтвердить Вам, дабы все сие найдеятельнее к концу приводимо было, ибо скорейшим овладением Литвы преподадите Вы способы и далее устремить подвиги войск наших, столь нужные для обезпечения империи от новых неприятелей. Мы посему за нужное почли дать повеление наше генерал-фельдмаршалу графу Румянцеву-Задунайскому, с коего следует здесь копия не токмо для сведения Вашего, но и для точнаго исполнения в тех споспешествованиях, коих он от Вас требовать будет. В прочем пребываем Вам благосклонны.

На подлинном подписано собственною ея императорскаго величества рукою тако: *Екатерина*.

В Санкт-Петербурге сентября 12-го 1794 года.

С подлинным сверял дежурный бригадир *Мерлин*

РДВГА, ф. 43, с. 100, л. 47—48

№ 123. 24 верасня. Загад Т. Касцюшкі К. Серакоўскаму на перадыслакацыю

Старайся, генерал, быць у (маёй) дырэкцыі, каб Сувораў не наблізіўся да Віслы, як да васпана, для чаго трэба яго апярэдзіць і стаць пад Кохам, заняўшы добрую і моцную пазіцыю, і тады, васпан, станеш гаспадаром месца, куды б толькі не пажадаў павярнуцца. Таксама трэба ўзнаць праз шпікоў - калі ён не заняў Гродна, то тут жа ступаць за ім,

але перадусім, васпан, дабіся таго, каб сам яго апярэдзіў і стаў каля Коха ў лепшай пазіцыі. Дня 24 верасня. *Тадэвуш Касцюшка*

РДВГА, ф. ВПА, с. 2728, ч. 2, л. 153

№ 124. 27 верасня. Зварот Т. Касцюшкі да дывізіі К. Серакоўскага пад Вішневам

Мае брацця і калегі!

Я прыбыў у гэтае месца, каб імем народа падзякаваць тым, хто ў апошняй бітве выканаў свае святыя абавязкі ў імя Айчыны і ўласнай славы, каб убачыць і з радасцю абняць тых, хто шматразова змагаўся побач са мной. Але я прыбыў сюды таксама ўбачыць, пакараць і выдаць на публічную пагарду тых, хто, нягодны імя вольных людзей, нягодны імя польскага жаўнера, ганебна ўцёк з пляца бітвы і стаў прычынай паразы.

Калегі! Народ распачаў гэтую святую вайну, каб вызваліць Айчыну ад лютых наезнікаў, каб забяспечыць сабе вольнасць, цэласць і незалежнасць. Вам, спраўныя рыцары, ён даверыў гэтую справу — і не падманіце яго даверу. У вашыя рукі, вашай адвазе аддадзены лёс Айчыны — перамажыце непрыяцеля і яна стане вольнай, а вы самі шчаслівымі, а дазволіце сябе паканаць — загубіце Польшу, трапіце ў няволю, на ўціскі і няшчасці. Суровы і люты непрыяцель будзе тады кіраваць вамі як пабітымі і як створаным для ярма народам. Шчодрыя дары, якімі прадбачанне надзяліла польскую зямлю, стануць здабычай непрыяцеля,— ён іх загарне, а вам застанецца сорам і нястача.

Але акрамя таго я ведаю пра ўласцівую паляку з нараджэння ваяўнічасць і таму я далёкі ад гэтак страшнай думкі. Калі толькі захочам перамагчы — пераможам, калі толькі пажадаем стаць вольнымі, то будзем імі. Вы самі бачыце, што непрыяцель толькі тады смелы, калі вы

ў страху. Ёсць нямала свежых доказаў, калі наш жаўнер, зневажаючы небяспекай, перамагаў і не ведаў, што такое страта, а калі ён срамотна паказваў зад, то яго даганяла смерць, знішчэнне і ганьба, што горш за ўсё. Яшчэ ёсць час на адплату нанесенай паразе і заслужыць сабе славу і падзяку народа. Гэта так, калегі! Той народ будзе нам удзячны.

Яго імем завяраю вас, што ўсе тыя афіцэры і жаўнеры, хто сваёй мужнасцю паслужыць адоленню непрыяцеля і вызваленню Айчнны, усе, гавару, атрымаюць у спадчыну з нарадовых уладанняў надзелы зямлі, на якіх будуць спакойна праводзіць свае дні пасля прац і спёкаў, пакрытыя славай і ўдзячнасцю адзіназемцаў. Такую ўзнагароду абяцаю і запэўніваю ваяўнічым мужам імем Айчыны.

А калі яшчэ знойдуцца баязліўцы, то няхай ведаюць, што іх чакае. Загадваю генерал-маёру і камандуючаму Серакоўскаму — перад кожнай акцыяй паставіць у тыле лініі частку пяхоты з 2 гарматамі і карцеччу, якія будуць страляць па ўцякаючых з поля — няхай выродкі, нягодныя польскага імя, лепш згінуць ад сваіх, чымсці сваімі ўцёкамі яны загубяць Айчыну і апаганяць славу польскай зброі. Акрамя таго, камандуючы генерал-маёр аб'явіць, што калі ў час бою хто-небудзь з афіцэраў або жаўнераў адважыцца ўстрывожыць корпус крыкам, што тыл узяты, што мы адрэзаны, што мы загінулі,— такі будзе імгненна схоплены, акуты ў ланцугі і пасля бітвы асуджаны палявым судом і па доказу расстраляны. Генерал Серакоўскі падасць мне спіс адзначаных афіцэраў, гэтак жа як і палявыя прыгаворы на тых, хто дэзерціраваў з пляца бітвы. Камандзіры пад сумленнем і гонарам пададуць імёны ўсіх тых, хто ў бітве не выканаў сваіх абавязкаў. Хто не данясе аб гэтым чэсна, той будзе пакараны звальненнем.

Брацця і калегі! Хто змагаўся з гонарам або са мной, або ў іншых бітвах за ўласную Айчыну і яе святую свабоду — усім вам яшчэ раз паўтараю падзяку.

Заахвочвайце да адвагі ў баі, да паважнасці ў працах і работах. Усемагутны бог моцным знаменнем падтрымае нашу зброю і пахавае дзікіх непрыяцеляў. Завершыцца крывавая бітва і зноў узнімецца любая Айчына ва ўсёй сваёй святасці, а панесеныя на яе працы стануць вечным напамінам, будуць улагоджваць апошнія нашыя дні. Я не забуду вас ва ўсім сваім жыцці. Кожны клапатлівы, кожны адважны заўсёды будзе маім калегам і сябрам.

Даны ў абозе пад Вішневам дня 27 месяца верасня 1794 года. *Тадэвуш Касцюшка*

Pisma Tadeusza Kosciuszki.
Warszawa, 1947. С. 149—151.
Рэдактарскі пераклад з польскага.

№ 125. 30 верасня. Адозва Т. Касцюшкі да літоўскага войска з Гродна

Таго, чаго я, калегі і суабывацелі, даўно так горача і моцна прагнуў, толькі зараз абставіны дазволілі нацешыцца. Нарэшце бачу вас, спраўныя ваяры, а пазіраючы на збройныя рады літоўскага рыцарства, гледзячы на абывацеляў, з кім лёс дазволіў нарадзіцца на адной зямлі, пазіраючы на ўсё гэта, на людзей, ваюючых у святой справе, у справе пакрыўджанай і разадранай Айчыны, верна вам тлумачу, якія пачуцці гэты від абуджае ў маім сэрцы вуснамі жаўнера, кахаючага добрасумленнасць і праўду.

Брацця і таварышы мае! Калі вынікі вашых прац і бітваў дагэтуль не адпавядалі цалкам вашай мужнасці і смеласці байцовага люду, то я не прыпісваю гэта перавышаючаму ваярству нашых непрыяцеляў, а тым больш недахопу ў вас адвагі, бо хто ж мужней польскага войска, а прыпісваю гэта недаверу ўласным сілам і адвазе, гэтым фальшывым і няшчасным уяўленням аб перавазе непрыяцеля, якія быццам бы нейкі фаталізм пасеяў у вашых радах.

Жаўнеры, байцоўскія і вольныя! Сцеражыцеся гэтых памылковых і крыўдзячых нас думак, штурхайце іх ад сваіх сардэц, як не вартых вольным людзям і якія замест перамогі і славы рыхтуюць вам згубу і ганьбу. Прыгадайце, колькі разоў вашыя продкі і вы самі кідаліся і перамагалі той люд, які баязлівыя і непрыязныя да Айчыны асобы так імкнуліся прадставіць вам магутным, колькім тысячам вашых продкаў удалося заваяваць усю маскоўскую дзяржаву, прывезці ў аковах яе цароў і пастаўленых правіцеляў, а вы, нашчадкі тых жа палякаў, спрабуеце ўсумніцца, што ў барацьбе за Айчыну і вольнасць, за дамы, кроўных і сваіх сяброў не зламаеце, не пераможаце тыя драпежныя купкі, якія будуюць свае перамогі і карысці толькі на вашай коснасці. Толькі пакажыце ім сваю смеласць, не ступайце ні шагу з пляца бітвы, вытрымайце хаця б адзін іх наступ, і, ручаюся вам, вы ўбачыце, як яны ганебна пабягуць. Памятайце, што толькі на адвазе і нязломнасці трэба засноўваць цэласць сваёй Айчыны, вашу вольнасць і шчасце, што не бароначы ўсімі сіламі свой край, праз знешні дыктат наклічам на сябе няволю, смутак, нястачу і пагарду ўсяго свету. Таму папярэджваю ўсё войска, што калі хто створыць ці падтрымае тое словамі, што маскалям не падабае супраціўляцца, або закрычыць у час боя, што тыл наш забраны, што ўсе пераразаны і таму падобнае, такі па данясенні па камандзе будзе аддадзены пад палявы суд закаваным у ланцугі і па перакананні расстраляны.

Загадваю генералу камандуючаму Макраноўскаму выслаць у час бітвы частку пяхоты з гарматамі, набітымі карцеччу, у тыл лініі і тымі страляць па ўцекачах. Няхай кожны ведае, што ідучы наперад, атрымае перамогу і славу, а ганебна падаючы тыл, няўмольна напаткае сорам і смерць. Калі ж сярод ваеннаслужачых маюцца такія, хто перакананы, што маскалёў немагчыма пабіць, якім абыякавая Айчына, вольнасць і слава, то няхай такія спярша заявяць аб сваім звальненні са службы, няхай не

забіраюць месц ваюючых, няхай не трывожаць другіх у час бітвы ўцёкамі. Бо кожнаму мужчыне сорамна ўцякаць, а для вольнага чалавека сорам нават падумаць аб уцёку. З жалем у сэрцы мне прыходзіцца ўстанаўліваць гэтыя суровыя правілы, але голас Айчыны і яе цэласць патрабуюць іх неадкладна.

